Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 34 (4477) 22 жніўня 2008 г.

У нумары:

Самотна-прасветлены дзень

Гадавіна смерці Якуба Коласа яднае прыхільнікаў ягонай творчасці.

Стар. 3

Палессе нельга разгадаць

Пра кнігу «Трохперсце» (лірыка М. Рудкоўскага, М. Пракаповіча і А. Каско) — грунтоўна.

Стар. 6

«Вострае лязо — мая паэзія!»

Паэтычнае слова Ніны Шкляравай кранае кожную беларускую душу.

Стар. 13

Найвялікшае сонца — родная мова

Час ацаніць творчасць Яўгена Крупенькі належна.

Стар. 14

У цеснай повязі эпох

Слынная Пружаншчына вачыма нашых калег-журналістаў з Брэста.

Стар. 15

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў: 1 месяц — 6720 руб. Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска: 1 месяц — 8710 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: другое паўгоддзе, на 1 месяц — 4500 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска: 1 месяц — 6820 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Вось і надыходзіць сумная пара развітання з летам. Жнівень сваёю назваю ды клопатамі ўвішных працаўнікоў нагадвае пра пачэсны і прыемны абавязак збору ўраджаю — выспелага на палетках, выпешчанага сонцам ды вятрамі, шчодра палітага сёлетнімі дажджамі.

Мядовы, яблычны, арэхавы...

Людскі клопат пра дабрабыт здавён ішоў поруч з думкамі пра цудадзейнае выратаванне: ад галечы, голаду-нядолі, ворагаў-нядобразычліўцаў, хвароб. Мо таму менавіта ў жнівеньскім календары беларусаў тры святы, у якіх увасобленыя спадзяванні на выратаванне, — тры Спасы.

За тыдзень да першага, менавіта мядовага, Спаса (14 жніўня) у беларускай сталіцы шырока разгарнулася Другая міжнародная выстава-кірмаш "Мядовы Спас". Выйшаўшы з-пад даху Палаца спорту, дзе яна месцілася летась, сёлетняя выстава прывабіла сваёй адкрытасцю. Утульныя палаткі на праспекце Пераможцаў не заўважыць ды абысці не ўдавалася, здаецца, нікому: на фестывалі было выстаўлена 100 тон мёду (сапраўдная смаката!) ды безліч іншай прадукцыі пчалярства: прапаліс, матачнае малачко, пярга, пыльца, розных гатункаў фітачаі ды бальзамы. Абавязковы атрыбут свята — 100-кілаграмовая бочка мёду, выстаўленая для дэгустацыі ды пачастунку, якую ўсе, асабліва дзятва, намагаюцца з'есці за дзень, бо назаўтра будзе іншая...

Аўтар праекта "Свет мёду і здароўя", у рамках якога праходзіць "Мядовы Спас", і яго генеральны прадзюсер Юрый Радзькоў патлумачыў, што гэта сапраўднае свята пчаляроў, на якое збіраюцца спецыялісты з усіх рэгіёнаў Беларусі і суседніх краін. На адкрыцці сёлетняга кірмашу святочнаю калонаю прайшлі пчаляры трох дзяржаў: Расіі, Украіны і Беларусі. Наша дэлегацыя — самая шматлікая. Яе ўзначаліў старшыня РГА «Беларускія пчолы» Уладзімір Камянкоў.

Культурна-аздараўленчы праект адкрыўся ў пярэдадзень Алімпіяды ў Пекіне, у Год здароўя, і тым вызначылася яго далучанасць да здаровага ладу жыцця: мёд і сам па сабе сінонім здароўя, а на пляцоўцы ""Беларусь алімпійская" праходзілі розныя спартыўныя спаборніцтвы. Працавалі таксама фестывальная (з дэгустацыяй), дзіцячая ("У гасцях ў пчолкі") і народная (з вырабамі майстроў народнай творчасці) пляцоўкі. На апошняй, з ініцыятывы Ю. Радзькова, гучалі вершы і ўрыўкі з прозы, згадваліся імёны класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа, выступалі творчыя калектывы з Петрыкава, Турава, Мінска.

Упершыню сёлета была арганізавана акцыя "Дапамажы дзецям!", падчас якой збіраліся сродкі для набыцця спартыўнага інвентару і цацак для дзіцячых дамоў. Мёд прэзентавалі і ў аздараўленчыя лагеры, Рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў (што паблізу ад Севастопальскага парку сталіцы). Салодкія пачастункі ўручаны дзецям з малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў, выхаванцам дзіцячых сацыяльных устаноў.

Сам фестываль праходзіць па краіне другі год, у розныя каляндарныя дні мядовыя выставы-кірмашы адбыліся ўжо ў многіх старажытных гарадах: Полацку, Міры, Гомелі, Брэсце, Магілёве... Але цэнтр ўрачыстасцяў, сам Спас — заўсёды ў сталіцы. "Свята вынікае са старажытных народных традыцый", — падкрэсліў адзін з рэжысёраў, які спрычыніўся да арганізацыі чатырох такіх святаў, Мікола Макарцоў.

Цяпер у аб'яднанні беларускіх пчаляроў — прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў. Найбольш знаныя — пчаляры Мінскай і Віцебскай абласцей. Варта згадаць Генадзя Рубана ды Ігара Шынкевіча з Бабруйска, альбо "Пчалапасеку Абросімава і сыноў" з Наднёманскага краю. На апошняй, акрамя ўсяго іншага, знойдзеце гістарычную, складзеную, бясспрэчна, майстрам прыгожага пісьменства, згадку са старадаўняга рукапіснага лячэбніка: "Мёд ёсць сок расы нябёснай, каторы пчолы збіраюць у добрую часіну з кветак духмяных і ад таго мае ў сабе моц вялікую і ўтодным бывае ад многіх хвароб"...

Буйных пасек, як у іншых краінах, у Беларусі няма. Сярэдняя гаспадарка пчаляра — у 100—130 пчоласем'яў. Гэта замінае ўкараненню эфектыўных тэхналогій выганкі мёду, расфасоўкі яго, але па волі лёсу — захоўвае тое спрадвечнае, што спадарожнічала працы людзей у адмысловых капелюшах-абярэгах.

З гістарычным ухілам, а больш — пра тое, як адраджалася ў краіне традыцыя народных святкаванняў, зараз ствараецца мастацка-дакументальны фільм «Ад Спаса да Спаса». Знятая ўжо большая частка задуманага, — падкрэсліў Ю. Радзькоў. Але праца, сарэжысёрам якой выступае Максім Субоцін, працягваецца, як і святкаванні беларускіх Спасаў.

Першы Спас называўся яшчэ ў народзе Макавеем. І гаспадыні лічылі за гонар і абавязак прыгатаваць у гэты дзень хоць бы адну страву, у якую можна мачаць хлеб, альбо бліны з тоўстым слоем перацёртага з цукрам маку. У другі Спас, яблычны, 19 жніўня, насілі ў царкву на асвячэнне яблыкі. І чакалі Спасу арэхавага, альбо хлебнага Успення — 28 жніўня, калі заканчваўся пост і пяклі хлеб з новага ўраджаю, а жанчыны выстаўлялі на продаж вытканыя палотны. Трэці Спас — гэта "Спас на палатне". Невыпадкова, відаць, на наступны дзень пасля заканчэння мядовай выставы-кірмашу святкаваць ды славіць Спас запрасілі да сябе супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ў вёску Азярцо Мінскага раёна. Там і песні з прыпеўкамі, і кірмашы рамёстваў, і тканыя вырабы, і смачныя пачастункі беларускай кухні. Спас крочыць па зямлі беларускай...

Ірына ТУЛУПАВА

Фота Кастуся Дробава

Журналісты— пра калег сваіх

Гродзенская друкарня выпусціла ў свет кнігу "Призвание быть журналистом". Выданне прысвечана журналістам Гродзеншчыны, якія пакінулі прыкметны след у гісторыі развіцця перыядычнага друку, электронных сродкаў масавай інфармацыі.

Як адзначае ва ўступным слове намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Марыя Бірукова, складальнікі кнігі і аўтары публікацый змаглі поўна і яскрава данесці да чытача сутнасць прафесіі журналіста, яе складанасць і адказнасць. Творчасць, лёсы і жыццёвы шлях многіх работнікаў сродкаў масавай інфармацыі, пра якіх паведамляецца ў кнізе, і сёння з'яўляюцца для нас прыкладам служэння Радзіме, адданасці любімай справе.

Гэтая кніга — сустрэчы з калегамі па пяры. Сустрэчы хвалюючыя, а часам — балючыя, калі гаворка ідзе пра тых, каго ўжо сярод нас няма. Адметнасць кнігі яшчэ і ў тым, што аўтары змешчаных у ёй артыкулаў — гэта менавіта тыя людзі, якія заўсёды маглі адшукаць самае лепшае ў кожным чалавеку-героі сваіх газетных публікацый. А вось цяпер гэтымі "героямі" сталі іхнія паплечнікі-журналісты, іхнія дружбакі-таварышы. А пра гэта пісаць значна цяжэй.

Складальнікі кнігі — Аляксандр Богуш і Уладзімір Амелька — аўтарытэтныя журналісты. Аляксандр Уладзіміравіч амаль чвэрць стагоддзя ўзначальваў калектыў абласной газеты, заслужаны работнік культуры, кандыдат гістарычных навук, цяпер дацэнт Гродзенскага універсітэта імя Янкі Купалы. Уладзімір Паўлавіч — журналіст з багатым вопытам працы ў газеце, у тым ліку ў якасці ўласнага карэспандэнта абласной газеты.

Генрых МІНІН

Жнівень Сяргея Крыштаповіча

Сталічны Палац мастацтва гасцінна адчыніў дзверы для аматараў сучаснага жывапісу з нагоды дня нараджэння свайго кіраўніка, крэатыўнага беларускага творцы Сяргея Крыштаповіча. Ён з'яўляецца заснавальнікам Міжнароднага грамадскага аб'яднання мастакоў і мастацтвазнаўцаў «Мастер», а таксама такіх арыгінальных дабрачынных праектаў, як «Мартовские коты», «Водка и хвост селёдки», «Карнавал».

Маэстра, вядомы сваім выключным талентам, збірае вакол сябе тых, чые мастацкія густы і погляды ляжаць у адной плоскасці з аўтарскімі пачуццямі, каму неабыякавы ягоныя наватарскія ідэі і стыль пісьма.

Чарговым доказам яго адметных мастацкіх якасцей стала нядаўняя персанальная экспазіцыя, якая згуртавала нямала творчых сяброў імяніннка. Адзін з іх, Рыгор Сітніца, трапна адзначыў: «Гэты вернісаж цалкам адпавядае асобе аўтара, які сваёй творчасцю адкрывае новыя шляхі для мастацтва». З гэтым цяжка не пагадзіцца, тым больш, калі на ўласныя вочы пазнаёміцца з яго разуменнем сутнасці свету, выяўленым у палотнах «Зямля» і «Вада», пранікнуцца таямніцамі «Месяцовай чашы» ці «Кветак», задумацца над філасофскім мінімалізмам «Вялікай рыбы».

Прыемным дапаўненнем і своеасаблівым падарункам да свята сталі жывапісныя работы Эвеліны і Белаславы Крыштаповіч — дачок мастака.

Ксенія ШАРЖАНОВІЧ

Пра Тураўшчыну — усё

У мінулым годзе Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сумесна з Тураўскім навукова-асветніцкім таварыствам падрыхтаваў арыгінальнае выданне — "Тураўшчына: мінулае, сучаснасць, будучыня".

Кніга выпушчана ў свет выдавецтвам "ТАА "Мэджык БУК" тыражом усяго 120 асобнікаў, таму адразу трапіла ў разрад рэдкіх кніг. Але пры жаданні яе можна знайсці ў цэнтральных бібліятэках, яна разлічана на шырокае кола чытачоў. Выданне можа зацікавіць як літаратараў, так і гісторыкаў, мовазнаўцаў, этнографаў і фалькларыстаў, біёлагаў, духоўных асоб і ўсіх, хто неабыякавы да нашай спадчыны і гісторыі, у прыватнасці, да гісторыі Тураўшчыны. Падрыхтавалі выданне дактары гістарычных навук Пятро Лысенка і Мікола Саскевіч.

Кніга складаецца з дзесяці раздзелаў, прысвечаных старажытнай Тураўшчыне. Дастаткова пералічыць назвы раздзелаў, каб уявіць, наколькі шырокамаштабнай з'яўляецца праца: "1000 гадоў Тураўскай епархіі", "Краязнаўства", "Персаналіі", "Біялогія", "Мовазнаўства", "Фальклор", "Гісторыя", "Літаратурныя творы", "Зберагчы Тураўшчыну" і апошні раздзел — "Рэлігія". Кніга аздоблена фотаздымкамі, каляровымі малюнкамі, схемамі і картамі, выдрукавана на якаснай паперы.

У першы раздзел уваходзяць матэрыялы, прысвечаныя святкаванню 1000-годдзя Тураўскай епархіі, духоўныя вершы і рускія былiны, навуковыя артыкулы пра гісторыю Тураўскай епархіі і пра Вялікага князя Кіеўскага Святаслава. У раздзеле "Краязнаўства" — успаміны пра Вялікую Айчынную вайну ўраджэнцаў і жыхароў Тураўшчыны, дакументальная аповесць "Ахрышчаны ў Тураве" Сяргея Некрашэвіча. Раздзел "Персаналіі" расказвае пра юбіляраў 2006 года: М. Шэлехава, П. Лысенку і М. Котава. Мовазнаўцы знойдуць частку "фразеалагічнага слоўніка вядскай гаворкі беларускай мовы", блізкай да тураўскай народнай гаворкі знішчаных нямецкімі карнікамі вёсак у Івацэвіцкім раёне Брэсцкай вобласці. Навуковыя артыкулы, прысвечаныя прыродзе, фальклору Тураўшчыны, старажытнай гісторыі Пагарыння і Над'ясельддзя; народныя песні, літаратурныя творы жыхароў і ўраджэнцаў Тураўшчыны, адно з пасхальных слоў свяціцеля Кірылы Тураўскага, пераклад на тураўскую гаворку Міколам Саскевічам урыўка рускай паэмы XIV ст. "Задонщина", пасямейныя спісы перайшоўшых у 1834 годзе з уніі ў праваслаўе жыхароў вёсак Тонеж, Іванава Слабада і Радзілавічы, разважанні вучонага аб магчымым наведванні Палесся апосталам Андрэем Першаванным і многія іншыя артыкулы.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Чароўнасць фотамастака

Галерэя "Свет фота" прадставіла сталічнаму арт-аматару выставу польскага фотамайстра Ежы Пёнтака "Самота і чароўнасць правінцыі". Выстава арганізавана пры дапамозе Польскага інстытута ў Мінску і Беларускага грамадскага аб'яднання "Фотамастацтва". Судакрануцца з фотасветам пана Ежы можна будзе да 6 верасня.

У польскім фотамастацтве ёсць своеасаблівы феномен, які з'явіўся ў 70-х гадах — "сацыялагічная фатаграфія". Нягледзячы на тое, што гэта навуковае азначэнне не поўнасцю суадносіцца з тым, што хаваецца за ім, яно моцна ўкаранілася ў сучаснам польскам фотамастацтве. Завэлюмаваныя навуковым азначэннем, перад грамадствам адкрываліся фатаграфіі, якія фармальна супярэчылі афіцыйнай палітыцы тагачаснай Польскай Народнай Рэспублікі. Паколькі жорсткая цэнзура выключала магчымасць паказу шматлікіх праектаў, якія крытычна адлюстроўвалі сапраўдны стан грамадскага жыцця ў Польшчы ў тыя часы, то феномен "сацыялагічнай фатаграфіі" нарадзіўся як спосаб абысці заслону замоўчвання. І творчасць пана Ежы Пёнтака як нельга лепей дапамагала бачыць наяўнасць ружовых акуляраў, а не свет, што бачны праз іх. "Сацыялагічная фатаграфія" стала такім чынам сапраўднай неабходнасцю выкрыцця скажэнняў рэальнага жыцця.

Фатаграфія пана Ежы Пёнтака паказвае незайздроснае становішча людзей у правінцыі. У прыватнасці, гэтая серыя фотаздымкаў (яны не маюць уласных назваў, а проста аб'ядноўваюцца пад агульным назовам выставы) адлюстроўвае жыццё ў рэгіёне Келецкага ваяводства, якое лічылася адным з бяднейшых у Польшчы. Людзі на здымках Пёнтака, прыціснутыя цяжкім штодзённым побытам, амаль што жабрачым становішчам. Але... Але, ёсць у іх нешта прывабнае. Прастата. Пакора, але не пакоранасць. Тое ўжо не самота, а сапраўдная чароўнасць, і яна вымушае казаць простыя словы, але моцныя, што тыя запаветы: любіце сваіх бацькоў, не пакідайце, памятайце, клапаціцеся...

Фотавыстава Пёнтака адсылае нас да мінулай эпохі. Яго творчасць, здаецца, ставіць знак роўнасці паміж словам "правінцыя" і словам "мінулае". Зараз фотасвет Пёнтака значна шырэйшы за той свет, што быў 30 гадоў таму. Спадзяёмся, што нашыя дзеці і ўнукі адзначаць: пёнтакаўская фатаграфія не спыняла свайго росту і эвалюцыі.

Захар ШЧАРБАКОЎ

Пленэр мастацкай скульптуры

На пачатку жніўня ў дзяржаўнай гісторыка-культурнай установе "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль" адбылося адкрыццё выставы "Сучаснае і класічнае ў скульптуры".

Арганізатары выставы: ДГКУ "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль" і ГА "Беларускі саюз мастакоў".

Выстава арганізавана ў рамках пленэру мастацкай скульптуры, які праводзіцца ў Гомельскім палацава-паркавым ансамблі з мэтаю насычэння гістарычнага парку творамі класічнай скульптуры.

Экспазіцыя ставіць мэтаю пазнаёміць гамяльчан і гасцей горада з аўтарскімі работамі некаторых скульптараў. Сярод экспанентаў — члены Беларускага саюза мастакоў С. Бандарэнка, А. Бацвінёнак і іншыя мастакі, якія звяртаюцца ў сваёй творчасці да класічных традыцый.

Іна КАЧУБЕЙ

Валадарыла слова

Прэзентацыя кнігі вершаў "За всё тебя благодарю..." прайшла ў бібліятэцы Магілёўскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства інвалідаў па зроку". Кніга выйшла сёлета ў мінскім выдавецтве "Кнігазбор" і ўтрымлівае творы членаў таварыства з усіх рэгіёнаў нашай краіны. На вечарыне перад аматарамі паэзіі выступілі магілёўскія аўтары зборніка Алена Цуранава, Наталля Панцялеева. Шмат вершаў са зборніка прачытала прысутным загадчыца бібліятэкі Валянціна Северына, якая падрыхтавала і правяла прэзентацыю.

Уладзімір ДУКТАЎ

У літгасцёўні

Прэзентацыя зборніка вершаў "Вы..." Уладзіміра Чэрніка адбылася ў сценах літаратурнай гасцёўні Параслянскай сярэдняй школы Пружанскага раёна. Кніга была выдадзена ў брэсцкім выдавецтве "Альтэрнатыва". Мерапрыемства з нагоды выхаду кнігі падрыхтавала выкладчыца рускай мовы і літаратуры Ларыса Калюта разам з вучнямі 8-га і 9-га класаў. Удзел у ім прынялі таксама пісьменнік Анатоль Крэйдзіч (ён жа і рэдактар кнігі) і рэдактар пружанскай райгазеты "Раённыя будні", член Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікола Антаноўскі .

Міхаіл ЛЯЎКОВІЧ

Міжнародны дзень ляўшы

13 жніўня ў сусветным святочным календары з 1992 года пазначаны як День ляўшы. Ініцыятарам свята стаў Англійскі клуб ляўшэй у знак супраціўлення "правым". Не сакрэт: непаразуменні паміж двума лагерамі на працягу стагоддзяў зводзіліся да таго, што ўвесь час ляўшэй лічылі другаснымі, "няправільнымі". Іх баяліся, бо прыпісвалі ім статус чараўнікоў, дзяцей д'ябла, таму нават не дазвалялі сведчыць у судзе. Няшчасных прымусова перавучвалі пісаць правай рукою. Усё гэта, безумоўна, не магло доўжыцца і вылілася ў масавы рух у абарону правоў ляўшэй, які праявіўся ў ЗША з сярэдзіны мінулага стагоддя.

На сённяшні дзень сітуацыя змянілася, хаця пытанне, чаму свет падзяляецца на "левых" і "правых", застаецца адкрытым. Вядома, што прыкладна 10 працэнтаў (6 мільёнаў) людзей на Зямлі з'яўляюцца носьбітамі нетыповых здольнасцей, якія да таго ж перадаюцца ў спадчыну. Але не трэба лічыць такіх людзей ненармальнымі, а тым больш хворымі, проста яны трошкі іншыя. Так, напрыклад, у іх лепш развітае ўяўленне, глабальнае і візуальнае мысленне, эмацыйнае ўспрыманне. Яны хутчэй рэагуюць і прыстасоўваюцца да зменаў у асяроддзі.

Ляўшы часцей вырастаюць творчымі людзьмі, бо выбіраюць прафесіі, звязаныя з музыкай, літаратурай, мастацтвам, архітэктурай і навукай. Варта заўважыць што "леварукімі" былі такія волаты мастацтва, як Рубенс, Мікеланджэла, Леанарда да Вінчы, Пікасо; і неўміручыя музычныя класікі на чале з Бетховенам, Моцартам, Рахманінавым; да ляўшэй адносіліся пісьменнікі Марк Твэн і Мікалай Ляскоў (дарэчы, ён напісаў вядомую аповесць пра ляўшу, які падкаваў блыху), а таксама сусветныя зоркі навукі Ньютан і Эйнштэйн.

Хто з беларускіх творцаў з'яўляўся (ці з'яўляецца) ляўшой, невядома проста таму, што такой статыстыкі ў нас не вядзецца. Хаця, пагадзіцеся, даведацца было б цікава. Думаецца, усё наперадзе, а пакуль што даводзіцца толькі глядзець па тэлебачанні, як у далёкіх краінах 13 жніўня святкуецца День ляўшы: праводзяцца розныя спаборніцтвы і конкурсы, дзе праўшам, напрыклад, прапануецца ўсё рабіць левай рукою.

Ксенія ШАРЖАНОВІЧ

Самотна-прасветлены дзень

13 жніўня, у дзень смерці Якуба Коласа, на Вайсковых могілках сталіцы адбылося ўскладанне кветак да надмагільнага помніка славутаму песняру.

Творчасць народнага паэта Беларусі Якуба Коласа— гэта цэлая эпоха ў гісторыі айчыннага прыгожага пісьменства. Яго па праве лічаць заснавальнікам нацыянальнай прозы. Жыццё і творчасць песняра сталі значным унёскам у беларускую культуру. Каштоўнасць мастацкай спадчыны Коласа на працягу цэлага стагоддзя пацвярджаецца ўсё новымі пакаленнямі чытачоў. Літаратурная творчасць класіка — невычэрпная крыніца хараства нашай мовы, якая і надалей будзе прыносіць нам святло і радасць, бо яна вучыць мудрасці, жыццю, любові да свайго народа, свайго роднага куточка, да Беларусі.

...Маё апавяданне
Жыцця адбітак, разважання,
Нязжыты след прасцяцкай долі,
Адвечны водгук праўды, волі.

Пакланіцца творцу, ушнаваць яго светлую памяць прыйшлі літаратары, дзеячы навукі і культуры, прадстаўнікі РВУ "Літаратура і Мастацтва", айчынных творчых саюзаў і музеяў, а таксама шматлікія прыхільнікі таленту пісьменніка, неўміручыя творы якога і цяпер застаюцца актуальнымі, яны ўвасобленыя ў мастацтве, музыцы, кіно, ставяцца на сцэне...

Жалобны мітынг ля магілы песняра адкрыла словамі пашаны дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская. Зінаіда Мікалаеўна зазначыла, што хоць і мінула 52 гады з дня смерці песняра, але ён і пасёння застаецца эталонам змагара за мову, за культуру, за людскасць на нашай зямлі. Добра, што штогод не змяншаецца кола прыхільнікаў Коласа, людзей, якія нягледзячы ні на якое надвор'е: ці то дождж, ці то спякоту, прыходзяць пакланіцца гэтаму вялікаму цудоўнаму чалавеку. У наступным годзе 4 снежня музею класіка спаўняецца 50 гадоў. Увесь гэты час супрацоўнікі ўстановы імкнуцца прапагандаваць творчасць Якуба Коласа, даносіць яго слова да сучаснікаў, асабліва да маладога пакалення.

Галоўны рэдактар часопіса "Полымя" Мікола Мятліцкі зазначыў, што гэты дзень застанецца ў гісторыі нашай краіны самотна-прасветленым днём. Колас — пуцяводная зорка Беларусі, якая будзе вечна цепліць сэрцы нашых наступнікаў сваёй беларускасцю. Трэба больш чуйна клапаціцца пра роднае, пра сваё, каб быць пачутымі ў свеце.

Пісьменнік Анатоль Бутэвіч падкрэсліў, што з кожным новым прачытаннем спадчыны Коласа мы спазнаём яго ўсё больш і больш і лепей усведамляем, каго страцілі. Але страта фізічная кампенсуецца духоўным: нашымі адносінамі, памяццю, ушанаваннем, выданнем і перавыданнем твораў класіка. Анатоль Іванавіч зачытаў вытрымкі з дзённікавых запісаў Якуба Коласа ў ліпені 1943 года ў Ташкенце, дзе ён амаль штогадзінна прыгадвае родную Беларусь.

Сын песняра Міхась Міцкевіч узгадаў творчасць бацькі, яго бескарыслівую дапамогу людзям і падзякаваў усім прысутным, хто прыйшоў ушанаваць памяць роднага яму чалавека.

Таксама слова бралі паэт Павел Саковіч, старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп. Творца Васіль Жуковіч прыгадаў эпісталярную спадчыну Якуба Коласа, а намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Вясёлка" Уладзімір Мазго зрабіў акцэнт на творчасці пісьменніка, які шчодра дзяліўся сваім дарам як з дарослымі, так і з дзецьмі.

Каля магілы класіка было сказана шмат цёплых, шчырых і прачулых слоў пра яго як чалавека і творцу, пра яго духоўную веліч ды мастацкую значнасць для роднай і сусветнай літаратуры яго твораў.

Віктар КАВАЛЁЎ

Фота Кастуся Дробава

Аўтограф на памяць

Гэтай сустрэчы ў сярэдняй школе № 103 г. Мінска чакалі з асаблівым хваляваннем: сюды завітаў пісьменнік! Аднак скаванымі хлапчукі і дзяўчынкі сябе не адчувалі, бо Анатоль Зэкаў (а менавіта ён быў госцем вучняў) адразу ўключыў іх у размову. Пісьменнік, напрыклад, не дачытваў да канца казку і прапаноўваў школьнікам то закончыць яе самім, то паразважаць, як бы яны паступілі на месцы казачных герояў, то адказаць, чаму ўсіх нас вучыць казка.

Але галоўным, дзеля чаго сабраліся ў той дзень вучні, было ўсё ж знаёмства з новай дзіцячай кнігай Анатоля Зэкава — чытанкай-маляванкай у рыбацкіх скорагаворках "Мянтуз сярод мядуз". Аўтар і тут не даў вучням заставацца толькі слухачамі, а падключыў іх да гульні ў літары беларускага алфавіта. І нават скорагаворкі ён чытаў выключна на тыя літары, якімі пачынаюцца імёны прысутных хлопчыкаў і дзяўчынак.

Напрыканцы сустрэчы вучні змаглі набыць новую кнігу Анатоля Зэкава і атрымаць персанальны аўтограф пісьменніка. Як яны ўсе потым прызналіся, у кожнага пасля гэтага з'явілася жаданне папоўніць хатнія бібліятэкі кнігамі з аўтографамі іншых беларускіх літаратараў. А значыць — наперадзе ў вучняў 103-й сталічнай школы новыя сустрэчы з пісьменнікамі.

Сяргей КРЫВІЧОЎ

Прыслухацца да паэзіі

У Веткаўскага музея народнай творчасці разам з Веткаўскай раённай бібліятэкай вызначыўся новы накірунак працы са школьнікамі, які можна назваць урокамі паэзіі. Гэта своеасаблівы факультатыў, які праводзіцца пры непасрэдным удзеле саміх паэтаў. Першы з гэтых урокаў адбыўся ў кастрычніку мінулага года ў чытальнай зале раённай бібліятэкі пры ўдзеле вучняў сёмага класа Веткаўскай гімназіі. Такі ўрок прайшоў і ў вёсцы Радуга. У госці да школьнікаў прыехалі паэты Васіль Бакаеў, Генадзь Лапацін, загадчыца аддзела абслугоўвання Веткаўскай раённай бібліятэкі Валянціна Бава. Раённая бібліятэка падрыхтавала выставу выданняў сваіх паэтаў.

Веткаўчанам добра знаёмы імёны Дзмітрыя Кавалёва, Эдуарда Акуліна, Ларысы Раманавай, Анатоля Сыса, Віктара Стрыжака, Васіля Бакаева, Уладзіміра Чарнякова, рознымі плынямі лёсаў звязаных з Веткай. Вершы гэтых паэтаў, сваіх сяброў па пяры прачытаў для школьнікаў і настаўнікаў Радужскай школы Генадзь Лапацін. Са сваімі вершамі пазнаёміў прысутных Васіль Бакаеў.

Да паэтаў варта прыслухоўвацца. Жыццёвыя сітуацыі паўтараюцца. Проста Гасподзь наканаваў паэтам апынуцца ў тых ці іншых жыццёвых сітуацыях, перажыць тыя ці іншыя пачуцці раней за нас. Бо адным з першых Паэтаў, абраных Нябёсамі былі дванаццаць апосталаў. І пачыналася ўсё гэта так: "И явились им разделяющиеся языки, как бы огненные, и почили по одному на каждом из них. И исполнились все Духа Святого и начали говорить на иных языках, как Дух давал им провещать".

Паэтаў шмат не бывае. Менавіта так трэба ўспрымаць вызначэнне Васіля Бакаева:

Формулы нет никакой,
Чтоб поделив то на это,
Вычислить сколько поэтов
Надо на город родной.

Гаварыць ад імя сваіх блізкіх, сяброў, землякоў заўсёды было ўласцівасцю паэтаў. З асаблівай сілай гэта праяўляецца ў канкрэтныя моманты жыцця, пэўныя часіны. Зведала такія часіны і наша Веткаўшчына... Адкуль прыходзяць паэты? Хто ім даў права голасу гаварыць ад імя блізкіх, сяброў, ад імя цэлага народа? Асабіста мяне заўсёды бянтэжыла вызначэнне паэзіі, як "госці нябеснай". Яно мне падавалася нейкім штучным. Але ж у гэтым вельмі глыбокі міфалагічны сэнс. І выявіўся ён для мяне праз верш Анатоля Сыса. Напісаны, як эпітафія сябру, гэты верш стаў і эпітафіяй самому Анатолю:

Я чую з неба сум Ваш на зямлі,
Вы не судзіце свайго сына строга,
Мяне анёлы за руку ўзялі
І, як дзіця, вядуць да Пана Бога,
Таму па мне не плачце, мама, многа,
Бо да Хрыста, нібы дамоў, дарога...

Бог не толькі вызначае і блаславяе Паэтаў, не толькі чакае іх назад да сябе, але і сочыць за тым, што адбываецца на зямлі, куды Ён іх накіраваў.

У Ветцы любяць сваіх Паэтаў, шануюць, прыслухоўваюцца да іх, таму што ўвогуле любяць Прыгожае Слова — а самыя прыгожыя песні называюць Святымі песнямі. Таму і адбылася гэта сустрэча ў форме своеасаблівага дыялога. І вучні чыталі вершы Ларысы Раманавай і Галіны Нячаевай, Васіля Бакаева і Анатоля Сыса, Віктара Стрыжака і Уладзіміра Чарнякова. Мясцовы бібліятэкар Ганна Аляксееўна Каменева таксама прачытала свае вершы, а ў выкананні Ніны Шкрабавай і Марыі Цейкінай прагучала песня, прысвечаная Серафіму Сароўскаму.

Генадзь СЯРГЕЕЎ

Званне сталіцы гумару пацвердзілі

8—9 жніўня ў знакамітых вёсках Малыя і Вялікія Аўцюкі, а таксама ў г. Калінкавічы прайшоў VI Усебеларускі фестываль народнага гумару "Аўцюкі-2008".

Што такое Аўцюкі для беларуса? Гэта тое ж самае, што для ўкраінца Адэса, а для балгарына Габрава. Гэта — сталіца гумару. Гэта — вялікае свята, якое складаецца з маленькіх святаў у кожным двары Вялікіх і Малых Аўцюкоў, а таксама ў сэрцы кожнага аўцюкоўца і госця фестывалю, абвешчанага як Усебеларускі, але, па сутнасці, ён ужо міжнародны, бо сярод яго ўдзельнікаў сёлета былі прадстаўнікі Расіі і Украіны. Можна гаварыць ужо пра трывалыя яго традыцыі і інавацыі, галоўная з якіх — гэта перш за ўсё ўдзел дзяцей, бо менавіта ў 2008 годзе нарэшце выспеў і дзіцячы фестываль "Аўцючаняты-2008", пераможцамі якога сталі Азарыцкая раённая гімназія і дзве калінкавіцкія гімназіі — 1-я і 4-я, прычым апошняй з іх быў уручаны спецыяльны прыз ад спонсараў — 50 кілаграмаў мёду!

Колькі ж мерапрыемстваў было ў Малых і Вялікіх Аўцюках! Сапраўдная прэс-канферэнцыя членаў журы і аргкамітэта... Аўцюкоўская Мытня пад дэвізам: "Умееш смяяцца — праходзь, не ўмееш — плаці"... Традыцыйна-аўцюкоўскае адкрыццё фестывалю... Прыём у аўцюкоўцы навічкоў... "Швэнданне" па хатах і маёнтках Малых і Вялікіх Аўцюкоў... Аўцюкоўскі бульбулятар...

Жыхарам Калінкавіч надоўга запомніцца імправізаваны кірмаш гумару. Вось некалькі назваў з яго: "Смех пад прэсам прэсы", "Мясцовыя Да Вінчы", "Купляй сваё", "Аўцюкоўскую юшачку за мілую душачку", "Аўцюкоўскі заапарк".

Прызёры дарослага конкурсу па розных намінацыях і пераможцы дзіцячага з Азарыч сустрэліся на гала-канцэрце ўвечары і зрабілі сапраўднае свята для гледачоў у Доме культуры Калінкавічаў.

Сярод удзельнікаў фестывалю вызначыўся сваім выступленнем народны літаратурны тэатр "Жывое слова" Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка.

Сваю самавітасць паказалі таксама цудоўныя калектывы з вёскі Баянічы Любанскага раёна Мінскай вобласці (гурт "Смехаўё"), з вёскі Дубіна Валожынскага раёна, народны тэатр гульні "Завадатар" Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Асобнай ацэнкі заслугоўвае дзіцячы фальклорны калектыў "Вясковыя музыкі" Крывічскага сельскага Дома культуры Салігорскага раёна. Увогуле, дыпламантаў было многа, і прызы былі каштоўныя — пыласосы, DVD, СВЧ-печы.

Дзмітрый ПЯТРОВІЧ

Фота Алега Карпенскага

№ 34 22 жніўня 2008 г. Лім

Гародня заўсёды сустракае ветла. Па-беларуску гасцінна, па-заходняму стрымана. Раскінуўшыся на сваім пачэсным гістарычным месцы — высокім беразе галоўнай гарадской ракі, трымаецца велічна і годна. І не толькі сам горад, а яго культурныя цэнтры. Цяпер тут, на старажытнай Замкавай гары — быццам адвечнаю песняю над Нёманам, два замкі — Стары і Новы. Пра гэта абавязкова нагадаюць вам дарожныя ўказальнікі на карацельцы ад пажарнай вежы да развілкі. Направа — у велічны ў сваім маўчанні замак Стары, дзе знаходзіцца дзеючы краязнаўчы музей і размяшчаюцца яго службовыя пакоі, налева — у Новы палац, дзе цяпер — найкаштоўнейшая культурная скарбніца, храм кнігі — першая публічная бібліятэка Беларусі — Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Карскага. Знаная яна і тым, што ў 1892 годзе яе ўзначаліў бацька славутага Максіма Багдановіча — Адам Ягоравіч, вучоны, педагог і грамадскі дзеяч.

Еўрапейская вядомасць гарадзенцаў

Цяпер бібліятэка месціцца ў чатырох непрыстасаваных памяшканнях. Але непрыстасаваныя яны, можа, з пункта гледжання сучасных санітарных умоваў, неабходных для захавання дакументаў. А наведвальніку, хто прыходзіць сюды для філасофска-ўдумлівага карпення над кнігай, пэўна, цяжка знайсці пакоі больш утульныя за гэтыя, дзе сам дух даўніны спрыяе засвойванню, асэнсаванню падзей гісторыі старажытнай і навейшай. З вокнаў бібліятэкі адкрываецца цудоўны від на хуткаплынны Нёман, а сама бібліятэка-замак — рэзідэнцыя былых Гарадзенскіх уладароў — прэзентуе наведвальнікам багатыя фонды чытальных залаў. Тых самых, дзе калісьці размяшчаліся каралеўскія пакоі, прыёмная і сталовая кароля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, дзе праводзіліся соймы і дзе быў калісьці зацверджаны падзел Рэчы Паспалітай.

Цікавы факт: рашэнне аб адкрыцці скарбніцы было прынята ў далёкім 1830 годзе — на нарадзе ў гродзенскага генерал-губернатара Міхаіла Бабяцінскага. У яе аснову былі пакладзеныя добраахвотныя ахвяраванні дваран горада. Першапачаткова яны і прыходзілі ў бібліятэку. Рабочыя і сяляне — бедны люд — не маглі карыстацца яе (на той час досыць сціплымі) фондамі. Каб папраўціць бядотны стан, усім служачым горада прапаноўвалася ахвяраваць па адным працэнце ад заробку. Людзі, якія ўдзельнічалі ў ахвяраваннях, мелі права карыстацца бібліятэкай бясплатна. У канцы XIX стагоддзя, у 1870-х гадах, бібліятэка ўжо мела ўрадавыя субсідыі...

Не дзіва, што адзін з самых цікавых аддзелаў сучаснай бібліятэкі — краязнаўчы. Гід па кнігасховішчы і загадчыца аддзела краязнаўства Любоў ТУРМАСАВА прэзентуе размешчаныя ў адмысловай архітэктуры пакояў рэдкія выданні, кнігі, якія карыстаюцца асаблівым попытам чытачоў. Гонар калекцыі — выданні канца XIX — пачатку XX стагоддзяў. Гэта ў асноўным выданні Гродзенскага губернскага статыстычнага камітэта. Ёсць рэдкія манаграфіі, агляды Гродзенскай губерні — з

1879 па 1913 гады. Захаваліся — праўда, усяго тры — памятныя кніжкі Гродзенскай губерні. Са старых дакументаў даваеннага перыяду найбольш каштоўныя — "Обзор народного хозяйства Польши" (Варшава, 1927), Кайгародаў А. "Клімат Заходняй Беларусі" (Мінск, 1932), Зязюля А. "З роднага загону" (Вільня, 1931). Альбо некалі існаваўшая газета "Біржа інфармацыі", якая ўтрымлівае найбольш звестак з мінулага жыцця рэгіёна.

Сюды часта завітваюць навукоўцы, краязнаўцы, архівісты, музейныя супрацоўнікі, журналісты. Яны пастаянныя чытачы. "Некаторыя з іх проста як радня, — заўважае Любоў Турмасава. — Калі хто не прыйшоў у звычайны для іх дзень, то перажываем, непакоімся: што з чалавекам магло здарыцца?"...

У бібліятэцы назапашваюцца дакументы аб Гродзеншчыне, тут адшукваюць краязнаўчыя матэрыялы з розных друкаваных крыніц, назапашваюцца ўсемагчымыя матэрыялы: кнігі і брашуры, перыядычныя выданні, карты, атласы, ноты — усё, што змяшчае інфармацыю аб краі. З-за таго, што Гародня знаходзіцца на памежжы, шмат звестак пра рэгіён друкуецца ў Польшчы, Літве. І дзякуючы добрым стасункам з чытачамі, бібліятэка мае шмат інфармацыі аб краі менавіта з замежжа — у гэтым адметнасць гродзенскага аддзела краязнаўства. Фонд выданняў аб рэгіёне ў бібліятэцы самы поўны і багаты. Паўнату збору дакументаў, бясспрэчна, забяспечвае так званы "абавязковы асобнік" — кніжная скарбніца атрымлівае ўсё, што выдаецца на тэрыторыі вобласці бясплатна.

"Як на маю думку, дык усе аддзелы краязнаўства ва ўсіх абласных бібліятэках цікавыя. Функцыі ў нас аднолькавыя: усе намагаюцца як мага больш сабраць матэрыялаў аб сваім рэгіёне», — працягвае знаёміць з гісторыяй бібліятэкі і аддзела Любоў Турмасава. Краязнаўчая дзейнасць тут пачала развівацца з канца 50-х гадоў мінулага стагоддзя. І менавіта ў 50-х гадах, а дакладней — у 1957-м, бібліятэцы прысвоена імя першага беларускага акадэміка, заснавальніка беларускай філалогіі і мовазнаўства Я. Карскага.

А ў 1965 годзе ў структуру бібліятэкі была ўведзена адзінка бібліёграфа-краязнаўца. У 1981 годзе тут стварылі сектар беларускай краязнаўчай літаратуры. Праз дзесяць гадоў, у 1991-м, ён стаў аддзелам. Яшчэ праз некалькі гадоў вылучыўся асобны аддзел краязнаўства.

У 1965 годзе ў структуру бібліятэкі была ўведзена адзінка бібліёграфа-краязнаўца. У 1981 годзе тут стварылі сектар беларускай краязнаўчай літаратуры. Праз дзесяць гадоў, у 1991-м, ён стаў аддзелам. Яшчэ праз некалькі гадоў вылучыўся асобны аддзел краязнаўства.

Штогод бібліятэка выдае каля 20 творчых прац: "Бібліятэкі Гродзеншчыны за...год", штоквартальны інфармацыйны бюлетэнь "З жыцця бібліятэк вобласці", "Каляндар знамянальных сусветных дат", "Краязнаўчы каляндар".

Штогод бібліятэка выдае каля 20 творчых прац: "Бібліятэкі Гродзеншчыны за...год", штоквартальны інфармацыйны бюлетэнь "З жыцця бібліятэк вобласці", "Каляндар знамянальных сусветных дат", "Краязнаўчы каляндар".

Заглыбленне ў гісторыю пашырыла і геаграфічныя рамкі даследаванняў: усталяваліся добрыя стасункі з бібліятэкамі краін-суседзяў: у рамках міжнароднага праекта цяпер ідзе пошук агульных каранёў Беларусі і Польшчы — з Сувальскай публічнай бібліятэкай. Пасля сумеснай канферэнцыі выдалі ўжо бібліяграфічны паказальнік, які адлюстроўвае дакументы аб Гродзеншчыне і аб Сувальшчыне, якія ёсць у фондах бібліятэк з 1980 па 2000 гады. Яшчэ неблагія стасункі — з Падляскай Ваяводскай бібліятэкай. Дзякуючы гэтым стасункам перавыдалі кнігу Юркі Голуба. Ёсць у чытачоў стасункі і з расійскімі краязнаўцамі.

Цяпер аддзел краязнаўства працуе над падрыхтоўкай трэціх Гарадзенскіх чытанняў — яны будуць прысвячацца тэме гісторыі Гародні ў асобах. Адкрыты прагляд будзе мець назву: "Еўрапейскай вядомасці гарадзенцы". Сёлета тут багата юбілеяў: 725 год Давыду Гарадзенскаму, 475 — Стэфану Баторыю, 275 — Антонію Тызенгаўзу, 280 год — Марціну Пачобуту-Адляніцкаму. Чакаюцца цікавыя даклады гарадзенскіх навукоўцаў і краязнаўцаў, падчас якіх нават будуць адкрыты невядомыя старонкі жыцця некаторых знакамітых землякоў.

Ярына РЫТАМІНСКАЯ

На здымках: загадчыца аддзела краязнаўства Л. Турмасава; тут месціцца бібліятэка імя Я. Карскага.

Фота аўтара і Віктара Кавалёва

Не баяцца эксперыментаў

Кніга М. І. Верціхоўскай "Урокі літаратуры: пошук і творчасць" (РВУ "Літаратура і Мастацтва", Мн.: 2008) спалучае ў сабе розныя аспекты, якія дапамогуць настаўніку ў падрыхтоўцы ўрокаў па творчасці В. Быкава, Р. Баравіковай, А. Федарэнкі.

Кожны ўрок, распрацаваны М. Верціхоўскай, — гэта сінтэз метадычнага, творчага і аналітычнага падыходаў. Аўтар прапаноўвае настаўніку разнастайныя жанры ўрокаў у залежнасці ад іх тэматыкі і праблематыкі: урок-даследаванне, урок-досвед, урок-разгадка, урок-дэбаты, урок-адкрыццё. Можна сказаць, што гэта — нешта большае, чым уласна ўрокі, гэта не проста разбор і аналіз твораў. М. Верціхоўская спрабуе на прыкладзе творчасці беларускіх пісьменнікаў далучыць вучняў да агульначалавечых праблем, да здабыткаў сусветнай літаратуры і культуры, звяртаючыся да Біблii, да творчасці Ф. Дастаеўскага, Л. Талстога, А. Камю, Ж.-П. Сартра.

Вельмі важным з'яўляецца тое, што аўтар вялікую ўвагу надае менавіта ўласнай працы вучняў, калі яны не проста ўспрымаюць тыя "ісціны", якія прапаноўвае настаўнік, а самі дадумваюцца да пэўных высноў, знаходзяць адказы на найбольш актуальныя маральна-этычныя і філасофскія пытанні. Для дасягнення пастаўленай мэты настаўніку прапануюцца разнастайныя формы правядзення заняткаў: рознаўзроўневыя арыентацыйныя пытанні і заданні ў выглядзе тэхналагічных карт-арыенціраў, пытанне-індыкатар, дыскусійны элемент, індывідуальныя заданні, прыёмы супастаўлення, прэзентацыі напрацовак, спалучэнне пазакласнай працы па прадмеце з урокам пазакласнага чытання, рэйтынгавыя карткі, віктарына, тэставыя заданні.

Тым не менш, нягледзячы на дасканалую распрацоўку ўрокаў, якія спалучаюць у сабе разнастайныя метадычныя і творчыя напрацоўкі і з'яўляюцца для настаўніка гатовымі планамі-канспектамі, узнікаюць некаторыя пытанні наконт іх практычнага выкарыстання. У першую чаргу хочацца сказаць пра тое, што напрацоўкі М. Верціхоўскай разлічаны на вельмі шырокую эрудыцыю вучняў і вельмі высокую матывацыю іх навучальнай дзейнасці. Даволі праблематычна, думаецца, будзе правесці падобны ўрок у звычайнай агульнаадукацыйнай школе, бо сярэдні ўзровень падрыхтоўкі вучняў, на жаль, не заўсёды адпавядае таму, які хацелася б бачыць. У гэтым выпадку могуць быць выкарыстаныя толькі асобныя моманты з дадзенай кнігі.

Яшчэ хацелася б паспрачацца з М. І. Верціхоўскай наконт мэтазгоднасці шырокага выкарыстання тэставых заданняў на ўроках літаратуры. Усе-такі ў першую чаргу літаратура павінна вучыць уменню выказваць і даказваць свае думкі і погляды. Тэст на ўроку літаратуры можа быць ужыты, калі патрэбна праверыць веданне асноўных звестак па біяграфіі і творчасці (назвы і час выхаду зборнікаў, праграмных твораў). Аўтар, праўда, робіць агаворку, што "тэставыя заданні складзены не толькі з мэтай праверкі ведання зместу аповесцей, а каб і арыентаваць увагу вучняў на тыя моманты, якія вельмі важныя для выяўлення галоўнай думкі і філасофіі твораў...". Тым не менш, настаўнік павінен вельмі асцярожна ставіцца да выкарыстання тэстаў, каб не прывучыць дзяцей да павярхоўнага — на ўзроўні зместу — успрымання твора.

Кніга М. Верціхоўскай, безумоўна, адкрывае новыя далягляды ў выкладанні беларускай літаратуры, дае магчымасць і настаўнікам, і вучням актывізаваць свае творчыя здольнасці і будзе карыснай для тых, хто не баіцца эксперыментаваць, выкарыстоўваць новыя тэхналогіі ў вучэбным працэсе.

Алена ШЫШКО

Каб пазбегнуць лішніх версій...

Таямніца смерці Янкі Купалы – "пакутная загадка" многіх дзесяцігоддзяў і некалькіх пакаленняў даследчыкаў. На вялікі жаль, да сённяшняга дня з'яўляюцца ўсё новыя і новыя версіі аб прычынах трагічнай смерці народнага паэта Беларусі Янкі Купалы, з'яўляюцца версіі самага дзіўнага зместу і без аніякіх дакументаў, без усялякага грунту. Але хацелася б верыць, што людзі, якія прыдумляюць такога кшталту версіі, памятаюць, што народны паэт Беларусі Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч) – гэта асоба, якая належыць *усяму чалавецтву*. А таму, мусіць, трэба быць трохі больш абачлівымі ў сваіх прыватных фантазіях. А калі пісаць, то трэба спасылацца на дакументы, а не на артыкул, толькі за мінулы 2007 год (гл. "ЛіМ" № 27 ад 4 ліпеня 2008 г., артыкул Віктара Арцем'ева "Новы радок у версію трагічнай смерці класіка").

Зразумела, што Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы ўсе гады свайго існавання імкнуўся атрымаць матэрыялы камісіі, якая займалася высвятленнем прычыны смерці паэта. Аднак усе спробы былі безвыніковымі. Матэрыялы не толькі не былі перададзены ў музей, але нікому з супрацоўнікаў і не паказаны, нават сваякам паэта, якія працавалі і працуюць у музеі. Міжволі закрадваецца думка-сумненне, а ці існуюць такія дакументы? Ці ёсць яны? Ці захоўваюцца?

Сумненне супрацоўнікаў музея павялічылася, калі старшыня Міжнароднага фонду Янкі Купалы прафесар Вячаслаў Пятровіч Рагойша на запыт аб прычыне смерці Янкі Купалы з Цэнтральнага архіва ФСБ РФ 25 красавіка 1996 года атрымаў такі адказ:

"Уважаемый Вячеслав Петрович!

Ваше обращение в отношении народного поэта Беларуси Янки Купалы рассмотрено.

Сообщаем, что в Центральном архиве ФСБ России имеется только Спецсообщение 3-го Управления НКВД СССР от 29 июня 1942 года на имя Сталина и Молотова о несчастном случае, приведшем к смерти поэта.

Другими сведениями не располагаем.

Направляем Вам ксерокопию имеющегося документа.

Начальник архива (*nognic*) В. А. Гусаченко".

Да ліста дададзена ксеракопія «спецсообщения» з Цэнтральнага архіва ФСБ РФ:

"Разослать: т. Сталину, т. Молотову.

29/VI-42 г. № 1154/6.

Народному комиссару внутренних дел СССР тов. Берия.

Спецсообщение

28 июня в 22 часа 30 минут в гостинице «Москва» упал в лестничную клетку и разбился на смерть поэт Белоруссии **Луцкевич** (выдзелена намі. — **А.Б., М.Ч.**). Иван Доминикович, 1882 года рождения, литературный псевдоним Янка Купала.

Предварительным выяснением обстановки падения никаких данных, свидетельствующих о насильственной смерти или самоубийстве, не установлено...

Момент и обстоятельства падения **Луцкевича никто не видел**. (выдзелена намі. — **А.Б., М.Ч.**). Можно предполагать, что упал он с 9-го этажа, так как, начиная с 7-го этажа в лестничной клетке обнаружены капли крови...

Следствие ведёт военный прокурор г. Москвы.

Начальник 3-го Управления НКВД СССР (*nognic*) Горлинский.

29 июня 1942 года № 3/3/6661»

Атрыманыя з Масквы ліст і ксеракопію дакумента прафесар В. П. Рагойша перадаў у 1996 г. дырэктару музея Жане Казіміраўне Дапкюнас. Сёння яны захоўваюцца ў фондах Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы (КП 18794).

Супрацоўнікам музея вядома, што Янка Купала ў чэрвені 1942 г. урадавай тэлеграмай быў выкліканы ў Маскву. З гэтай нагоды, відавочна, у абмен на тэлеграму паэту было выдадзена камандзіровачнае пасведчанне, якое экспануецца ў навейшым раздзеле экспазіцыі музея (інв. № 940):

"Удостоверение

Выдано настоящее тов. Луцевич Ивану Доминиковичу /Янка Купала/ в том, что он действительно командируется Верховным Советом БССР в г. Москву с обратным возвращением в Казань.

Председатель Верховного Совета БССР (*nognic*) Н. Грекова

8 июня 1942 г. № 8-6-42."

У музеі Янкі Купалы захоўваецца фоназапіс Пятра Глебкі, аднаго з відавочцаў трагічнай падзеі ў Маскве (КП 3858, КНФ 125).

З гэтага запісу вядома, што Пятро Глебка зайшоў у гасцінічны нумар 1034 (дзесяты паверх) да Міхася Лынькова ў гадзін дзевяць-дзесяць вечара. У пакоі старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў было "шумна і гармідарна". Маладыя паэты-франтавікі, якія таксама былі выкліканы ў Маскву, сабраліся ў Лынькова, чакалі Янку Купалу. Панавала незвычайнае ўзбуджэнне ад прадчування жаданай сустрэчы. У хуткім часе сапраўды завітаў у гасцінічны нумар Міхася Лынькова Янка Купала. Ва ўсіх была неабходнасць перамовіцца аб радыёмітынгу, які павінен быў трансліравацца на Беларусь.

Як сцвярджаў Пятро Глебка, раптам зазваніў тэлефон. Міхась Лынькоў падняў трубку, выслухаў таго, хто званіў, нічога не адказаў, а гаманлівых маладых паэтаў папрасіў выйсці на балкон і зачыніць за сабой дзверы, бо, маўляў, нічога не чуваць, а размова важная. Разам з іншымі (Міхась Машара, Пятрусь Броўка, Пімен Панчанка, Кандрат Крапіва...) на балкон пайшоў і Пятро Глебка. Тэлефонная трубка была перададзена Янку Купалу. Паэт выслухаў, што яму гаварылі, пасля чаго пакінуў нумар Міхася Лынькова, выйшаў на лесвічную пляцоўку.

І хоць у пакой вярнуліся гаманкія паэты, з роздумам узгадвае Пятро Глебка, але ў нумары 1034 запанавала цяжкая цішыня... Усе курылі, жмурылі вочы ад дыму і кожны па-свойму перажываў прадчуванне трывогі і нават страху...

А праз пэўны час, узгадвае далей Пятро Глебка, цішыню парушыў шум і незвычайна глухі і моцны гук-удар. Не загаворваючыся, усе кінуліся да выхаду і ўніз па прыступках...

...Аб убачаным было загадана маўчаць... Узята падпіска...

У кніжным фондзе музея Янкі Купалы захоўваецца кніга артыкулаў Барыса Сачанкі "Сняцца сны аб Беларусі..." (Мн., "Мастацкая літаратура", 1990).

У першым раздзеле змешчаны артыкул, які даў назву ўсёй кнізе. Пад загалоўкам у дужках пазначана: "Загадка смерці Янкі Купалы" (с. 157). У артыкуле сабраны ўспаміны многіх тады яшчэ жывых сведкаў, якія сустракаліся з Янкам Купалам, бачылі паэта за гадзіну-дзве перад трагічным выпадкам, размаўлялі з ім, дамаўляліся аб сустрэчах, планавалі... Таму артыкул нагадвае журналісцкае расследаванне, з якога вывады павінны рабіць мы самі, правільныя вывады.

Менавіта 28 чэрвеня 1942 г. за гадзіну-дзве да смерці Янкі Купалы з паэтам сустракаўся вядомы даследчык і перакладчык купалаўскіх твораў Яўген Мазалькоў, які пасля ўзгадваў: "Назаўсёды застанецца ў памяці апошняя сустрэча з Янкам Купалам 28 чэрвеня 1942 года, за дзве-тры гадзіны да яго смерці. Іван Дамінікавіч сустрэў мяне неяк асабліва ласкава, цёпла, абняў, пацалаваў. Выгляд у яго быў свежы, настрой добры...

Я расказаў Івану Дамінікавічу, што ў дзіцячым выдавецтве толькі што выйшла складзеная мною кніга яго вершаў. Для яго гэта было прыемнай нечаканасцю. Адчувалася, што ён шчыра ўзрадаваўся..." У Янкі Купалы і Яўгена Мазалькова была дамоўленасць сустрэцца 29 чэрвеня ў 12 гадзін у дзіцячым выдавецтве, дзе паэт павінен быў атрымаць аўтарскія экземпляры толькі што выдадзенай кнігі і ганарар.

Супрацоўнікам музея Янкі Купалы таксама вядома, што Анатоль Астрэйка быў захоплены чалавечымі якасцямі і творчым геніем Янкі Купалы. Аб гэтым ён часта пісаў і згадваў у сваіх выступленнях (гл. кнігу ўспамінаў пра Янку Купалу "Такі ён быў", Мн., "Мастацкая літаратура", 1975).

У артыкуле Б. Сачанкі "Сняцца сны аб Беларусі" гаворыцца, што Анатоль Астрэйка амаль не адыходзіў ад Купалы ў тыя чэрвеньскія дні 1942 г. у Маскве. І толькі ведаючы, што Іван Дамінікавіч пайшоў да Міхася Лынькова, ён выправіўся па справах у горад. Калі ж вяртаўся ў гасцініцу, напаткаў трох чалавек, якія выскачылі з ліфта, беглі, ледзь не збілі яго з ног. А ў гасцініцы А. Астрэйку ўжо чакала страшная навіна аб смерці Купалы, пасля чаго ён цвёрда заявіў: "З Купалам расправіліся берыеўцы, якія хадзілі ўслед за паэтам па пятах, куды ён, туды і яны..."

На пытанне, чаму А. Астрэйка так катэгарычна заяўляе і ўскладае віну аб смерці Купалы на берыеўцаў, ён адказаў: "Купала быў незадаволены Сталіным і ўсім тым, што рабілася ў краіне перад вайною, і не хаваў гэтага".

А. Астрэйка пагаджаўся і з такой думкай Янкі Купалы, што "ва ўсіх няўдачах у барацьбе з фашыстамі і ў тым, што Беларусь стогне і сцякае крывёю пад нагамі акупантаў, вінаваты не хто-небудзь, а правадыр" [Сталін].

У пакутлівым роздуме аб трагічнай смерці Янкі Купалы Пятро Глебка згадваў яшчэ такі момант: "Янка Купала прыехаў у Маскву на Другі кангрэс Усеславянскага Камітэта, дзе павінен быў выступіць з прамовай. (У музеі Янкі Купалы захоўваецца дакумент (КП 26): "Тэматыка для напісання артыкулаў, дасланых Янку Купалу Усеславянскім Камітэтам 27/IV-42 г. у Пячышчы").

А за ўдзельнікамі кангрэса пільна назіралі і тады, і пазней. На жыццё некаторых быў зроблены замах. Гэтак жа па тэлефоне быў выкліканы з мінскай гасцініцы адразу пасля вайны Міхоэлс і не вярнуўся ў свой нумар. Яго знайшлі мёртвым на вуліцы. З абурэннем заключае П. Глебка: "Ці не адзін і той почырк?.."

Артыкул хочацца завяршыць радкамі Віктара Арцем'ева. Сапраўды, "слаўны сын Беларусі Янка Купала, незалежна ад любой з версій яго трагічнай смерці, быў, ёсць і будзе разам са сваім народам..." І куды цікавей звярнуцца да Купалы-паэта, публіцыста, філосафа, драматурга, перакладчыка, вучонага, змагара за вольную і шчаслівую Беларусь.

Алена БУРБОЎСКАЯ,
вучоны сакратар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы

Марыя ЧАБАТАРЭВІЧ,
галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы

Дзе неба святлейшае

Так лёсам было наканавана: Сцяпан Кухараў стаў для мяне добрым дарадчыкам і сапраўдным сябрам.

Мы пазнаёміліся ў той час, калі я працаваў галоўным рэдактарам краснапольскай раённай газеты "Чырвоны сцяг". Для Сцяпана Кухарава дзверы "Сцяжка" заўсёды былі адчынены — на правах земляка і былога селькара. Раней я з задавальненнем чытаў яго аповесці "Бацькавічы", "Зорка Канікула", але толькі пры асабістай сустрэчы даведаўся пра тое, што Сцяпан Іванавіч — франтавік, якому давялося зведаць у гады Вялікай Айчыннай вайны і роспач адступлення, і радасць вызвалення і пакінуць свой подпіс на сцяне рэйхстага. Распавядаў мне пра гэта Сцяпан Іванавіч доўгімі вечарамі ў мясцовай гасцініцы, дзе мне часова даводзілася ладзіць сваё адзінокае жыццё. Сцяпан Іванавіч, які на той час ужо быў рэдактарам аддзела нарыса і публіцыстыкі часопіса "Маладосць", даў мне шмат каштоўных парад, як стварыць неабходныя ўмовы для супрацоўнікаў рэдакцыі. У кожным яго слове адчуваўся клопат дасведчанага кіраўніка.

Першым падарункам пісьменніка стала для мяне яго кніга "Сцішанае поле", выдадзеная ў 1986 г. І толькі праз дваццаць гадоў я ўсур'ёз задумаўся над назвай: у сцішанасці крыецца нешта таямнічае, на моры пасля поўнага штылю разгараецца шторм. Думаецца, дзесьці ў патаемным закутку пісьменніцкай душы жыло няяснае прадчуванне будучай чарнобыльскай бяды. Дай Божа, каб кожнае поле заставалася сцішаным і добрым для роду чалавечага.

Амаль ва ўсіх творах Сцяпана Кухарава бачыцца краснапольская рэчаіснасць, а пратыпамі мастацкіх вобразаў з'яўляюцца яго землякі. Такое адчуваецца і ў "Сцішаным полі", і ў іншых апавяданнях, нарысах, эсэ. Вось і ў "Сонцы паэтавай душы" Сцяпан Іванавіч вядзе гаворку пра літаратурны шлях слыннага земляка Аляксея Пысіна, які яшчэ ў школьны час меў поўны сшытак паэтычных радкоў, аднак не паказваў іх ні сябрам, ні настаўнікам, па сціпласці сваёй — саромеўся.

Так сталася, што першым чытачом кнігі нарысаў "Родная глыбінка" давялося быць мне. Я ўхваліў задуму Сцяпана Іванавіча паказаць гісторыю родных мясцін ад старажытнасці да нашых дзён. Асабліва кранулі развагі пра тое, што ў кожнага з нас ёсць запаветны куточак, які мы называем малой радзімай, адтуль — з матчынай калыскі, з бацькоўскага парога пачынаецца дарога ў вялікі свет, і пачуццё малой радзімы зліваецца з пачуццём Радзімы вялікай. Пісьменніка радавалі станоўчыя змены, што адбываліся ў роднай глыбінцы. Ён шчыра цікавіўся, як гаспадараць сённяшнія хлебаробы і будаўнікі, бо менавіта ў іх руках лёс зямлі, якой дзяды і бацькі аддавалі ўсе сілы, бо толькі яна, зямля, была іх карміцелькай, іх лёсам.

Многаму мне давялося навучыцца ў свайго добразычлівага сябра падчас сумесных паездак па раёне, наведванні яго родных Стаек. Пісьменніка вельмі цешыла тое, што яго бацька, данецкі шахцёр, пакінуў пра сябе добрую памяць. І самога Сцяпана Іванавіча родны куток дагэтуль прыцягвае да сябе, як магніт. Яно і не дзіва — тут прайшлі юнацтва і маладосць, тут, здаецца, і неба святлейшае, і зямля цяплейшая.

Фёдар ГАНЧАРОЎ

Палессе нельга разгадаць

Дэцэнтралізацыя літаратуры — з'явішча натуральнае і заканамернае. Зусім нядаўна актыўнае супрацьстаянне Мінску ажыццяўлялі полацкія, гомельскія і гарадзенскія літаратурныя суполкі. Што да прадмета нашай гаворкі, то тут нельга першынство аддаць Брэсту як літаратурнаму цэнтру. Больш навукова было б разглядаць асобны культурна-лінгвістычны заходнепалескі кангламерат, дзе з прычыны "балотнай" размытасці і няпэўнасці існаванне цэнтра ўвогуле немагчымае (на яго, праўда, прэтэндуюць і Брэст, і Баранавічы, і Пінск, і Белаазёрск). РВУ "Літаратура і Мастацтва" ўжо ўскосна пацвердзіла гэта, перавыдаўшы кнігу "Літаратурная Берасцейшчына" В. Ляшук і Г. Снітко. Новая ластаўка — калектыўны зборнік "Трохперсце" (лірыка М. Рудкоўскага, М. Пракаповіча і А. Каско).

Паводле сваёй структуры гэта, безумоўна, кніга наватарская: апрача ўласна вершаў сюды ўваходзяць агульная прадмова да ўсяго зборніка і тры крытычныя артыкулы на кожнага з паэтаў адпаведна. Жанр прадмовы, што квітнеў за савецкім часам, сёння занядбаны. Нават літаратурная класіка выдаецца без прадмоваў, хоць шмат што з яе цяпер трэба добра каментаваць, каб пазбегнуць рэцэптыўных непаразуменняў у сучаснага чытача. Да таго ж трэба і крытыкам даць якую капейчыну, "каб не ўмёрлі"! Такім чынам, маем "у нагрузку" да трох паэтычных падборак тры мастацкія крытычныя метады — У. Калесніка (вобразна-фармальны), Г. Праневіча (эпатажна-параўнальны) і Л. Галубовіча (тэолага-паэталагічны). Тут жа — каштоўныя фактаграфічным матэрыялам (не сёння дык заўтра біёграфы скажуць вялікі дзякуй) і проста кранальнасцю ўспаміны Ірыны Рудкоўскай, сястры старэйшага з "трохперсця", памерлага ў 1991 годзе паэта Міхася Рудкоўскага. Пра яго і хочацца пагаварыць больш падрабязна, бо гэта сёння — адзін з плеяды паўзабытых у сталічным Мінску літаратараў.

Адметнасць лірыкі Міхася Рудкоўскага — тонкі, журботны лірызм. Бясспрэчна, што ў пачатку творчага шляху Міхась Рудкоўскі знаходзіцца ў агульнай плыні лірыкі "шасцідзесятнікаў": радасныя, бадзёрыя творы маладосці адлюстроўваюць зараджэнне новага дня ў гісторыі і, як характэрная асаблівасць таго часу, сам паэт адчувае ўласную далучанасць да вялікіх зрухаў эпохі.

Міхась Рудкоўскі нарадзіўся (17.04.1936) у сялянскай сям'і на Ганцаўшчыне, тады яшчэ ў Заходняй Беларусі. Скончыў Пінскае педвучылішча і пэўны час працаваў настаўнікам, паралельна вучыўся на завочным аддзяленні філалагічнага факультэта Брэсцкага педагагічнага інстытута (1956-1961). Па заканчэнні вучобы перайшоў на журналісцкую працу ў ганцавіцкую раённую газету "Сялянская праўда". Там жа, пры непасрэднай падтрымцы вядомага нарысіста В. Праскурава, стаў больш сур'ёзна ставіцца да ўласнага пісання вершаў. У 1962 г. пераехаў у Брэст, дзе ўжо пастаянна працаваў на Брэсцкай студыі тэлебачання як рэдактар літаратурна-музычных праграм.

Першая публікацыя паэта датуецца 1959 годам. З таго часу М. Рудкоўскі рэгулярна выступаў у друку з новымі творамі. Выйшлі паэтычныя зборнікі "Першыя вёрсты" (1963), "Сінія Брады" (1967), "Позвы" (1971), "Векавечная Бацькаўшчына" (1976), "Трыгор'е" (1981), "Засцярога" (1984), пасмяротная кніга "Гарынь" (1992); у 1986 годзе пабачыла свет выбранае — "Залатазвон".

Адметнасць лірыкі М. Рудкоўскага — тонкі, журботны лірызм. Бясспрэчна, што ў пачатку творчага шляху М. Рудкоўскі знаходзіцца ў агульнай плыні лірыкі "шасцідзесятнікаў": радасныя, бадзёрыя творы маладосці адлюстроўваюць зараджэнне новага дня ў гісторыі і, як характэрная асаблівасць таго часу, сам паэт адчувае ўласную далучанасць да вялікіх зрухаў эпохі. У той жа час у вершах М. Рудкоўскага мы бачым усе адзнакі г. зв. "ціхай лірыкі", якая з'явіцца ў савецкай паэзіі толькі напрыканцы 1960-х. Для М. Рудкоўскага "гучнасць" была арганічна чужой і абсалютна непрымальнай. Нездарма крытык У. Гніламёдаў, рэцэнзуючы дэбютны зборнік паэта "Першыя вёрсты", наракаў: "Хочацца адзначыць залішнюю стрыманасць лірычнага героя; у гэтым відавочны недахоп паэта як лірыка, недахоп, ад якога яму неабходна пазбавіцца". Распаўсюджанае тагачаснае меркаванне: маладая паэзія мусіць штурмаваць бастыёны капіталізму, усхвалявана, бадзёра адлюстроўваць настроі сацыялістычнага грамадства. А М. Рудкоўскі адразу ж скіроўвае сваю ўвагу на прыроду Беларусі і ўнутраны свет чалавека, перадусім на жыццё вёскі, на паэзію вясковага жыцця. Былі выбраны і літаратурныя настаўнікі — М. Танк і У. Караткевіч. Але сапраўды значным творчым даробкам паэта стаў яго другі зборнік "Сінія Брады". Як адзначаў у прадмове да "Залатазвона" У. Калеснік, літаратурны апякун заходнепалескай літаратуры, "найбольш важным паказчыкам сталення таленту было тое, што паэт убачыў тры эстэтычныя крыніцы ў роднай зямлі: першая — самавітае жыццё палескай вёскі з яе працоўна-патрыярхальнымі цнотамі, звычаямі, казачнымі традыцыямі, культам праўды і дабрыні; другая — яшчэ жывая балючая рана адгрымелай вайны і пераходзячая ў легенду памяць пра яе ўдзельнікаў, герояў і ахвяр; трэцяя была экзатычная прырода Палесся, ад пінскіх балот да волатных дубоў і зуброў у Белавежскай пушчы".

У 1970-я гады мастацкая адкрытасць паэта ў пэўнай ступені пачынае падладжвацца пад запатрабаванні часу: пішуцца вершы пра камуністаў, усё больш узнікае твораў, якія нясуць на сабе адзнакі прафесіяналізму М. Рудкоўскага, але не шчырага пачуцця паэтычнай навізны. Напрыканцы 70-х М. Рудкоўскі ўваходзіць у плынь творчай дэпрэсіі, з'яўляюцца песімістычныя і апатычныя вершы, поўныя зняверанасці ў сабе. Насуперак недаўменным водгукам У. Калесніка думаецца, што такі "пераходны перыяд" быў выкліканы папярэдне створаным: М. Рудкоўскі зразумеў, што як творца ён робіць не ўласцівую яму па духу работу грамадзянска-публіцыстычнага лірыка. У вершах 1980-х гадоў і асабліва ў пасмяротным зборніку "Гарынь" паэт становіцца цалкам элегічным, натуральным сабе ранейшаму. Узрастае і трагедыйнасць, адсутная ў першых зборніках і яўна відавочная ў апошніх.

Наогул, паглыбленне ў сябе, у філасофію жыцця і прыроды выступае ў М. Рудкоўскага як эвалюцыя мастацкага мыслення, прагрэсуе ад зборніка да зборніка. У "Трохперсце" ўвайшлі вершы, якія адлюстроўваюць самыя асноўныя канцэпты творчасці паэта: "жніво", "зерне", "лес", "вёска", "сын", "будучыня". Канцэпты гэтыя ўвогуле знакавыя для айчыннай літаратуры і ніколі не сыдуць у нябыт, бо знаходзяцца па-за беларускай тэматыкай і ў полі прыцягнення культуры сусветнай, спалучаныя з фальклорам і *ладам* каляндарнага цыкла. Адзінства з прыродай — тут гэты зашмальцаваны крытычны выраз не будзе прывязкай, у ім — глыбінная характарыстыка лірыкі Рудкоўскага. Нездарма блізкім да яго па светаўспрыманні быў сябар Мікола Купрэеў. Тым не менш, Купрэеў заўсёды імкнуўся выйсці "за рубеж чалавечага слова", а Рудкоўскі, пры багатай сваёй жанравай разнастайнасці і эксперыментах у форматворчасці, ніколі з межаў не выходзіў, і ў гэтым імкненні да класічнасці ўсе ягоныя перавагі і страты.

Мікола Пракаповіч і Алесь Каско — паэты маладзейшыя за Рудкоўскага. Хочацца, насуперак сённяшняй пагардзе да літаратурнай сацыялогіі, назваць іх прадстаўнікамі пакалення "сямідзесятнікаў" — самага прадстаўнічага ў нашай літаратуры. Пафас "шасцідзесятнікаў" быў, у сваёй сутнасці, публіцыстычным. Наступнае пакаленне вылучала на першы план праблематыку нацыянальна-культурную, адраджэнскую. Разам з тым, іх сталенне прыйшлося на самы складаны час — 70-я, пара застою. Праз гэта — і пэўная нерэалізаванасць, *незавершанасць* паэтаў-сямідзесятнікаў, шмат хто з іх назаўжды застаўся пакінутым у сваім часе... Але не забываем і выдатных паэтаў, што раскрыліся менавіта тады,

Эмацыянальны тон лірыкі Міколы Пракаповіча адлюстроўвае пераход ад уласна публіцыстычнасці "шасцідзесятнікаў" да нацыянальна-адраджэнскай тэматыкі "сямідзесятнікаў". Каталізатарам выступіла творчасць Уладзіміра Караткевіча — чалавека, які, бясспрэчна, знаходзіўся нібыта не ў сваім часе. Праз яго многія далучаліся (а колькі яшчэ далучыцца!) да беларускага слова, пад яго ўплывам самі пачыналі пісаць. Традыцыя Караткевіча надзвычай заўважная ў лірыцы Міколы Пракаповіча.

nomina sunt odioza.

Эмацыянальны тон лірыкі Міколы Пракаповіча якраз і адлюстроўвае гэты пераход ад уласна публіцыстычнасці "шасцідзесятнікаў" да нацыянальна-адраджэнскай тэматыкі "сямідзесятнікаў". Каталізатарам выступіла творчасць Уладзіміра Караткевіча — чалавека, які, бясспрэчна, знаходзіўся нібыта не ў сваім часе. Праз яго многія далучаліся (а колькі яшчэ далучыцца!) да беларускага слова, пад яго ўплывам самі пачыналі пісаць. Традыцыя Караткевіча надзвычай заўважная ў лірыцы Міколы Пракаповіча:

Над Бугам
крылацяцца стругі —
то Вітаўт у пушчу, на ловы
кіруе дружыну выгульваць:
напярадзе Грунвальд.

Захапленне гісторыяй можа нечакана і міла праглянуць нават у вершах пейзажнай лірыкі:

Як Радзівілаўна,
пыхліва-урачыста
выступвае варона па раллі.

Нельга не заўважыць схільнасці аўтара да рэтраспектыўнага паэтычнага мыслення. Нядаўняя і даўняя мінуўшчына (ці, паводле В. Ластоўскага, "старасьветчына") жывіць паэта, ён — увесь там, і нездарма вялікая частка лірыкі Пракаповіча — ролевая; лірычны герой як бы схаваны. У той жа час Рудкоўскі і Каско выкарыстоўваюць прынцып разгортвання верша праз "я" (аўталагічная), ад першай асобы, дзякуючы чаму з'яўляецца спавядальная інтанацыя. У М. Пракаповіча аўталагічная лірыка найбольш прысутнічае ў вершах пра каханне, што абумоўлена тэматыкай. Як асноўныя лексічныя паняцці ў паэзіі М. Пракаповіча выступаюць "вольнасць", "Палессе", "Айчына", "Памяць", "каханне". Сям-там праходзіць гульнёва-іранічны прабліск: "тукаюць рыфму жураўлі", "на кухні а la ізба", "падобны да тарпана, мышасты конік з калгаса "Светлы шлях". Але агулам настрой кнігі не жартаўлівы, а сур'ёзны, хоць і відаць, што аўтар сам па сабе ніколі песімістам не будзе.

Не зламацца... Хапіла б сілы
дачакацца зоркі сваёй, —
і з крыжа вырастаюць крылы,
каб узняць цябе над зямлёй.
Каб убачыў ты, як праз маскі
праступаюць твары людзей

...Раскажы мне, надзея, казку,
абнадзей мяне, абнадзей.

Г. Праневіч адзначае "публіцыстычны тэмперамент і прамоўніцкі пафас паэзіі М. Пракаповіча, многія вершы якога нібы разлічаны на вуснае выкананне, выкліканы непасрэдным жаданнем паэта выказацца і быць пачутым". Дадам яшчэ, што лірыка М. Пракаповіча мае, на мой погляд, і сваю вызначаную мэтавую аўдыторыю, а менавіта падлеткаў і юнакоў; да іх, у асноўным, звяртаецца ён, на іх імкнецца ўплываць, і, мяркуючы па выхаванцах гуртка Пракаповіча (а гэта Я. Дашына, С. Прылуцкі, М. Шчур), зерне ўпала не на камень.

Паэзія Алеся Каско прайшла складаныя этапы станаўлення. Нельга не згадзіцца з Л. Галубовічам, што "рэдкі верш у яго быў прахадным, а слова абманным; так,

Новыя вершы Алеся Каско сталі абсалютна дакладнымі, выверанымі, празрыстымі. Адчуваецца і багатая культура творчасці, і той жа верлібр не ператвораны, як у сённяшніх маладых, у супавы набор нерыфмаваных радкоў — у Каско верлібр тонкі, трапны і завяршаецца гэтак жа звонка, як талстоўскія перыяды.

яно яшчэ магло быць выпадковым, немілагучным і каструбаватым, але заўжды — шчырым і безабаронным у адносінах да выяўленых ім рэчаў і дзей". У той жа час тэматыка яго вершаў пакрысе развівалася з непасрэдна-адраджэнскай да экзістэнцыйнай, скіраванай углыб сябе. Гэты шлях не быў лёгкім: уплывалі і грамадска-палітычныя падзеі 90-х, і падзеі асабістага кшталту. Ужо гадоў дзесяць таму паэзія Каско стала падкрэслена філасофскай, але заўважалася яшчэ пэўная вірлівасць зместу, які не знаходзіў у паэта сваёй формы, праз гэта і пэўная містычнасць, загадкавасць ягоных твораў нядаўняга часу. Новыя вершы Алеся Каско сталі абсалютна дакладнымі, выверанымі, празрыстымі. Адчуваецца і багатая культура творчасці, і той жа верлібр не ператвораны, як у сённяшніх маладых, у супавы набор нерыфмаваных радкоў — у Каско верлібр тонкі, трапны і завяршаецца гэтак жа звонка, як талстоўскія перыяды. Здзіўляе багацце вершаваных памераў (праўда, бянтэжыць выкарыстанне піянерскага чатырохстопнага харэя ў некаторых філасофскіх творах), ёсць і цвёрдыя формы верша, прыбрана ўсё лішняе: відавочна, Каско цяпер знаходзіцца на пад'ёме, што не можа не радаваць. Паэт заўсёды гаворыць пра тое, што для яго самога ў дадзены момант — найважнейшае, найгалоўнейшае. Верш — шчыльны збор паэтавай свядомасці, і схлусіць чытачу, схаваць сваю бяздарнасць ці таленавітасць у дзесяці радках немагчыма: усё тут як на далоні. Таму і важнае самаабмежаванне: "падзяляй і валодай", бо не слова павінна валодаць паэтам, а паэт словам. У многіх творах новай кнігі Каско згушчанасць думкі і пачуцця дасягаюць гармоніі, пазначанай пячаткай паэтычнае сталасці; я маю на ўвазе тую гармонію, што нараджаецца з дысгармоніі:

Шлях за краем міне.
Неўпрыкмет, непарадна...
Быццам восень,
ідуць — межавая пара.
Гэта горкая,
ды напраўдзівая праўда:
трэба так, як трава,
як лісцё, паміраць.

Тэма смерці гучыць у вершах даволі часта, але нельга падманваць і гаварыць пра глухі песімізм Каско. Не, гэта "скруха ад ведання". І хутчэй за ўсё Эклезіяст меў на ўвазе веданне людзей, а не кніг... Гэта "память смертная", адзін з галоўных манаскіх прынцыпаў ачышчэння душы, гэта позірк у неваратъ, "за край", позірк спакойны, ды не раўнадушна-інтэлектуальны, бо смерць — не мастацкі вобраз.

Спрабуе звон суняць
птушыны грай,
за могілкі шугае, утрапёны,
за луг, за край зямлі...
А дзе той край?
Ды там ён, там,
адкуль крычаць вароны.

Але ёсць і надзея на ўваскрасенне, ёсць памяць зерня, што павінна знікнуць, каб прынесці "много плода". Зрэшты, паэт адкрыта не пазіцыянуе сябе як хрысціянін, наадварот, гаворыць пра "недасяжнае" для яго неба. Але так гістарычна склалася, што выдатная паэзія амаль заўсёды ідзе наўзбоч рэлігіі, бо баіцца прафанацыі невымоўнага...

Гаварыць тут яшчэ ёсць пра што, але бясспрэчна адно: падборка вершаў Каско, змешчаная ў "Трохперсці", — адна з лепшых з'яў сучаснай паэзіі "сямідзесятнікаў", якія сёння ў большасці сваёй, адчуваючы сябе ПАЭТАМІ, "почивают на лаврах". У гэтым і плюс вышэй адзначанай дэцэнтралізацыі: на адлегласці ад сталіцы літаратура развіваецца нязмушана, свабодна, незалежна (шкада, праўда, што там значна менш уласна беларускай прасторы, але дзе яе шмат? На могілках у Саўт-Рыверы?).

Што і казаць, кніжка выйшла добрая. Ды ёсць адно "але"... У зборніку трапляюцца памылкі, і як для невялікай кнігі, то іх зашмат. Так, напрыклад, першы абзац артыкула У. Калесніка абрываецца на палове сказа. Некаторыя памылкі ў вершах М. Рудкоўскага перайшлі з прыжыццёвых яго выданняў. Найбольш хібаў якраз у крытычных артыкулах. Ёсць і яшчэ сёе-тое...

Але не будзем засмучацца. Галоўнае ўсё-такі ў тым, што адметная заходнепалеская паэзія жыла, жыве і будзе жыць, чаму пацвердженнем зборнік "Трохперсце".

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

Неба яе душы

Лірычная гераіня кнігі Алы Нікіпорчык "Пад бахаўскую такату дажджу" ўсвядоміла для сябе, што шчасце на зямлі наогул немагчымае, на вялікі жаль. "Зямля, спакутаваная болем", таму што недасканалы чалавек не можа зрабіць дасканалымі свае суадносіны з іншымі людзьмі і свае адносіны да ўсяго зямнога, ды і нябеснага. Яе душа — гэта "верх адзіноты" ў самотным краі. У "сугалоссі з любоўю ў боль", радкі вершаў нараджаюцца, праходзячы праз "цёмны тунель болю", "боль перамагае вечнасць". Вядома ж, як і ўсе, гераіня прагне шчасця, але ўжо мала верыць у яго магчымасць. Сярод дажджынак-слёз — усяго толькі кропля радасці; сцішаны вясковы вечар зрабіў бясконца добрым увесь сусвет — але ж гэта:

спадманнае
вечаровае
пачуццё!

Лірычнай гераіні патрэбны сінтэз, сугучча, суіснаванне ў разуменні, супадзенне ў настроях думак і пачуццяў — гармонія. Ёй амаль жахліва, што *у гэтым свеце / усё паасобку / сляза і радасць / душа і цела / жыццё і каханне.* Зямная ісціна заўсёды ў "залатой сярэдзіне", зямная мудрасць — ва ўменні знайсці гэтую сярэдзіну і трымаць раўнавагу. Гераіня Алы Нікіпорчык гэтага не робіць. Яе пачуцці абвостраны да невыноснасці трываць іх, яна ўвесь час на краі: то ляціць у Неба, дзе толькі і знаходзіць паратунак:

калі што ёсць сапраўднае
то толькі там — у сапраўдным Небе...

"Народжаная для болю", яна ідзе па зямлі заўважаючы паўсюдна драматызм і трагізм жыцця, глыбока разважаючы аб іх прыродзе, назіраючы за супярэчнасцямі, з якіх яны вынікаюць. Але ў яе зямной журбе ёсць светлы сэнс — выснова сусвету для яе:

прайсці праз боль —
вярнуцца — праз святло.

Да сябе, да людзей, да шчасця, да разумення, да даравання — ачысціўшыся...

Сваё бачанне свету, думкі і перажыванні Ала Нікіпорчык выказвае ў форме свабоднага верша — верлібра. Ёсць меркаванні, што рыфма часам прымушае сказаць міжволі штосьці не тое. Яе адсутнасць дазваляе заўсёды знайсці самыя дакладныя словы для выяўлення душы, стварэння вобразаў, не абмяжоўвае плынь думак і пачуццяў. Дзякуючы свабоднаму парадку размяшчэння слоў у радку, можна акцэнтаваць самае важнае, паставіўшы яго паасобку, напрыклад, засяродзіцца на згубленасці ў часе свайго "я": *гэта я страціла час / ці гэта час страціў / мяне?*

У некаторых вершах ёсць зарыфмаваныя радкі. Неспадзяваныя, яны становяцца меладычным цэнтрам верша, яго высокай пранізлівай нотай, пасля якой рытм замаруджваецца, інтанацыя ідзе на спад.

Паэтка выкарыстоўвае ў большасці абстрактна-асацыятыўныя тропы, ствараючы вобразы з вялікай доляй умоўнасці, выяўляючы свой непаўторны жыццёвы вопыт, свае лагічныя ланцужкі паміж з'явамі і предметам рэчаіснасці. Некаторыя вобразы мяне проста ўразілі: *белыя палоскі снегу / нібы астраўкі мінулага часу /дзе я ніколі / не была, у расчыненую пустыню сусвету / вецер б'е / некранутыя дзверы, на дне стагоддзя / невычэрпны / мой дзень.*

Малюнак Алы Нікіпорчык — канкрэтны ці абстрактны — найчасцей складаецца з дэталяў, асацыятыўна звязаных паміж сабой у адно цэлае: *на змярканні святлее душа / і так ясна праступаюць у ёй / неба / воблакі / жасмінавая нізка духмяных пялёскаў / і нават вершаваны радок.*

Шмат вершаў пабудаваны на рэзкіх супрацьпастаўленнях, аздобленых дэталямі. Імкненне разгледзець кожную з'яву з двух яе супрацьлеглых бакоў прыводзіць паэтку да выкарыстання ў творчасці перакрыжаваных параўнанняў: *дзьмухаўцамі-воблакамі / і воблакамі-дзьмухаўцамі / ахінуся / засланюся /паплыву /і не вярнуся.*

У творах часам сустракаюцца нечаканыя канцоўкі, якія як бы не зусім вынікаюць з папярэдняга зместу і надаюць яму шырыню і глыбіню: *тэлефаную табе / адклікаешся / голасам / толькі.*

Ала Нікіпорчык жыве дзеля творчасці, яе ачышчальных пакутаў і выратавальнай прасветленасці — гэта вынікае з яе вершаў:

час вершаў — гэта час жыцця
астатні час жыццю
не належыць

Мне гэта зразумела, бо і я ведаю, што нават пасярод няшчасця натхненне можа зрабіць чалавека шчаслівым.

Галіна САМОЙЛА

Водгалас

З цікавасцю прачытаў аб'ёмны артыкул Яўтена Гарадніцкага "Межавыя капцы не расстаўлены..." (№ 7 за 15 лютага 2008) і з'явілася жаданне выказацца па некаторых пунктах.

А навокал — «Гоман», «Гоман»...

На пачатку артыкула — жыццясцвярджальнае выказванне аб прычынах ажыццяўлення сучаснага літаратурнага руху — "не на апошнім месцы сярод іх — пашырэнне выдавецкіх магчымасцей, даступны выхад са сваімі творамі на старонкі друкаваных выданняў, па сутнасці, для ўсіх, хто таго жадае".

Наколькі мне вядома, у нашай краіне толькі адно творчае дзяржаўнае выдавецтва — "Мастацкая літаратура". А сотні членаў Саюза пісьменнікаў, і тых, хто яшчэ на падыходзе? Куды ж усім ім падзецца?

Раней выйсцем для многіх паэтаў былі выпускі зборнікаў "Дзень паэзіі". Было там, усё лепшае і ад лепшых, затым перасталі і іх выдаваць. Праўда, нядаўна адбыўся адзін выпуск, падрыхтавалі і новы. Але ён ніяк не выходзіць. Кажуць: папярэдняя кніжка не разыходзіцца... А там жа — вышэйшы клас!

Няслушным падаецца зробленае Яўтенам Гарадніцкім падзяленне літаратуры на прафесійную і аматарскую. Літаратура і мастацтва — яны ці ёсць, ці іх няма. Такое раздзяленне больш падыходзіць для артыстаў — ёсць славутыя ансамблі, а ёсць і мясцовыя гурты, многія з якіх нярэдка ненамнога адстаюць ад прафесійных. Што ж датычыць літаратараў, мастакоў, кампазітараў, скульптараў, архітэктараў ды іншых прадстаўнікоў творчага клана, то ўсе яны праходзяць шматступенчатыя прыступкі творчага росту: пачатковец, малады, сярэдняга ўзросту (сталы), стары — вопытны. Ніхто не нараджаецца майстрам. Усе праходзяць шлях цяжкі да сталасці. І гэта заканамерна. І гэтаму трэба ўсяляк садзейнічаць. На ўсіх узроўнях.

А цяпер звернемся да літаратурна-мастацкага альманаха "ГОМАН". Высакародная ідэя падтрымкі ўсіх літаратараў — ад піянераў да пенсіянераў. Адкрыццё новых талентаў і падтрымка даўно вядомых. Дарога ў літаратуру для соцень здольных людзей з усіх куткоў краіны. Дэмакратычнае стаўленне. Ніводнае выдавецтва не можа гэтым пахваліцца.

Арганізатарам, натхніцелем і выканаўцам гэтай ідэі ўзяўся быць наш вядомы пісьменнік Мікола Трафімчук. Так сказаць, на грамадскіх пачатках. Ён сам і знаходзіць, і апрацоўвае, шліфуе, рыхтуе да друку творы. Ёсць і добраахвотныя памочнікі — зноў жа на грамадскіх пачатках. Але ж уся адказнасць ляжыць на ім — галоўным рэдактары. А хто фінансуе? Ды ніхто. Самі аўтары, якія плацяць за свае публікацыі нямала. Дык трэба ж плаціць і за паперу, і друкарням. Плануецца выпуск раз на два месяцы, але адбываецца — раз на тры, а бывае і большы перапынак. Грошы, грошы, грошы... І выпускі затрымліваліся.

Добра, калі ў правінцыйнага літаратара належным чынам склаліся адносіны з мясцовым друкам — з раённай, гарадской, яшчэ лепш — з абласной газетай. А калі — не? Тады пішы "пад падушку". Многія ж рэспубліканскія выданні зусім не друкуюць літаратурных твораў.

Мікола Трафімчук здзяйсняе высокі грамадзянскі подзвіг у імя развіцця нашай літаратуры — і беларускамоўнай, і рускамоўнай. Паэзія, проза, крытыка, публіцыстыка, сатыра і гумар, развагі жыцця — усе жанры напаказ. Гэта цяжка нават дзяржаўным выданням з немалым штатам аплачваемых супрацоўнікаў. А тут — адзін, амаль адзін — і працуе, змагаецца, аж жылы трашчаць. "Ни сна, ни отдыха измученной душе". А справа ў тым, што знешне спакойны пісьменнік, чалавек у душы не мае спакою. Прага адкрыцця новых талентаў кіруе ім. Магутнае жаданне падтрымаць здольных да творчасці людзей.

Не ўсе публікацыі на вышэйшым узроўні. А дзе яны ўсе — на вышэйшым? Ёсць і першыя спробы пяра. І творы тых, хто па дарозе да творчай сталасці. І вядомыя майстры слова там публікуюцца. А для маладзейшых гэта — добрая школа, значны штуршок для паступальнага руху наперад.

Вакол літаратурна-мастацкага альманаха "ГОМАН" сапраўды заўсёды чуецца гоман. Наклад невялікі, але яго многія з цікавасцю чытаюць. Кола аўтараў пастаянна пашыраецца. Як кажуць, свае творы нясуць, дасылаюць і малыя, і старыя. І ведаюць, што без адказу не застануцца. Неабгрунтаванай адмовы не будзе. І ў гэтым вялікая заслуга заснавальніка і галоўнага рэдактара Міколы Трафімчука.

Мікола ВЯРШЫНІН

Казкі з «Чароўных пацерак»

У 2006 годзе выдавецтва "Мастацкая літаратура" заснавала серыю "Беларуская аўтарская казка". Мне пашчасціла пачытаць з гэтай серыі кнігу казак "Чароўныя пацеркі". У кнізе шмат прыгожых малюнкаў. У ёй прадстаўлены творы ажно трыццаці двух пісьменнікаў. Укладальнікам "Чароўных пацерак" з 'яўляецца пісьменніца Алена Масла.

Казкі з "Чароўных пацерак" вучаць юнага чытача любіць родную зямлю і берагчы яе харство, быць добрым і спагадлівым, спрыяюць развіццю назіральнасці.

У кнізе змешчаны казкі "Скарб" Змітрака Бядулі, "Пра цуд мастака і Блакітную Вежу" Раісы Баравіковой, "Пра мядзведзя-пагарэльца і яго сяброў" Міколы Маляўкі, "Як браты золата знайшлі" Андрэя Федарэнкі, "Буры мядзведзь", "Шылахвостка" Віктара Праўдзіна, "Чароўны персік", "Пра хлопчыка "Ай"", "Разумны пеўнік" Уладзіміра Ліпскага, "Хто гаспадар?", "Зорка для капрызы" Алеся Бадака, "Пеўнік-спеўнік" Уладзіміра Мазго, "Балотная кансерваторыя", "Праўдзівая зорная казка" Алены Масла. Усіх і не пералічыць...

Напрыканцы мушу выказаць такую заўвагу: мне здаецца, што казкі рускамоўных пісьменнікаў Маіны Бабарыкі, Святланы Хахловай, Арнольда Дыбчы, Андрэя Гарвата, Дзмітрыя Вінаградава, Леаніда Чумакова, Аляксандра Каравулава і Валерыя Квілорыя варта было перакласці на беларускую мову. Тым больш, што ў кнізе ёсць зроблены Рыгорам Барадуліным пераклад казкі Івана Бурсава "Як дзед па дождж хадзіў", а таксама казка Валерыя Кастручына "Глюк" у перакладзе Алеся Наварыча.

Нягледзячы на гэта, кніга "Чароўныя пацеркі" атрымалася змястоўнай і цікавай і будзе прыхільна сустрэта як юнымі чытачамі, так і дарослымі.

Янка ГАЛУБОВІЧ

Лялькі. Тэатр. Жыццё

Празаік Міхась Южык вучыўся ў Мінскім радыётэхнічным інстытуце, працаваў на ВА "Гарызонт". А ў 1997 годзе ўладкаваўся ў рэдакцыю грамадска-публіцыстычнага часопіса "Акно". Той, хто сочыць за творчасцю Южыка, пэўна ведае яго кнігі прозы "Перакулены час", "Мёртвае дрэва". А цяпер з'явілася навінка — раман "Марыянеткі і лялькаводы", выдадзены як дэбютны ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" ў 2008 годзе.

Раман распавядае пра драмтэатр "Кіцеж" і яго акцёраў. У творы ўводзяцца шматлікія сюжэтныя лініі, якія, здаецца, не перасякаюцца, але паступова аўтар будуе адносіны паміж героямі, зводзячы і разводзячы іх шляхі-дарогі.

Тэатральныя перыпетыі выходзяць за межы падмосткаў на сапраўдную сцэну жыцця.

...Сучасны Мінск, сучасныя людзі, сучасныя праблемы... Малады акцёр Сяргей Пугач, амбіцыйны, незадаволены сабой, з'едлівы, блукае, не знаходзячы правільнай і яснай дарогі, скардзіцца на сучаснае жыццё, "асноўны прынцып якога — чалавек чалавеку воўк". Сяргей хоча "проста жыць" і "ставіць сабе планкі самыя высокія ды іх пераскокваць". Але, як кажа яго бацька, — вядомы мастак, "апусціўшы планку, лягчэй жыць" і заўважае: "можа, і ты не Міронаў?". Сяргей жа нікога не хоча слухаць, робіць усё насуперак, жадаючы быць самім па сабе, у той жа час жывучы за бацькавы грошы.

Паралельна Міхась Южык падае гісторыі іншых герояў рамана, паказваючы, як кожны з іх залежыць ад кагосьці і ў той жа час кіруе кімсьці сам. Праз жаночыя лёсы, мужчынскія ўчынкі нязменна прасочваецца гарачае і палкае, знішчальнае і ўсёспапяляльнае каханне. Яно кіруе, ім карыстаюцца, яно знікае і нараджаецца. А калі яшчэ дадаць сюды акцёрскія інтрыгі, падманы, атрымоўваецца сапраўды гарадскі раман.

Малады акцёр становіцца лялькай, марыянеткай. Ён не можа вызначыць галоўную мэту свайго жыцця і разрываецца пад цяжарам сваіх думак. Ён думае пра людзей з пагардай, але "насамрэч яму важна, надзвычай важна было пачуць іхнія апладысменты, убачыць слёзы, пакуты душэўныя. Ён іграў для іх. Ён іграў з імі".

Раман, магчыма, спадабаецца тым, хто цікавіцца лёсамі акцёраў, іх жыццём, хто сам сутыкаўся з тэатральным побытам. Сюжэт не складаны, плаўны і наводзіць на думкі пра тое, што вялікі тэатр жыцця не дае шанцу перайграць усё нанова, у ім няма рэпетыцый. Трэба своечасова гэта зразумець і не іграць, а жыць.

Кожны знойдзе нешта сваё ў "Марыянетках і лялькаводах" і, магчыма, прымерае на сябе вобраз або ўвішнага празорлівага лялькавода, або падатлівай бязвольнай марыянеткі. Хто мы ў жыцці: лялькі ці вызначальнікі свайго лёсу? Вось і падумаем пасля прачытання рамана.

Ганна КЕРЭЛЬ,
студэнтка БДПУ імя М. Танка





Валянцін ЛУКША

Прадчуванні Максіма Багдановіча.

Ялта. Май 1917-га

Я прадчуваю,
Што больш не дакрануся
Да ручнікоў прасёлачных дарог...
Валошкавае поле Белай Русі
Не залапоча рупна каля ног.

Я прадчуваю,
Што крымскай пекнатою
Не засланіць той сціплай пекнаты,
Што поўніць маё сэрца неспакоем,
Ізноў да сноў вяртае залатых.

Я прадчуваю,
Жывой вадой з крыніцы
Не выпадзе мне смагу наталяць...
Арлу над Ялтай сонечнай з арліцай,
Як вечнасць, па-над безданню крыляць.

Я прадчуваю,
Што матчынай гаворкі
Мне не паўторыць вецер-дабрадзей...
І мрояцца спакойныя узгоркі...
І дыхаць з кожным днём усё цяжэй...

Я прадчуваю,
Што песняю вярнуся...
Інакш зрабіць ужо ніяк не мог...

Валошкавае поле Белай Русі
Шапоча несціхана каля ног...

Полацкія лёхі

Я шмат гадоў у Полацку пражыў.
І шмат павандраваў па розных землях,
Свядомасць, як пякучыя нажы,
Крамсалі думкі аб шляхах падземных.
Казалі, ад Сафійкі пад Дзвіной,
Падземны ход вёў на Іванаў востраў,
Пад Спаса-Еўфрасіннеўскай царквой
Працерабілі лёхі шлях няпросты.

Ад Бельчыцкай царквы таемны ход
Ручвом каменным вёў на Верхні замак.
Стагоддзі лёхам не прынеслі звод —
Мой горад ахапілі паясамі.

Малым пад Мікалаеўскі сабор
Я лазіў без бацькоўскага дазволу,
Каб ход знайсці...
Ды цемра, як дакор,
Мяне спыняла у скляпенні голым.

Адзін смяльчак шукаў вялізны скарб,
Адшукваў, сквапны, даўнія святыні...
Ды з лёхаў не прыйшлі на волю, каб
Сказаць, што у мурах глыбокіх гіне.

Бо лёхі ўсе легендамі былі.
Адна з іх захавала сутнасць строга
Што недзе дзіва-горад ускрыліў...

Вунь,
За Дзвіной,
У Нафтаград дарога!

Месяцовая вясёлка

Сплывала сонца надвячоркам золкім
За лютаўскі настылы гарызонт...
Гало, —
Ці месяцовая вясёлка, —
Свой разгарнула каляровы фронт.

Яна стаяла строма пры даліне,
Працяўшы неба полымнай стралой,
Струменілася стужкамі няспынна,
І зіхацела шчодра над зямлёй.

Здавалася: дачасна дол вяснее,
І прывіднае свята прыплыло, —
Сярод снягоў вясёлка палымнее
І дорыць людзям дзіўнае святло.

Яно імчыць гулліва і залеўна,
Нібы прыродай здзейснены парад.
Адны казалі:
— Да бяды, напэўна.
Другія:
— Гэта, пэўна, да дабра.
Ноч надышла, і неба пачарнела,
Як антрацыт шпачынага крыла...

Ў вачах вясёлка доўга палымнела,
У памяці разбуджанай жыла.

З сядлом Пегаса паяднаны...

З сядлом Пегаса паяднаны вершнік,
Зачараваны цокатам падкоў,
Я па начах упарта "думаў вершы", —
Так гаварыў калісьці Пісьмянкоў.

І згадваліся незямныя краскі,
Мой лёс —
За паваротам — паварот,
І да світання прывідныя казкі
Вуркоча спорна разаспаны кот.

У свет я выйду стомлены і чысты,
Удзячны Богу,
Сонцу
І вясне.
Шпакі, як піянерскія гарністы,
Сігнал прыветны адрасуюць мне,

І грудзі разрываюцца ад шчасця,
І, нібы птаху, хочацца спяваць,
І да паднеб'я з песняю узняцца,
І людзям бескарыслівa аддаць.

Наваселле

Дэмакратычна — без чаргі уліку —
(Які б такое мэр дазволіць змог!),
На наваселле я шпакоў паклікаў,
У змайстраваны з вечара дамок.

Як шчабяталі мне удзячна птушкі,
Якія песні падарылі мне!
Цяпер ім дзетак галасістых гушкаць,
І радавацца гаманкой вясне.

Няхай яны у клопатах шчыруюць,
Душу на наваселлі адвядуць,
І радасць непадробную жывую
Суседзям па-зямляцку аддадуць.

Беслан

Румяніўся першаасенні ранак,
Рупліва сны салодкія дагушкваў,
А школу гаманлівую Беслана
Бярэ забойца-душагуб на мушку.

Заложнікі — малыя і старыя —
Ў спартзале.
І дарослыя, і дзеці...
І гневам скаланулася Расія.
І рэха гневу паплыло па свеце.

Вось так тры дні без сну, вады і ежы
Пакутнікі сядзяць на хіжых мінах...
І думалася:
На зямным бязмежжы
Рыхтуецца таемна дамавіна.

І першакласнік ператрос скарбонку
Танюткімі дрыжачымі рукамі,
І жменьку прыгарнуў манетак звонкіх:
— Вось выкуп...
Толькі вызваліце маму...
Ды нелюдзь — толькі нелюдзь.
Ён без сэрца.
Слязу і плач не бачыць і не чуе,
У кампаніі заўсёднай з чорнай смерцю...
Такое Бог ніколі не даруе.

Грааль

І я адкрыў у рэшце рэшт Грааль,
Які
Вякі
Шукалі тампліеры.
Той ордэн крыжакоў за даллю даль
Скараў, каб тайну мець Хрыстовай веры.

Але Грааль —
Не кубак тых часоў,
Калі Хрыстос віном адорваў вучняў,
Не кубак, у які сабралі кроў
Збавіцеля пасля цвікоў пякучых.

Грааль —
Не частка дзіды агнявой,
Той, што ваяр варожае кагорты
Удар наносіў на Галгофе свой —
Упэўніцца; жывы Хрыстос, ці мёртвы.

Грааль —
Не срэбны дзіватворны меч
Славутага цара — цара Давіда,
Што праведнага цудам насамрэч
Адорыць, Юду — адхіне з агідай.

Грааль —
Не блюда неслі на якім
Ірадыядзе голаў Іаана, —
Жыве Хрысціцель з намі праз вякі,
І забыццём забойца пакараны.

Грааль —
У сэрцы верніка жыве,
Як самае каштоўнае на свеце...
Сцяжыне да сабора не травець,
Пакуль над намі сонца веры свеціць...

Свой несці крыж

Свой несці крыж —
Святы нябесны груз —
Бог давярае кожнаму на свеце,
Каб лёс у дробнаспраўі не загруз,
Памкненняў добрых не пасохла вецце.

Малітвай прывітайце існы дзень,
І лепшыя знітуйце з ім турботы,
І вас не апаганіць чорны цень
Сляпога крывадушша і ляноты.

Прагнаўшы роўна-роўна баразну,
Вярніце глебе лепшае насенне,
Люляйце сваю новую вясну,
І новыя люляйце летуценні.

І вас не абміне шчаслівы плён,
Не знікнуць з ветрам прывідным надзеі,
Бо новы гарызонт ужо відзён,
І спадзяванні чыстыя квітнеюць.

Малітвай дзень вянчайце кожны свой.
Сон будзе ваш,
Нібыта сон дзіцяці,
І лёгка над бязгрэшнай галавой
Крыляць анёлам па аціхлай хаце.

Фота Кастуся Дробава



Павел ГАСПАДЫНІЧ

«Крылы слоў»

1.

Абгарэлыя крылы сноў.
Час, абкрадзены бледнай жудой,
Шпацыруе ад сэрца да сэрца:
Нікуда ад бяды не падзецца.

Дагарае надзея, як прысак,
Дзень схаваны між косак і рысак.
І хоць сонца праменіць наўкол,
Чорнай зяпаю шчэрыцца дол.

Тут знаёмыя паркі, сады,
Заблукалі між дрэваў сляды.
Груганнё, сонца, вецер паўсюль,
Гэты свет — абалонка ад куль.

2.

Гэты свет — раз'юшаны звер,
Голы, горды, галодны, сляпы.
Недагледзеў калісьці Гамер,
Што ў нябёсах жывуць не багі.

Хітрым змеем — дарога у храм,
Мармуровых стагоддзяў цяжар...
Сумным позіркам стрэне Адам:
Шмат стагоддзяў палае пажар.

Шмат стагоддзяў — Нябёсы й Зямля,
А між імі — бясконца вайна.
Як, душа, ты тут выжыць змагла?
Дзе ж цяпер прарадзіма твая?

3.

Над белай ракою туман
Будуе дзівосны вігвам.
З малочнай расы,
З духмянай травы
Будуе дзівосны вігвам.

Нарадзіцца ў гэты час —
Мусіць злодзей альбо Спас!

4.

Душа — поле бою: кроў, страляніна...
А недзе цвіце-раскашуе каліна.
...Скразняк,
цішыня ды кілішак атруты —
Салодкі ды звабны частунак Гертруды.

Наўзбоч касякамі імчаць цягнікі,
Гукаю да Спаса: "Прыйдзі і знайдзі!!"
Ізноў цішынёй набрынялыя вусны
Імкнуцца пазбегнуць слоўнай спакусы.

У гэтым Сусвеце адзіны мне вырак —
Ляцець назаўжды у бязлітасны вырай.
Над безданню шэрай зноў буду крыляць я,
Шукаць паратунку
ад вечных праклянцяў.

5.

Колькі важыць боль душы?
Колькі несці крыж стары,
Паміж пустак і балотаў,
Паміж безданню самоты?..

...У краіну светлых мараў
Адляталі зноў Ікары.
А у цішыні бязмоўнай
Памірaў паэт бяскроўны...

Памірaў радок адзіны
Пра мяне, цябе, Радзіму!
Беззваротна шлях абраны
У краіну абабраных!

І пытанне дзікім птахам
Разбівала сэрца страхам.
Паміж шэрасцю і цемрай
Боль смяяўся новай верай.

А на Поўначы, дзе сівер
Цалаваў аблокам грывы,
Твой цягнік крануўся з месца —
І заныла зноўку сэрца...

6.

Гэты радок напісаны табе...
І няхай у самоце, жудзе ці журбе,
Ці калі расквітнее духмяны язмін —
Горкім не станецца верша палын.

Кубінская Алеся

Іван ПЯШКО

Апавяданне

Той год запомніўся мне моцнай ліпеньскай спёкай. Гарычыня, духмень не спадалі нават уначы, млявасць вісела ў паветры, вільготнае ад поту адзенне прыліпала да цела; тэмпература паветра пастаянна трымалася каля трыццаці і болей градусаў. Тым спякотным летам я разам з дачкой апынуўся ў Маскве, дзе спёка аказалася яшчэ больш невыноснай.

Паехалі паступаць у інстытут. Дачка пасля заканчэння сярэдняй школы ў дзевяностым годзе здавала ўступныя экзамены ва універсітэт у Мінску. Не хапіла аднаго бала, вярнулася дамоў, і назаўтра пайшла ў аддзел кадраў завода, які выпускаў электратэхнічную прадукцыю — правады, кабелі. Год працоўнага стажу на заводзе даў магчымасць атрымаць накіраванне на вучобу ў інстытут электратэхнічнага профілю. Такіх навучальных устаноў у даведніку мы адшукалі тры — у Харкаве, Ленінградзе і ў Маскве. Выбралі апошні горад — там жыў і працаваў брат жонкі.

Прыехалі ў Маскву, знайшлі інстытут, аднак у прыёмнай камісіі сказалі, што нашых дакументаў не атрымлівалі. А заўтра першы экзамен. У паштовым аддзяленні параілі звярнуцца ў дзевяты сартыравальны пункт, што на Сакалінай Гары. Але і там нас не парадавалі, сказалі — лепш за ўсё пачаць пошукі з таго месца, адкуль адпраўлялі дакументы. Засталося адно — вяртацца дадому.

Спачатку вырашалі, што я застануся ў Маскве, дачакаюся, калі прыйдуць дакументы, таму я ўзяў адзін білет — для дачкі. Паразважаўшы, прыйшлі да высновы, што невядома колькі часу прыйдзецца чакаць. І таму я ўзяў другі білет — для сябе, на той жа цягнік. Зразумела, білеты былі ў розныя вагоны — мой у трэці, даччын — у дзесяты.

Прыехалі на вакзал за паўтадзіны да адпраўлення, адшукалі месца для дачкі, потым пайшлі ў трэці вагон, паклалі рэчы і выйшлі на перон — у вагоне духмень была больш невыноснай, чым на вуліцы. Шчыльным патокам ад вакзала ішлі пасажыры. Праваднікі, зірнуўшы на праязныя дакументы, прапускалі людзей, чэргі змяншаліся, радзелі, ля некаторых вагонаў іх не было зусім. Побач з лязгатам праехаў трактар, цягнучы за сабой некалькі прычэпаў з грудамі пасылак і скрыняў.

Настрой быў неважнецкі, мары пра інстытут зніклі. Дзе дакументы? Ці ўдасца іх адшукаць? Не хацелася гаварыць, мы моўчкі стаялі, назіралі за мітуснёй, за пасадкай, зрэдку паглядвалі на гадзіннік. Усё меней часу заставалася да адпраўлення. Нарэшце рушылі ў душны вагон. Вокны пасажыры адчынілі адразу ж, але гэта прахалоды не прынесла.

Адшукалі сваё купэ і месца. Я звярнуў увагу на дзвюх дзяўчынак гадоў дванаццаці, якія ўзлезлі на верхнюю паліцу і аб чымсьці горача спрачаліся. Аб чым ішла размова, зразумець было немагчыма, гаворка ішла на чужой мове, мне падалося — на іспанскай. Звярнуў увагу і на жанчыну, хутчэй за ўсё — іх маці. Жанчына падалася мне знаёмай, нібыта недзе раней яе сустракаў, нешта знаёмае было як у постаці, так і ў твары. Зразумела, жанчына з тае пары змянілася, зрабілася больш саліднай, але галоўнае — блакітныя вочы, шырокія скулы, невялікі рот — усё было, як і ў той дзяўчынкі, якая ў сваім шарсцяным світэры, які ладна аблягаў яе гнуткую спартыўную фігуру, прыходзіла ў суботу ў клуб тэхнічнага вучылішча № 7 па вуліцы Леніна, 28, у Гродна на танцы.

Я сядзеў на ніжняй паліцы свайго купэ, глядзеў на жанчыну, якая ў задуменні ўтаропілася ў акно, чакаў, калі закончыць сузіранне, зверне ўвагу на спадарожнікаў па купэ. Магчыма, тады і яна ўспомніць далёкі пяцьдзесят дзевяты год.

Яна павярнулася, безуважна кінула кароткі позірк на насельнікаў купэ, але мой твар ёй нічога не нагадаў.

...Пасля няўдалага паступлення ў медыцынскае вучылішча я падаў дакументы ў тэхнічнае вучылішча № 7 на аддзяленне электраманцёраў. У вучылішчы навучэнцам давалі і больш прэстыжныя прафесіі — электрамеханікаў і аўтамеханікаў, вучоба там працягвалася два гады, на электраманцераў — толькі дзесяць месяцаў. Але на престыжныя прафесіі патрэбна накіраванне, я яго не меў, ды хто мне, зялёнаму выпускніку сельскай школы, мог яго даць?

Вучыўся я ў адзінаццатай групе, жыў у інтэрнаце, вечарамі ў вольны час у адной з аўдыторый з сябрамі глядзеў тэлевізар. Асабліву цікавасць выклікалі турніры па хакеі. У інтэрнацкім пакоі нас было чацвёра: высокі хударлявы Сабалеўскі з Карэлічаў, які ўвесь вольны час аддаваў боксу — на той час гродзенская школа боксу была адна з лепшых у рэспубліцы, невысокі ладна скроены смяшлівы Сягоднік з малой Бераставіцы, хударлявы Мардвінцаў з вёскі Скерсі ля Жалудка і я. Менавіта Сягоднік аднойчы ўвечары зацягнуў мяне на танцы. Танцаваць я не ўмеў, Сягоднік разлічваў на мае веды падчас правядзення віктарын.

Частцы навучэнцаў, бацькі якіх загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны тады выдавалі форму: выхадныя суконныя чорнага колеру штаны і гімнасцёрку, фуражку з бліскучым касцяным брылём, рамяні з літарамі "ТР" — "Трудовые резервы", чорны шынель, а таксама рабочае "хэбэ" шэрага колеру. З нашага пакоя ў форменным аддзенні хадзілі Сягоднік, Сабалеўскі і я.

У перапынках паміж танцамі культасветарганізатары наладжвалі віктарыны, конкурсы. Карысталася таксама папулярнасцю гульня ў пошту. Удзельнікі яе атрымлівалі нумаркі на паперках, прышпільвалі іх да грудзей і тым, хто падабаўся, пісалі запіскі, апускалі ў скрыню, чакалі на іх адказы. Я таксама атрымаў нумарок. Трымаючы яго, пачаў выбіраць — каму ж напісаць?

Я назаўсёды запомніў той нумарок — 114, прышпілены да белай кофтачкі юнай прыгажуні. Канечне, не нумар спадабаўся мне, а невысокая, з белым тварам і кароткай прычоскай дзяўчынка з блакітнымі вачыма, з павольнаасцярожнай хадой. У першай цыдулцы да сваёй абранніцы я спытаўся, як яе завуць. Яна адказала, што Люда, у сваю чаргу цікавілася і маім іменем. Завязалася перапіска, мы пісалі пра нашы захапленні, уражанні ад кінафільмаў, што паказвалі ў гарадскіх кінатэатрах. Яна працавала у швейным атэлье, любіла паэзію. Людміле пісаў не толькі я, заўважылі някідкую прыгажосць іншыя "фабзайцы". Галоўным сапернікам, бадай, быў навучэнец групы электрамеханікаў, які жыў у горадзе, хадзіў у модных тады вузкіх штоніках, вастраносых туфлях і ў шырокім клятчатым пінжаку. Ён часта танцаваў з Людай, калі-нікалі пасля танцаў праводзіў дзяўчыну дамоў. Я ж танцаваць не ўмеў. Зразумела, цягацца з модным гарадскім кавалерам, які быў старэйшы за мяне на чатыры гады, я не мог, аднак стараўся не прапускаць танцаў, пісаў лісты, атрымліваў адказы, і толькі запрасіць на танец і пагаварыць з Людай я так і не змог.

Нечакана пачаўся рамонт клуба. Электраманцёры вучыліся толькі шэсць месяцаў, на астатнія чатыры раз'ехаліся па аб'ектах на практыку ў раёны, дзе пачыналася электрыфікацыя калгасаў і саўгасаў.

Не трэба было мець багатага жыццёвага вопыту, каб здагадацца — дзве дзяўчынкі-падлеткі, сёстры-двайняткі — гэта дочкі Люды. Адна дзяўчынка — бялявая, яўна славянскага тыпу, другая — з шырокімі скуламі, цёмнатварая, па ўсёй верагоднасці, метыска, увабрала рысы твару бацькі. Быццам дзве лані, яны валтузіліся на вузкай вагоннай паліцы, аб нечым горача спрачаліся, нешта адбіралі адна ў адной, ніяк не маглі супакоіцца.

Нарэшце цягнік крануўся, за акном праплылі гарадскія кварталы, іх паступова змянілі дачныя пасёлкі, потым пайшлі палі, пералескі, прыдарожныя палосы.

Адвярнуўшыся ад акна, безуважна, аб чымсьці тужлівым думала жанчына. Цягнік набраў вялікую хуткасць, вагон моцна пакалыхвала. Мінаючы невялікія станцыі, цягнік нёсся наперад, аднак па-ранейшаму было задушна. У вагон урывалася гарачае паветра, якое не несла прахалоды, а яшчэ больш наганяла гарачыню.

Дзяўчынкі, саскочыўшы на падлогу, пабеглі ў канец вагона, хутка вярнуліся, несучы ў ярка афарбаванай бляшанцы з-пад кока-колы ваду. Хутка выпілі, павалтузіўшыся, пайшлі зноў.

— Двайняткі? — з цікавасцю спытаў я.

Люда згодна кіўнула галавой.

— І як назвалі?

— Алеся і Сільвія.

— Алеся падобная на вас?

— Не, на бацьку.

— А бацька чаму не з вамі?

— На рабоце. Мы з Кубы едзем. Да бабулі. У Гродна. Пяць гадоў не былі на радзіме.

— Вас Люда завуць?

— Людай, — здзівілася жанчына. — Адкуль вам гэта вядома?

— У пяцьдзесят дзевятым годзе вы хадзілі на танцы ў сёмае тэхнічнае вучылішча Гродна.

— Хадзіла, — пасля невялікай паўзы прамовіла жанчына.

— Вось і я хадзіў. Памятаеце лятучую пошту? У вас быў нумар сто чатырнаццаты.

— Пошту памятаю, нумар — не.

— І мяне не памятаеце?

— Даруйце, не. Гэта ж так даўно было... Дзіўна, што вы гэта ўсё помніце.

У спякоту я заўжды стараўся меней піць вадкасці. Гэтая звычка ў мяне ад паездак у студэнцкім будатрадзе на цаліну. Аднак спёка ў вагоне не спадала, і таму пасля паўзы ў размове з жанчынай я пайшоў у канец вагона, дзе быў бачок з пітной вадой. Прайшоў некалькі метраў і жахнуўся, бо ніколі такога бруду ў транспарце бачыць не даводзілася. Падлога была не падмецена, у паперках і шалупінні ад семачак, вады ні ў бачку ні ў туалеце не было. Праваднікі быццам пакінулі вагоны. Я вярнуўся ў купэ. Па-ранейшаму даймала гарачыня, не было чым дыхаць, насоўку я не выпускаў з рук, выціраў ад поту твар, рукі.

Сільвія пра нешта спрачалася з маці, шыракаскулая Алеся пасміхалася з сястры. Ад крыўды Сільвія кулачком прыкрыла вочы, і я зразумеў — мусіць, на Кубе дзеці такім чынам стрымліваюць слезы крыўды.

— Чаго яна хоча? — спытаў я ў Люды.

— Ат, шмат чаго яна хоча, — незадаволена адказала жанчына.

— Мусіць, піць захацела, — здагадаўся я.

— А дзе ж тае вады ўзяць?

У нашым партфелі ляжалі дзве бутэлькі фанты. Я купіў іх на ўсялякі выпадак у кіёску на пероне вакзала. Пакет з ежай нам уціснула ў той партфель Ала, сваячка, калі мы ад'язджалі.

Я дастаў бутэльку, адкаркаваў і падаў Алесі. Дзяўчынка з прагнасцю пачала піць. Рэшткі прапанавала сястры, а калі тая адмовілася, яна паставіла пітво на столік. Не чапалі ваду да часу, калі прыйшла пара абедаць.

Люда дастала з сумкі некалькі памідораў, тры агуркі, парэзала на скібкі хлеб. Я здзівіўся сціплай ежы спадарожнікаў. Чамусьці ўспомнілася блакада Кубы, складаныя ўмовы жыцця кубінцаў. Я дастаў з партфеля маскоўскі пакет, у якім аказаўся ладны кавалак вяндліны, гародніна. Парэзаў прадукты, прапанаваў сваім спадарожніцам. Людміла падзякавала, дзяўчынкі ўзялі па некалькі скрылёчкаў мясных прадуктаў, з апетытам падсілкаваліся.

Я дастаў з партфеля яшчэ адну бутэльку фанты, наліў у кубачак з-пад кока-колы.

— Замест чаю, — прапанаваў я.

Дакументы знайшліся пасля прыезду дамоў на трэці дзень. На чацвёрты дзень я зноў быў у Маскве.

Яшчэ праз тры дні дакументы завезлі ў Гродзенскі універсітэт. Але дачка і на гэты раз не паступіла, зноў не хапіла аднаго бала. Калі даведалася пра няўдачу, доўга стаяла нерухома, слёз яе я не бачыў, вочы закрыла кулачкамі, як гэта рабіла ў вагоне Сільвія з далёкага вострава Свабоды.

Мініяцюры

Аляксей ФІЛАТАЎ

Вярнуліся

Вераснёўскай раніцай сустракаюць мяне ў садку... шпакі. Сёлета — ладная плойма, як ніколі раней ва ўсіх кублах напладзіліся, пасяліліся. Не дзяруць горла, як па вясне, не лезуць пішчом да бацькоўскае дзюбы. Задуменна, нудліва развітваюцца з родным кутком. Вярнуліся, Бог ведае адкуль, можа, каб і са мною развітацца? Бо хто ж ім дамкі на дрэвах прыладкаваў?

Чулая душа

На лаўцы ля тралейбуснага прыпынку з Купрэевым адпачываем. Ён прапускае рэйс за рэйсам: цяжка дыхаецца, глуха кашляецца, ногі адмаўляюцца служыць. Нарэшце прыводжу чалавека да вакзала. Крыж святы, надакучыў з тым "святым", выклятым заняткам, які і мяне трымае ва ўчэпістым, цяжкім палоне. Ды сумна нешта, цяжка на сэрцы, асабліва калі зірнеш у ягоныя, бы ў ягняці, вялікія блакітныя вочы. Нават сарвалася з вуснаў:

Мой друг дзяцінства, любы вяз,
Ўжо час развітвацца з табою.
І ты прабач, што я пайшоў,
Прабач, што ты не змог
пайсці са мною...

— Та-а-а-к-с-с-с, — прымружыў вочы, абцёр бараду, задраў галаву ў неба, два разы хітнуў галавой. Прыкурыў, выпусціў дым і, разглядаючы пракураныя дарэшты пальцы, нібы мімаходзь пытае:

— Тваё?

— Не. — І называю аўтара.

— Ну, што ж, з часам і ён нешта народзіць, і ён мае шчырую душу...Усё! На наступны сядаем. Да прыгараднага неяк дапнёмся. Ну, а там, як мінулы раз, у вагон занясеш...

Не раз я вас, хлопцы, Міхась і Мікола, і вадзіў, і насіў, а сёння сам "класікам" станаўлюся: на абедзве нагі пачынаю кульгаць...

Заплач

Узнёсла-чыстае, крывава-праведнае, што сказаў вершам Купрэеў, услед Купрыну падмацаваў прозай: калі пасля мяне заплача хоць адна жанчына на Зямлі, я вярнуся да яе. Хацеў упэўніцца ў дасканаласці выслоўя, гартаў, перагортваў "Палескую элегію", ніяк не мог знайсці. Выходзіў з сябе, бурчэў, сварыўся. "Эт, — няўцям падумалася, — наведаецца, спытаю!.." Агаломшаны, ачомаўся: не, не наведаецца, няма ні Купрына, ні Купрэева. Не вып'ю я з імі не ў Перабродах, ні на Гары...

— Заплач! — узмаліліся вусны.

— Заплач! — ускрыкнула душа да Цябе.

Можа, ўжо і сустрэліся ў Сусвеце жывыя душы Алесі, Аксаны, і Аляксандра Іванавіча і Мікалая Сямёнавіча? А нашы пакуль жывуць пад трапяткімі сэрцамі. Але ты заплач, заплач пасля мяне на зямлі! Я буду доўга чакаць!

Маці

Чамусьці так, як сёння, яшчэ ніколі не ўсміхалася мая родная мама Феня з партрэта, які перад сваім сконам пераслаў мне з Ніжняга Ноўгарада ў Маларыту старэйшы брат Яўген. І хоць мама спачывае пад правым крылом Маларыцкае старое школы, а брат — на Бугроўскіх могілках Ніжняга, мне падумалася, што мама папярэджвала, прасіла: не нервуйся, супакойся, не спяшайся, мой меньшанькі. Мне з Жэнем і тут стала крышку лягчэй, але ты затрымайся, пажыві й за нас крыху там.

Скалечаны вайной
Правулкам, сцішаны,
ступаю.
На вокны школы пазіраю,
Нібы матулінага
позірку чакаю...
Сціскаецца,
на часткі сэрца рвецца:
Вось з гэтага
апошняга вакна
Глядзіць яна, здаецца...

Мая мама загінула на світанні 22 чэрвеня 1941 года на ганку Маларыцкай школы, куды патрапіў фашысцкі снарад...

Арт-пацеркі

Пра бліжэйшую будучыню Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" расказаў яе генеральны дырэктар Уладзімір Замяталін падчас летняй сустрэчы з журналістамі. Да 1 снежня плануецца выпусціць 10 стужак розных жанраў. Сярод іх меладрама "Пакуль мы жывыя", фільм для дзяцей "Навагоднія прыгоды ў ліпені", баявік "Крапавыя берэты", мультфільм "Аповесць мінулых гадоў". А ў вытворчасці знаходзіцца 7 карцін з 15-і, выхад якіх запланаваны на 2009 год. Як вядома, на "Беларусьфільме" ідзе маштабная рэканструкцыя, і яна мусіць завяршыцца да 1 верасня наступнага года.

Выхад гэтага выдання быў прымеркаваны да навуковай канферэнцыі, што адбылася ў межах сёлетняга свята "Мірскі замак-2008". Пад агульнай назвай "Музычная культура Беларусі: гісторыя і сучаснасць" сабраныя матэрыялы 16-і вядомых даследчыкаў і маладых навукоўцаў, якія разглядаюць праблемы гісторыі, сучаснага развіцця і стану беларускага музычнага мастацтва ў

самых розных аспектах, з пункта гледжання захавання, вывучэння і папулярызацыі творчай спадчыны, тэорыі, педагогікі, выканальніцтва. Выпуск гэтага зборніка (укладальнік — доктар мастацтвазнаўства прафесар Вольга Дадзіёмава), як і правядзенне канферэнцыі, падкрэслівае прыярытэт музычнага кірунку ў фарміраванні мастацкага зместу тых фестываляў, што ладзяцца ў малых гарадах і мястэчках па ініцыятыве Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі. Выданне ажыццёўлена пад грыфам Міністэрства культуры і Нацыянальнага аркестра эстраднай і сімфанічнай музыкі Рэспублікі Беларусь (так яшчэ называюць заслужаны калектыў пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга).

На II Міжнародным конкурсе "Манетнае сузор'е-2008" памятныя манеты, якія выпускае Нацыянальны банк Беларусі, атрымалі шэраг узнагарод. Так, напрыклад, манета "Крыж Еўфрасінні Полацкай" перамагла ў намінацыі "Манета года" і заняла другое месца ў намінацыі "Арыгінальныя тэхналогіі". У намінацыі "Срэбная манета года" лепшай прызналі "Легенду пра бусла", другое месца ў намінацыі "Удалае вырашэнне" заняла "Масленіца", а "Беларускі балет-2007" — другое месца ў намінацыі "Залатая манета года". Апроч беларускага, сваборнікамі ў гэтым конкурсе былі нацыянальныя банкі ды манетныя дворы такіх краін, як Арменія, Балгарыя, Данія, Іспанія, Кыргызстан, Латвія, Літва. Расія, Фінляндыя... А тым часам Нацыянальны банк Беларусі ўвёў у абарачэнне адмысловую навінку з серыі "Сямейныя традыцыі славян" — срэбную (намінал 20 рублёў, тыраж 25 тыс. штук) і мядзяна-нікелевую (намінал 1 рубель, тыраж 5 тыс. штук) манеты "Наваселле". Двухбаковая выява адлюстроўвае сімвалы беларускага дабрабыту — коціка ды акенца з карункавымі ліштвамі. Магчыма, гэта прэтэндэнт на перамогі ў будучых конкурсах?

С. ВЕТКА

Не сцеражыся аўтамабіля

Прачытала не так даўно ў адной рэцэнзіі пра вечную памылку ўчарашніх студэнтаў тэатральных ВНУ: цягнуць яны за сабой на прафесійную сцэну ўвесь напрацаваны ў гады вучобы матэрыял, а эмоцыі страчваюцца. Прачытала і задумалася: а ці заўсёды гэта памылка, ці заўсёды страта?

Летам на эксперыментальную сцэну Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача ўпэўнена "выехаў" монаспектакль "Сіні аўтамабіль" паводле п'есы ўкраінскага драматурга Яраслава Стэльмаха. Між іншым, таксама студэнцкая работа. Два гады таму яе з поспехам прадстаўлялі гледачам тады яшчэ студэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Аляксандр Гладкі і тады яшчэ рэжысёр-выкладчык, акцёр Купалаўскага тэатра Раман Падаляка. Сёння малады, перспектыўны, узнагароджаны "Крыштальнай кветкай" акцёр ТЮГа Аляксандр Гладкі вярнуўся да "Сіняга аўтамабіля" разам з рэжысёрам Наталляй Башавай.

Змест п'есы — гэта своеасаблівая споведзь пісьменніка А., пошук кампрамісу паміж рэальным і літаратурным жыццём, пошук сэнсу жыцця, пошук шчасця. Стэльмах напісаў яе ў 80-я гады мінулага стагоддзя, але сучаснасці драматургічны матэрыял ад гэтага не губляе. Наталля Башава думае, што п'еса акурат пра сучаснае пакаленне так званых "трыццацігадовых", пра іх праблемы. Але глядач бачыць крыху скарочаны варыянт першакрыніцы: са спрошчаным сямейным канфліктам і літаратурнымі пошукамі героя.

Адно з моцных уражанняў ад спектакля — сцэнаграфія. Дарэчы, перад прэм'ерай у Мінску "Сіні аўтамабіль" пабываў на кіеўскім фестывалі "Падзея", дзе атрымаў прыз за лепшую сцэнаграфію (сцэнічнае вырашэнне — Н. Башава). Сцэнічная прастора — зусім маленькая трохкутная пляцоўка з ухілам. І гэты ўхіл — сімвал нашага жыцця, якое некуды коціцца, а ты павінен утрымацца. У падлозе і ў століе — люкі з лесвіцамі. У ніжні пісьменніку А. не трэба, а ў верхні — не патрапіць. Вось і ўсё. Але акцёру А. Гладкаму прасторы для руху хапае, ён так выдатна асвойвае і лесвіцы, і люкі, і ўхіл, што дзеянне выглядае вельмі дынамічным.

Але галоўнае ў монаспектаклі, канечне, — акцёрская праца. У прадмове Леаніда Зорына да публікацыі п'есы ў часопісе "Советская драматургия" ёсць фраза пра тое, што для гэтага маналога патрэбны не толькі адораны акцёр, патрэбна яшчэ і роднасная натура. Гэта адначасова і пра Аляксандра Гладкага, і не пра яго. Умоўна спектакль можна падзяліць на два жыцці А.: асабістае і літаратурнае. І калі казаць пра асабістае жыццё, то тут Гладкі абсалютны родзіч Стэльмаху. Ты ні на хвіліну не сумняваешся ў яго перажываннях, а ён проста сядзіць на пустой нахіленай сцэне і расказвае. Так расказвае, што можна плакаць. А калі пачынаецца жыццё літаратурнае, прыдумка героем спектакля сюжэта для кнігі, то тут сваяцтва натур адразу перарываецца. Гладкі становіцца проста адораным акцёрам, які чамусьці з трагікамедыі робіць проста камедыю. Зрываецца на дробязі (нават у рэквізіце, якога зашмат: цукеркі, жуйкі, запальнічка, крыжык, таблеткі, штопар, кавалачкі паперы, цыгарэты і г.д.). Дзіўна чаргуе станы цвярозасці і нецвярозасці. Усё гэта неяк рассяроджвае ўвагу. Гледачу проста смешна. А ў Стэльмаха — не ўсё так проста...

Увогуле, "Сіні аўтамабіль" — адметная з'ява на беларускай сцэне, таму што гэта яшчэ адзін крок да асваення айчынным тэатрам такой формы, як монаспектакль. Прычым крок досыць смелы, які пераконвае, што монаспектакль можа сыграць не толькі заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, які ўжо гадоў трыццаць працуе ў тэатры, але і малады акцёр. І адсутнасць жыццёвага досведу ён нічым не выкажа, і ўвагу гледачоў не страціць, і эмацыянальнасці яму хопіць. Так што не трэба сцерагчыся "Сіняга аўтамабіля", нехай сабе і са студэнцкім мінулым.

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ

Чараўнік гарадской прыгажосці

Мы заўсёды дзівімся на будынкі, створаныя таленавітымі рукамі архітэктараў. Вось і ў Гомелі прывабліве сваім сучасным выглядам Палац культуры будаўнікоў, узведзены паводле праекта архітэктара Міхаіла Ліпава.

Міхаіл Ліпаў нарадзіўся ў вёсцы Крупец Добрушскага раёна ў 1938 годзе ў шматдзетнай сялянскай сям'і. З маленства ў яго было неадольнае жаданне маляваць. Але набыць нават аловак у той час было даволі цяжка. З'яўляючыся вучнем другога класа, зрабіў самастойна драўляны макет сваёй школы, выявіўшы ўпершыню уласныя архітэктурныя здольнасці. Ляпіў з

гліны розныя домікі. Творча падтрымліваў вучня настаўнік маляванне і чарчэння.

Пасля заканчэння школы М. Ліпаў паступіў у Гомельскую школу будаўнікоў. Потым трапіў на вайсковую службу ў Польшчу, дзе яго саслужыўцам быў прафесійны мастак. Міхаіл браў у яго ўрокі малявання. А яшчэ ў вольны час рабіў макеты будынкаў і насычаў іх падворкавым рыштункам.

Пасля службы Ліпаў адгукнуўся на кліч камсамола і паехаў у Заходнюю Сібір, дзе скончыў мастацкае вучылішча. Пасля паехаў у Маскву да старэйшага брата, паступіў ва Усесаюзны інжынерна-будаўнічы інстытут, але вярнуўся ў Новакузнецк, дзе і закончыў праектны інстытут. Стварыў шэраг праектаў, паводле якіх у горадзе былі ўвасоблены пабудовы. Адпрацаваўшы 10 год у Новакузнецку і набыўшы практычную школу па будове ансамблевай архітэктуры, інтэр'еры, Міхаіл Ліпаў па запрашэнні землякоў прыехаў у Гомель. Адразу далучыўся да творчай працы над праектам Палаца культуры "Гомельпрамбуд" з культурным і спартыўным комплексам. Адначасова працаваў і над праектам Дома адпачынку "Залатыя пяскі", у комплекс якога ўваходзілі спартыўная зала і летняя танцавальная пляцоўка. Праектаваў архітэктар у Гомелі і памяшканні будаўнічых управленняў, кулінарны комплекс, інтэр'еры хімзавода. Таксама Міхаіл Ліпаў далучаўся да архітэктурных праектаў сталічнай будовы.

Падчас творчай працы ў архітэктара М. Ліпава выявіліся ўсебаковыя мастацкія здольнасці: ён асвоіў чаканку па метале, разьбу па дрэве. Падуладнае яму і мастацкае кавальства, якім Міхаіл аздабляў брамкі, агароджы.

Увогуле, на Гомельшчыне і не толькі, можна сустрэць шмат уласобленых праектаў архітэктара і мастака Міхаіла Ліпава. Дарэчы, ён з задавальненнем падтрымлівае маладых творцаў, перадае ім свой багаты прафесійны досвед.

Дзякуючы такім творцам, як Міхаіл Ліпаў, мы жывём у атачэнні прыгажосці, што нас захапляе і радуе.

Мікола МАКАРЦОЎ
г. Гомель

Слонімскія тэатралы — у захапленні

Галоўны рэжысёр Слонімскага драматычнага тэатра Васіль Сявец вырашыў здзівіць гледачоў французскай камедыяй паводле п'есы Рафі Шарта "Маю жонку завуць Марыс". І здаецца, гэта яму ўдалося.

Я не магу параўнаць новую пастаноўку, напрыклад, з рэжысурай Рамана Вікцюка, які пяць гадоў таму гэтаксама здзівіў маскоўскіх тэатралаў. Не магу параўнаць, бо вікцюкоўскі спектакль не глядзеў, але ведаю, што сказаў Раман Рыгоравіч з нагоды сваёй прэм'еры: "Ігравая стыхія, абсурд і рэальнасць, лірыка і каханне — у гэтай п'есе ўсё, як у кроплі вады, арганічна аб'яднанае". Словы яго шмат што кажуць пра п'есу і амаль нічога — пра спектакль. Яны пасуюць і слонімскай пастаноўцы. Праўда, рэжысёр спектакля "Маю жонку завуць Марыс" Васіль Сявец на абмеркаванні палічыў за лепшае не выказвацца, а паслухаць іншых, стараннія меркаванні.

Спектаклю ў Слоніме, на маю думку, хапае ўсяго. Інтрыгай гэты твор ні ў якім разе не вычэрпваецца.

Сюжэт закручаны тут з сапраўднай французскай пруткасцю, і спектакль завалодвае глядацкай увагай: тут і плачуць, і б'юцца, і смяюцца, і крычаць — адным словам, я даўно не назіраў на сцэне такой бурлівай акцёрскай энергіі. Вядома, сама драматургія вымагае адпаведнага відовішча. П'еса Рафі Шарта — гэта папулярная камедыя сітуацый, дзе герой з недарэчных абставін трапляе ў зусім дурныя. Яна з поспехам ідзе ў больш як 30 краінах пры пастаянных аншлагах.

... Спачатку на сцэне толькі Жорж і Марыён — муж і жонка, якіх абаяльна сыгралі артысты Уладзімір Навумік і Вікторыя Міхальчык. Яна — мільянерка і ўладальніца галерэі, дачка супербагацея, ён — не вельмі ўдалы гандляр нерухомасцю і ўмелы марнатравец жыцця. Марыён патрабуе ад Жоржа кахання "ў канкрэтных формах", але ён заўсёды спасылаецца на штодзённую занятасць. Яна хоча мець дзяцей, з гэтай нагоды ставіць мужу ультыматум — і знікае. А да Жоржа павінна прыйсці каханка Катрын (артыстка Наталля Шугай), але замест яе з'яўляецца Марыс (артыст Сяргей Фурса) — сябра дабрачынай арганізацыі "Братняя дапамога". І бярэцца дапамагаць... Вось тут і пачынаецца! Гэты самы прадстаўнік братняй дапамогі пагаджаецца сыграць ролю жонкі Жоржа, каб адпрэчыць каханку. Неўзабаве з'яўляецца і яна сама, пасля — яе муж Ражэ (артыст Віталь Спасюк), які хоча адпомсціць Жоржу. Урэшце Жорж ды Марыс пераапранаюцца ў жаночае адзенне, чым правакуюць... пажадлівасць Ражэ. А калі парыкі падаюць на падлогу, той шалее ад рэўнасці...

Гэты лёгкі фарс нясе гледачам і вясёлы настрой, і асалоду ад акцёрскай ігры, дасціпнай пастаноўкі. Яго прэм'ерай Слонімскі драматычны тэатр завяршыў свой чарговы сезон.

Сяргей ЧЫГРЫН
г. Слонім

Ёсць у мастацтве сталыя таленавітыя працаўнікі, пра якіх амаль не піша сённяшняя прэса і чые імёны малавядомыя шырокаму колу аматараў выяўленчай творчасці. Адзін з іх — Анатоль Рыбчынскі. Сёлета яму споўнілася 70, і з гэтай нагоды ў сталічным Палацы мастацтва прайшла персанальная выстава мастака. Ён грунтоўна прадумаў, што паказаць сябрам, калегам, усім наведнікам, і гэта заўважылі прысутныя на вернісажы.

Прыпыніцца, каб убачыць харство



Абвясціў адкрыццё выставы гукамі старажытнай сурмы заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Уладзімір Пузыня. Намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Сяржук Цімохаў зазначыў, што ўпершыню ўбачыў мноства своеасаблівых твораў А. Рыбчынскага, які, адразу відаць, шмат падарожнічаў, і калі паглядзець усю выставу, дык можна прасачыць фарміраванне асобы мастака. Добрыя словы пра юбіляра сказаў Эдуард Агуновіч, прыгадаўшы заслугі свайго калегі падчас яго 10-гадовай працы галоўным мастаком на Мінскім мастацка-вытворчым камбінаце, зазначыўшы, што з Рыбчынскім можна ісці ў разведку — а сёння такія словы не часта, не пра кожнага пачуеш... Ён падтрымліваў маладых мастакоў, курыраваў афармленне сталічных гасцініц "Турыст", "Юбілейная", "Планета", санаторыя "Беларусь" у Місхоры, нават Палаца мастацтва, дзе разгарнулася яго выстаўка і г. д. Пры ўдзеле А. Рыбчынскага пачыналася мастацка-творчае кіраванне праектамі будаўніцтва Мінскага метрапалітэна... Яго праца ў свой час атрымала афіцыйнае прызнанне, што пацвярджаюць шматлікія ўзнагароды. А пра творчую рознабаковасць, густ і прафесіяналізм Анатоля Рыбчынскага сведчаць графічныя і жывапісныя работы мастака.

Мінскае мастацкае вучылішча ён скончыў "на выдатна". З цеплынёй успамінае свайго педагога Надзею Галоўчанку, ад якой перадалася любоў да жывапісу. У Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце (цяпер акадэмія мастацтваў) Арлен Кашкурэвіч абудзіў у Анатолю любоў да малюнка, графікі; Аляксандра Паслядовіч адкрыла для студэнта цудоўныя магчымасці акварэлі. Менавіта з акварэлі яшчэ падчас вучобы ў інстытуце пачаўся ўдзел А. Рыбчынскага ў мастацкіх выставах. Яго работа "Апошні аўтобус" выявіла ўдумлівага мастака, які гэтак тонка прыкмеціў і псіхалагічна ўвасобіў стан адзінокай постаці ўначы — у чаканні апошняга аўтобуса. Усё ў гэтым чаканні: трывога і надзея...

А потым пайшлі акварэлі на тэму нашай вёскі, якія прывозіў з пленэраў Анатоль Ігнатавіч, і любоў да беларускай прыроды адчувальная і ў яго сённяшняй творчасці. Лепш за самога мастака і не скажаш: "Для мяне няма нічога бліжэй, як родная беларуская прырода.У бурлівай плыні нашага жыцця толькі яна дапамагае прыпыніцца, азірнуцца, убачыць і разгледзець неабдымную прыгажосць нашага краю, яна для мяне —невычэрпная крыніца сюжэтаў. Мяне аднолькава захапляюць і шырыня прасторaў, і самыя простыя матывы, праца над якімі на натуры ці то акварэллю, ці то алеем на палатне даюць імгненні неўсвядомленага шчасця, радасці быцця, выклікаюць жаданне ствараць...".

Родам А. Рыбчынскі з невялічкага Крычава, і гэта назаўсёды яго Радзіма, пра якую памятае, куды б ні паехаў, дзе б ні быў. А падарожнічаў і падарожнічае мастак шмат, і заўсёды пры ім альбом, які папаўняецца замалёўкамі, зробленымі гелевай ручкай, эцюдамі, малюнкамі.

Геаграфія яго твораў? Партугалія, Атлантычны акіян і далёкі Усход, Камчатка, горы, непаўторны аксамітава-зялёны колер якіх больш нідзе не ўбачыш. Сахалін — сопкі, воблакі, зеляніна, якая расце на востраве, хмызняк; адмысловая бухта. Уладзівасток, Хабараўск, Амур, сопкі ў смузе, халоднае, цёмнае мора, дзікі пляж. Падчас наведвання майстэрні мастака я пазнаёмілася з серыяй акварэляў "Японскае мора", якія не ўвайшлі ў выставу: яны ўражваюць! Пільнае вока, валоданне тэхнікай акварэлі паспрыялі перадачы на паперы лірызму і паэтычнасці кароткіх імгненняў стану прыроды, свежасці і нечаканасці ў адлюстраванні вобразаў. А магчымасці акварэлі невычарпальныя, і веданне іх дае такія выбітныя вынікі ў перадачы жывога пачуцця і настрою. І хоць сам ты і не быў у тых мясцінах, але нібы наведаў куточак далёкага казачнага краю. Вялікая колькасць замалёвак і акварэляў, выкананых А. Рыбчынскім падчас паездак па Прыбалтыцы, Венгрыі, Францыі, а таксама жывапісных карцін на тэму Паўночнага Каўказа, Заходняй Украіны (серыя "Карпаты") таксама чакае свайго часу, каб уразіць гледача непаўторнасцю вобразаў і настрояў.

Чаму пераважаюць акварэлі? А таму, што для далёкага падарожжа яны не такія грувасткія: узяў белую паперу, фарбы, пэндзаль — і малюй сабе ва ўпадабаным кутку.

Крым, пальмы, сонечны бераг — яго шмат разоў наведваў мастак разам з сям'ёй. Адсюль прывёз серыю "На Чорным моры", якая зноў і зноў папаўняецца новымі краявідамі і сюжэтамі. Феадосія, Ялта, Новы Афон, гара Кара-Даг... Асаблівыя акварэлі, якія перадаюць шторм: розныя адценні мора, высокія хвалі, амаль што чорныя, з "адчувальнымі" пырскамі салёнай вады...

Нават у вагоне цягніка не можа сядзець мастак без справы — малюе ўсіх, хто ў купэ: яны сядзяць, адпачываюць на паліцах. З акна купэ, пакуль цягнік стаіць некалькі хвілін на прыпынку, замалёўвае вакзал у Чарнігаве, станцыю Лазавую. Самы прывабны фрагмент нёманскага краявіду таксама "ўхапіў" з акна цягніка!

Жывапісам А. Рыбчынскі актыўна займаецца 20 гадоў . "І толькі цяпер адчуў, што такое пейзаж", — прызнаўся мне мастак. — Раней прыходзіў на пленэр, выбіраў месца і баяўся, не ведаў, ці атрымаецца, увесь час сумняваўся. І толькі цяпер, калі мне споўнілася 70, зразумеў, як і што мне маляваць. Я вяду размову з прыродаю, адчуваю сябе нароўні з ёй".

"Восеньскі пейзаж", "Дарога ў лесе", "Сосны", "Нябесны звон", "Зіма ў Драздах", "Адліга", "Браслаўшчына", "Вёска Строчыца", "Царква Святой Марыі Магдалены" — роднай Беларусі А. Рыбчынскі прысвяціў большасць сваіх непаўторных лірычных карцін, часцінку сваёй любові і натхнення аддае ёй. Аб'ездзіўшы краіну ўздоўж і ўпоперак, ён занатаваў улюбёныя куточкі ва ўсе часы года. Цыкл з 46 твораў "Спадчына мая" прысвяціў Якубу Коласу.

Графіка заўсёды прысутнічае ў яго творчым жыцці. Сярод самых першых работ — адметныя арыгінальнасцю задумы, шырынёй тэматычнага дыяпазону, гістарычнай дакладнасцю творы "Ф.Э.Дзяржынскі","Паўстанне сялян на Магілёўшчыне", "Чырвоная Армія на Беларусі", "Берлін. Май 1945", "Слаўны сын зямлі Беларускай — Ф.Скарына" і іншыя, зробленыя ў тэхніцы каляровай літаграфіі. Пазней да ўсіх тэматычных рэспубліканскіх і ўсесаюзных выставак мастак рабіў заказныя партрэты перадавікоў завода: іх шмат, і сёння па тых работах можна вывучаць час, у які яны ствараліся.

Сёння А. Рыбчынскі працуе ў паштовым выдавецтве "Марка", дзе рэалізуе сябе як мастак-графік. Тэматыка работ розная. Тут і прафесійна выкананая марка, прысвечаная 525-годдзю з часу заснавання мястэчка Уваравічы, што на Гомельшчыне, і юбілейныя канверты, прысвечаныя дзеячам культуры Беларусі: кінарэжысёру Л.Голубу (з выявай кадра з кінафільма "Паланез Агінскага"), драматургу К. Губарэвічу, народнай артыстцы Беларусі Р. Кашэльнікавай, і канверты, прысвечаныя святу "Дажынкі" ў Бабруйску", "Славянскаму базару ў Віцебску", 100-годдзю акцёра-купалаўца У. Дзядзюшкі. Цэлая серыя канвертаў змяшчае выявы касцёлаў і цэркваў, архітэктурных помнікаў Беларусі. Такім чынам мастак не толькі ўсебакова рэалізуе сябе ў творчасці, а — самае галоўнае — прапагандуе знакамітых людзей Беларусі, яе прыроду і архітэктуру далёка за межамі краіны, бо марка ці канверт можа даляцець у самы далёкі куточак свету...

А яшчэ на працягу ўсёй сваёй творчасці А. Рыбчынскі працуе ў жанры партрэта. "Мае сучаснікі" — гэтак называе ён серыю работ, якая з гадамі папаўняецца новымі асобамі. Тут можна ўбачыць партрэты Заіра Азгура, Уладзіміра Стальмашонка, Анатоля Анікейчыка, Віктара Грамыкі, Адольфа Гугеля, Алега Сурскага, Георгія Паплаўскага ды знаных беларускіх творцаў.

Між іншым, і дачка, і малодшы сын Анатоля Ігнатавіча таксама абралі мастацкія прафесіі — абралі самі, бацька, што называецца, іх не цягнуў па сваіх слядах. Напэўна, паўплывала на іх выбар надзвычай уражлівая і абаяльная творчасць Анатоля Рыбчынскага, уся яго адметная дзейнасць.

Галія ФАТЫХАВА

На здымках: Анатоль Рыбчынскі і яго работы: "Вясновы эцюд" (алей), "На Мухаўцы" (акварэль) і афармленне паштовага канверта, прысвечанага Мірскаму замку.

Нават у вагоне цягніка не можа сядзець мастак без справы — малюе ўсіх, хто ў купэ: яны сядзяць, адпачываюць на паліцах. З акна купэ, пакуль цягнік стаіць некалькі хвілін на прыпынку, замалёўвае вакзал у Чарнігаве, станцыю Лазавую. Самы прывабны фрагмент нёманскага краявіду таксама "ўхапіў" з акна цягніка!



Імгненні, пакладзеныя на словы

Беларуска-нямецкая кніга пункціраў Алеся Разанава «Трэцяе вока» (Ales Rasanau. Das dritte Auge: Punktierungen, 2007)

У апошнія два-тры гады ў нямецкамоўных краінах з'явілася нямала новых публікацый Алеся Разанава, сярод якіх — не толькі паэтычныя нізкі ў часопісах і альманахах, але і два асобныя выданні: зборнік нямецкіх вершаў беларускага паэта "Галіна паказвае дрэву, куды яно павінна расці" ("Der Zweig zeigt dem Baum wohin er wachsen soll"; Agora Verlag, Berlin 2006) і кніга-білінгва "Трэцяе вока" ("Das dritte Auge"; Urs Engeler Editor in Basel und Weil am Rhein 2007). Увогуле ж нямецкамоўнай чытацкай аўдыторыі творчасць А. Разанава знаёмая дастаткова даўно і добра: у Берліне ў выдавецтве "Agora" выйшлі яго зборнікі "Знакі вертыкальнага часу" ("Zeichen vertikaler Zeit", 1995, пераклады на нямецкую мову Эльке Эрб) і "Танец з вужакамі" ("Tanz mit den Schlangen", 2002, пераклады Эльке Эрб і Уладзіміра Чапегі), у Гановеры ў выдавецтве "Revonnah" — кніга-білінгва "Гановерскія пункціры" ("Hannoversche Punktierungen", 2002, пераклады Оскара Анзуля), у аўстрыйскім Грацы ў выдавецтве "Steirische Verlagsgesellschaft" — кніга "Вершасловы" ("Wortdichte", 2003). Заўважу, што назва апошняй ёсць па сутнасці, і вызначэннем новай жанравай формы — яшчэ адной у багатай палітры аўтарскіх жанравых форм Алеся Разанава. Менавіта вершасловы склалі і зборнік "Галіна паказвае дрэву, куды яно павінна расці"; у ім, паводле інтэрв'ю аўтара часопісу "Дзеяслоў" (2005, № 6 (19)), "..."Wortdichte" займелі свой працяг і развіццё".

Што да кнігі "Трэцяе вока", на якой я спынюся больш падрабязна, то ў яе ўвайшлі пункціры, адмыслова адабраныя перакладчыцай Э. Эрб з раней створанага А. Разанавым у гэтай паэтычнай форме. Кніга выйшла тыражом 800 асобнікаў, паслялоўе да яе напісала вядомая паэтка і перакладчыца Ілма Ракуза. Кожны пункцір пададзены ў перакладзе на нямецкую мову і на мове арыгінала (менавіта ў такой, даволі нетрадыцыйнай, паслядоўнасці, бо звычайна ў кнігах-білінгвах усё ж арыгінал папярэднічае перакладу), так што і да гэтай кнігі можна цалкам аднесці трапнае выказванне Оскара Анзуля, датычнае "Гановерскіх пункціраў": "Крок за крокам збліжаюцца тут абедзве мовы, яны слухаюць гукі адна адной, улоўліваюць настроі, спластоўваюцца адна з адною...".

Як вядома, форму пункціра і яго жанравае вызначэнне ўвёў у свой час у літаратурны абыходак (поруч са зномамі, вершаказамі, квантэмамі, а цяпер яшчэ і вершасловамі) менавіта Алесь Разанаў. Паводле аўтара, пункцір — "гэта назіранне, думка, вобраз — тое, што заўважылася вакол сябе ў рэчаіснасці. Што пастукалася ў тваю душу, у свядомасць, што блізка падступілася. І трэба, каб зрок убачыў, а слых пачуў нешта істотнае, каб быў гатовы гэта ўспрыняць. Калі прыйдзе такое назіранне — тады яно можа стаць пункцірам" ("Я — той, хто шлях і хто па ім ідзе...": Гутарка з Алесем Разанавым // "ЛіМ". 13.10.1995). Інакш кажучы, пункцір — свайго роду эскіз, імгненне, нібы выхапленае з паўсядзённа-будзённага промнем паэтычнага азарэння, адметнае сваёй нягучнай экспрэсіяй, глыбінёй перажыванняў і разнастайнасцю эмацыянальна-настраёвых фарбаў.

Складаецца пункцір з трох, чатырох, пяці, радзей — шасці радкоў (з дзевяноста пяці пункціраў, якія ўвайшлі ў кнігу "Трэцяе вока", больш за сорак — чатырохрадковыя). Маленькі па аб'ёме, гранічна сціслы (як заўважыла раней і з іншай нагоды — Ілма Ракуза, "на кожнае лішняе слова тут накладзена табу"), адзначаны свайго роду стылёвым аскетызмам, ён, па словах самога паэта, "валодае ўнутранай цэласнасцю" і "па сутнасці сваёй нават большы, чым паэма або верш... калі верш — гэта як колас, як рунь, сцябліна, то пункцір — гэта зернейка. І калі паэма — цэлы колас, то ўсё ж такі адно зернейка — яно больш блізкае, або сугучнае, або больш адпаведнае коласу, чым сама саломінка, сама сцябліна. І таму мне думаецца, што нейкім чынам пункціры нагадваюць мікрапаэмы".

Па прыродзе сваёй пункціры — заўсёдны плён жывых, дзейных узаемадачыненняў творцы з рэальнасцю ва ўсёй шматстайнасці яе праяў, яны не могуць нарадзіцца "з галавы", затое, як прызнаваўся аўтар ва ўжо цытаванай гутарцы, наступнічаюць дарозе: "...седзячы дома, іх не напішаш. Трэба быць у дарозе, каб заўважыць тое, што адбываецца на дарозе". "На дарозе" ж гэтай адбываюцца рэчы элементарныя, найпростыя, але, адначасна, і найдзіўныя, я б сказала — аблашчаныя трансцэндэнтнасцю. Невыпадкова паэт у сувязі з "Гановерскімі пункцірамі" гаварыў, што "Гановер у іх прысутнічае відавочна, а ў прысутным мне важна было заўважыць сутнае... "

Што надзвычай істотна, Эльке Эрб, перакладчыца і таленавітая паэтка, адчула, усвядоміла наяўнасць у пункцірах А. Разанава гэтага "сутнага" і сродкамі сваёй мовы пастаралася ўзнавіць іх філасофскія зместы. Нездарма ў адной з ранейшых публікацый яна распавяла, як была здзіўлена, узрушана, калі, чытаючы А. Разанава, зрабіла для сябе ашаламляльнае адкрыццё: яна, жыхарка іншай краіны з іншымі звычаямі, культурай, жыццёвым ладам і ўкладам, сама была ў некалькіх роках ад падобных паэтычных форм, магла б іх "распазнаць", "падысці да іх", настолькі блізкімі яны ёй падаліся. Як вынік — пераклады па вялікім рахунку адбыліся.

Агульную назву кнізе "Трэцяе вока" даў адзін са змешчаных у ёй пункціраў:

Die Sonne geht unter:
Сонца заходзіць:
Mit zwei Augen
у двое вачэй
schau ich ins dritte.
узіраюся ў трэцяе вока.

У гэтым пункціры, стрыжнявым, па сутнасці, для ўсёй творчасці А. Разанава, чытач мае справу са своеасаблівай натурфілософіяй, з паэтычна ўвасобленай дыялектыкай эмпірычна-канкрэтнага і метафізічнага, чалавечага і прыроднага, часовага і вечнага, з тым самым светаўспрыманнем, якое ўзыходзіць яшчэ да Эклезіясту: "Род прыходзіць, і род праходзіць, а зямля векавечна стаіць. Сонца ўзыходзіць, і сонца заходзіць і спяшаецца ў месца сваё, дзе ўстае... Усё існае — поўніцца працай; не можа ўсяго чалавек пакласці на словы: не насыціцца бачаннем вока; не напоўніцца слуханнем вуха... І паклаў я на сэрца помысел мой, каб шукаць і даследаваць мудрасцю ўсё, што пад небам робіцца: гэты прыкры занятак даў Бог сынам чалавечым, каб кіраваліся ім" (1: 4—13; Біблія цытуецца ў пер. В. Сёмухі). У паэзіі А. Разанава чалавек таксама нязменна прысутнічае, нязменна шукае і даследуе — нават пры яго фізічнай адсутнасці ў тым ці іншым творы, бо чалавек ёсць не проста часткай свету, але і спасцігальнікам — свету ў сабе і сябе ў свеце, вечнага ў паўсядзённым і паўсядзённага ў вечным; гэта ён, чалавек, бачыць, слухае, асэнсоўвае светавыя праявы, гэта ён іх імкнецца "пакласці на словы". Як падкрэсліваў сам паэт, "калі гаворка ідзе аб паэзіі, заўсёды маецца на ўвазе чалавек. І чалавек-творца і чалавек у прынцыпе. Таму што першай і апошняй мэтай паэзіі з'яўляецца сам чалавек, яго магчымасці".

Самыя розныя рэчы і з'явы "кладуцца на словы" ў пункцірах, што склалі кнігу "Трэцяе вока": дораць свята адна адной заснежаная даліна і арабіна ў чырвані пацерак, нечуванымі рыфмамі і рытмамі абменьваецца з камянямі ручай, шчодра дзеляцца ветрам галіна з галінай, раптоўным снегам застывае на вецці белая бліскавіца, безліччу нітак сшывае зямлю з нябёсамі дождж, маятнік здабывае "з нетраў прасторы" час, а гром перайначвае яго "ў прадчассе"... Пры гэтым ці не большасць складнікаў вобразнай сістэмы А. Разанава мае характар канцэптаў: чалавек, час, прастора, сонца, зямля, дрэва, вецер, бязмежжа, мур, цемра, ланцуг, дзверы, цэнтр і інш. Цалкам зразумела, што семантычны патэнцыял гэтых вобразаў разлічаны на чытацкае асацыятыўнае ўспрыманне, *сумысленне*, на свайго роду душэўна-духоўную далучанасць да аўтарскіх пачуццяў і думак; толькі ў такім выпадку паэтычныя сімвалы А. Разанава могуць быць прачытаны адэкватна, у сваіх анталагічных сутнасцях (што, зрэшты, датычыцца не толькі яго пункціраў, але і ўсёй яго творчасці).

З асаблівасцяў кнігі "Трэцяе вока" варта адзначыць і тое, што пункціры, якія ствараліся паэтам у розны час і ўваходзілі ў склад розных папярэдніх выданняў (пераважна апошніх гадоў), у новай сукупнасці-спарадкаванасці займелі і ўласную архітэктоніку — сталіся не проста выбраным, а менавіта *кнігай, адзіным цэлым* са сваёй унутранай логікай, гармоніяй, сваім — агульным для кнігі — падтэкстам. Адзінства гэтае надае ім (у шэрагу іншых фактараў) так званая "сезонная" кампазіцыя, якой нязменна кіраваліся ў сваіх нізках хайку славутыя ўсходнія майстры слова (Мацуа Басё, Кабаясі Іса, Танігуці Бусон, Масаока Сікі) і паводле якой пабудаваны "Гановерскія пункціры" самога Алеся Разанава (аб зместавых і фармальных перазовах пункціраў з хайку гл. мой артыкул у "ЛіМе" за 29. 11.2002 г.).

Распачынае кнігу "Трэцяе вока" пункцір, што месціць у сабе, у нейкім сэнсе, мастацкае крэда аўтара (згадайма развагі А. Разанава: "...заўсёды творчасць — гэта пэўным чынам супрацоўніцтва. У ім два пачаткі: аўтар... і той самы твор, які — магчыма, тут трошкі метафізікі — загадзя прысутнічае, і ён захоча адгукнуцца на тваю прапанову, на тваё слова"):

Irgendwo wartet es:
Недзе чакае:
Ich suche
шукаю
das Gedicht in der Stadt.
у горадзе верш.

З пачаткам шляху-пошуку творцы ўступае ў свае правы тэма гадавога цыкла: зіма ("Завея: / на левы бок / выварочваецца прастора"; "Снежнае неба: / ляціць аднекуль / некуды чорнай / адтулінаю крумкач"; "У снежным бязмежжы: / прагалы — / людзі... "), як і належыць, змяняецца вясной ("У залатых каронах / прынцы прыйшлі / і казку / з сабою прынеслі: / пагорак у дзьмухаўцах"; "Апранута ў выбух — / з узгорку ляціць / груша расквечаная / ў бязмежжа..."), вясна — летам ("Босай нагою ручай / кранае жанчына: / лета"; "Раніца. / Гракае грак — / сшывае / час і прастору / суровай ніткай"), лета — восенню ("Возера. / У адлюстраванне / падае ліст"; "З лета — у восень: / плыве / над голаю пожняю / павуцінка..."), і — зноў надыходзіць зіма ("Абапал дарогі бярэзіны: / падаюцца / адна за адною / ў зімовы змрок").

Праўда, у параўнанні з "Гановерскімі пункцірамі", "сезонная" кампазіцыя ў "Трэцім воку" хаця і дастаткова выразная, усё ж менш строгая; асабліва гэта адчуваецца напрыканцы, дзе шэраг пункціраў нібы імкнецца ўтварыць свой уласны, новы гадавы цыкл, па нейкай прычыне не паспеўшы займець пэўнае і законнае месца ў агульным лёсе-кнізе.

Увогуле ж выданне пакідае ўражанне своеасаблівага філасофска-паэтычнага імпрэсіянізму, свайго роду філасофска-паэтычнага дзённіка, у складніках-пункцірах якога занатаваны менавіта імгненні, у слове і вобразе матэрыялізаваны настроі, перажыванні, душэўныя інтанацыі. Няма сумнення, што кніга "Трэцяе вока" стане новай прыступкай у знаёмстве нямецкай чытацкай аўдыторыі і з талентам Алеся Разанава, і з самім беларускім словам; паралельная публікацыя беларускіх і нямецкіх тэкстаў павінна гэтаму паспрыяць.

Ева ЛЯВОНАВА

Паміж жыццём і смерцю

№ 7 літаратурна-філасофскага часопіса "Паміж" атрымаўся настолькі змрочным, што да яго варта было б даваць каментарый кшталту: асобам з неўраўнаважанай псіхікай чытаць не рэкамендуецца. Наўрад ці, праўда, мог выглядаць па-іншаму нумар, прысвечаны тэме смерці ў самых розных яе абліччах і праявах: смяротнае пакаранне, эўтаназія, забойства, самагубства, канібалізм і ахвярапрынашэнне... Да "абмеркавання" тэмы непасрэдна і апасродкавана далучыліся як замежныя (Мішэль Фуко, Мэрвін Хэрыс, Андрэ П'ер Каламба), так і беларускія аўтары (Зміцер Смалякоў, Алесь Грыгор'еў). Часам спрэчныя і занадта цьмяныя, аднак сур'ёзныя развагі на непрывабныя тэмы змогуць зацікавіць не толькі аматараў грувасткай філасофскай думкі.

Літаратурна-мастацкая частка (усё з тым жа змрочным адценнем) атрымалася значна слабейшай за філасофскую. Вершы Мары Кэнэт і Ганны Урбан сведчаць пра страту аўтарамі адчування слова, апавяданне Сержука Мядзведзева "Ружа на пласе" ўражвае, аднак выглядае няскончаным ці, прынамсі, недапрацаваным. Тое ж можна сказаць і пра эсэ Наталкі Харытанюк "Палімпсэст". Бадай, самае вартае — загадкавыя і дэпрэсіўныя — ва унісон агульнай тэматыцы — "Жоўтыя шпалеры" Шарлоты Пэркінс Гілман (пераклад з англійскай Ю. Цімафеевай).

Зрэшты, аўтары і рэдактары шчыра прызналіся, што "не нясуць аніякай адказнасці за сваю працу". Хочацца спадзявацца, што гэты постмадэрновы досціп усё-ткі не ператворыцца ў сапраўдную характарыстыку дзейнасці стваральнікаў часопіса.

Жана КАПУСТА

Купала і Аршаншчына

Упершыню Янка Купала наведаў Аршаншчыну ў красавіку 1935 г. падчас творчай камандзіроўкі. А праз некаторы час у сувязі з 30-годдзем творчай дзейнасці ўрад пабудаваў яму дачу, месца для якой Купала выбраў сам: за паўкіламетра ад вёскі, ва ўрочышчы Ляўкі, сярод сасновага бору, на левым беразе Дняпра. Дача адразу стала гасцінным прытулкам для многіх беларускіх паэтаў і замежных гасцей. У Ляўках бывалі Якуб Колас, К. Крапіва, К. Чорны, П. Броўка, А. Александровіч, С. Шушкевіч і інш. Апошні раз Янка Купала прыехаў у Ляўкі ў канцы чэрвеня 1941 г. 30 чэрвеня паэт назаўсёды развітаўся з Ляўкамі, а праз тры дні ад прамога трападання нямецкага снарада дачны дом загарэўся. Полымя ўмомант яго знішчыла. Амаль праз год, 28 чэрвеня 1942 г., не стала і самога паэта.

У 1962 г., да 80-годдзя з дня нараджэння паэта на будынку былой канторы Копыскага лясніцтва была адкрыта мемарыяльная дошка; тут жа пачаў працаваць філіял музея Янкі Купалы. Да 1977 г. ён існаваў на грамадскіх пачатках. У 1978 г. урад Беларусі прыняў рашэнне аб стварэнні Купалаўскага мемарыяльнага запаведніка "Ляўкі" (заснаваны 11 кастрычніка 1978 г.) На тэрыторыі запаведніка знаходзяцца былая сядзіба Копыскага лясніцтва і будынак яго канторы, дача паэта (адноўлена ў 1981 г.), домік шафёра, гараж з легкавым аўтамабілем Янкі Купалы, скульптура "Восень паэта" (аўтар — народны мастак Беларусі, скульптар А. Анікейчык), гаспадарчыя пабудовы. З 1980 г. у Ляўках праводзяцца святы паэзіі, злёты студэнтаў-філолагаў БДУ, школьныя ранішнікі.

Мала што змянілася тут з тых далёкіх купалаўскіх часоў. Хіба толькі памужнелі дубы паблізу дачы, ды яшчэ перад домам песняра выраслі дзве сасны. Ніхто іх не садзіў, яны пасяліліся самі на месцы тых чатырох дрэў, якія паэт прасіў зберагчы і не пашкодзіць перад першапачатковым будаўніцтвам. Маладзенькія сосны — сімвал неўміручасці сапраўднага таленту...

Кацярына ВАРАНЬКО

«Вострае лязо — мая паэзія!»

У літаратурна-мастацкім салоне "Сустрэчы на Замкавай" пры Гомельскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А. І. Герцэна адбыўся юбілейны вечар Ніны Шкляравай, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, дзе прагучалі песні на яе вершы, віншаванні калег па пяры, сяброў, было шмат гумару і падарункаў ад шчырага сэрца. Трохі раней яе юбілей святкавалі ў Гомельскім раённым Палацы культуры, дзе было столькі кветак, што прыйшлося выклікаць таксі.

Аднойчы, мо год дваццаць таму, у гэтай жа бібліятэцы праводзілася мерапрыемства, прысвечанае маладым паэтычным талентам Гомельшчыны. Звінелі галасы юных паэтаў, і раптоўна сярод іх мякка, мілагучна прагучаў голас прыгожай, выгнутай, як маладая таполя, дзяўчынкі, якая прачытала цудоўны верш "Гомель, ты мая бусляначка". Гэта была Алена Алешына, дачка Ніны Шкляравай, якая нечым няўлоўна нагадвала маці. Неўзабаве яна скончыла Маскоўскі літаратурны інстытут, выдала зборнік вершаў "Воленка", а таксама зборнік дзіцячай паэзіі.

Сама ж Ніна Шклярава пасля выхаду першых двух зборнікаў выехала ў Расію і знікла з паэтычнага небасхілу на доўгія дваццаць год.

А калі вярнулася на Радзіму, то адчула наплыў новай творчай узнёсласці, натхнення. Зноў з'явілася жаданне пісаць, і як вынік гэтага — выдадзеныя адна за другой пяць новых кніг, шматлікія публікацыі ў зборніках расійскай, украінскай і беларускай паэзіі.

Я кнігу раскрыю,
Нібы аканіцы,
І буду няспешна
На вершы дзівіцца.

Яна — адна з нямногіх на Гомельшчыне паэтэс, што пішуць на чыстай, празрыстай, як сляза, мілагучнай беларускай мове.

Паэтычныя вобразы Н. Шкляравай больш прадметныя, блізкія да паўсядзённай канкрэтыкі, і гэта робіць яе вершы зразумелымі і блізкімі чытачу. Прастата — вартасць і асаблівасць сапраўднага мастацтва. Народная мова, паказ сялянскага жыцця і нялёгкай працы — як бруістая крыніца вобразнасці.

З цягам часу расло яе майстэрства, абсягі паэтычнай думкі пашыраліся, паглыбляліся магчымасці паэтычнага мыслення і абвастралася адчуванне формы.

У творчасці Н. Шкляравай ёсць тры стылёвыя лініі. Створанае ў юнацкія гады адрозніваецца рамантычнай узнёсласцю, ідэалізацыяй мастацкага вобраза. Сталыя гады прынеслі больш раскаванасці, пазбавілі стэрэатыпнай абмежаванасці. У апошні час паэтэса сур'ёзна занялася перакладамі. Яны маюць цікавую асаблівасць: ні ў чым не саступаюць арыгіналам. А бывае, што элітарную, разлічаную на падрыхтаванага чытача паэзію, напрыклад, Фелікса Мысліцкага, яна набліжае да шырокага кола чытачоў, робіць больш даступнай, не губляючы тым часам усіх яе адметных арыгінальных рысаў. Гэта вышэйшы пілатаж у справе перакладу. І трэба аддаць належнае, паэтэса дасканала авалодала гэтым майстэрствам.

Між іншым, яна адзіная з жанчын зрабіла вершаваны пераклад на беларускую мову шэдэўра старажытнарускай літаратуры "Слово о полку Игореве". Прафесіяналы адзначылі яго безумоўны густ і высокае майстэрства. Як піша Н. Федарцова, кандыдат філалагічных навук, "Ніна Шклярава не ставіць задачу даслоўнага перакладу твора. Яна клапоціцца аб прыгажосці, аб праўдзівасці яго гучання на беларускай мове. Бо "Слова..." — гэта вершы, напісаныя "старыми словесы".

Апошні зборнік вершаў "Акаціцы" выдадзены як падарунак да юбілею паэтэсы ў серыі "Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі". Раскрываеш кнігу, і быццам полымя асляпляе вочы: "Ахвярую Анатолю Сысу".

А колькі тут сыноў і дочак
Цяпер паснулі — і калісь...
Я стаўлю свечку на грудочак:
Спі, Анатоль мой,
Спі, мой Сыс.

Кранаюць сэрца і душу радкі, прысвечаныя сябрам — суквецці беларускай паэзіі, вялікім талентам, якія не паспелі сказаць свайго апошняга слова, калі іх заўчасна напаткала смерць. Гэта — Анатоль Сыс, Яўгенія Янішчыц, Міхась Стральцоў, Анатоль Грачанікаў, Леанід Якубовіч, Еўдакія Лось... Паэтэса без горычы і адчаю разважае пра той час, калі спыніцца "мой цягнік", наадварот, яна, шчаслівая, выйдзе з яго на сустрэчу з сябрамі:

І я свае абдымкі
Раскрыла, быццам крылы,
Іх ахінаю:
— Родныя!
Вось я і дома.

Відаць, ёй, як і ўсім нам, бывае вельмі несалодка ў гэтым жыцці, і "нехта набіваецца ў сяброўкі, // і спачувае табе ў горы — лоўка". Але ж, як квольня парасткі ў вясенняй раллі, прабіваюцца словы, што павінны сувоем звязаць цябе з сапраўднымі сябрамі...

Адзіноцтва жаночае і творчае, адзіноцтва чалавека ў Сусвеце, адзіноцтва перад Богам... Гэта тэма вельмі часта сустракаецца ў яе паэзіі:

Сум душы маёй,
Ты чаго крычыш?
Дай душы спакой,
Падары мне ціш.
Сум душы маёй,
Ты чаго маўчыш?
Страшна мне адной,
Мяне душыць ціш.

І тады жыццё заходзіць у такія тупікі, з якіх, здаецца, няма выйсця:

Усюды квадраты. Квадратамі
І вокны, і сцены, і хаты.
Я думкі хаваю за кратамі,
На сценку палезеш хіба ты?

Ніна Шклярава — паэтэса са сваім арыгінальным светаадчуваннем, месцам і лёсам у літаратуры, хаця лёс гэты мог быць больш спагадлівым і шчаслівейшым.

Я — нібы жабяня зледзянелае
Ажываю істотаю ўсёй.
Ці, як дрэўца даўно абгарэлае,
Што вяртае лістоту зімой.

Яе творчасць, на жаль, яшчэ не атрымала той высокай адзнакі, якую заслугоўвае. Яна многа і ахвотна ўдзельнічае ў розных мерапрыемствах, прысвечаных літаратурным падзеям: конкурсах, фестывалях, святах, і заўсёды становіцца лаўрэатам ці то міжнароднага конкурсу імя Баяна, ці то абласнога імя Кірылы Тураўскага. Ахвотна дапамагае маладым, вядзе літаратурную суполку пры Славянскай бібліятэцы.

Будзем спадзявацца, што новыя кнігі вершаў і перакладаў адкрыюць нязведаныя грані таленту Ніны Шкляравай.

Вострае лязо — мая паэзія!
Босая іду па ім гарэзліва,
Хоць і ўся нацятая ад болю,
Як сляза, але ўсё ж ніколі
Праклінаць не стану свайго лёсу,
Як бы цяжка мне ні давялося.
Упаду расою на траву,
Васільком памкнуся ў сіняву,
За прамень схаплюся і —
Жыву!

Наталля МАЛАШЭНКА,
загадчыца аддзела Гомельскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя Герцэна

Дапамагайце талентам

Паэт Аляксей Пысін з 1974 года з'яўляўся адказным сакратаром Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР, ставіў на крыло маладых паэтаў, празаікаў, сатырыкаў-гумарыстаў. З маладымі творцамі абласное аддзяленне вяло работу няспынна самымі рознымі формамі і метадамі.

У шэрагу рэдакцый раённых газет былі створаны маладзежныя літаб'яднанні, у газеце "Магілёўская праўда" рэгулярна з'яўлялася літаратурная старонка "Прыдняпроўе", у ёй дэбютавалі пачаткоўцы з вершамі, апавяданнямі, гумарэскамі. У рэдакцыю да паэта Пысіна часта прыязджалі маладыя творцы на кансультацыю, але найбольш дасылалі свае лісты поштай. І Аляксей Васільевіч не пакідаў іх без увагі. Кожнаму даваў нейкую параду, знаходзіў цёплае слова падтрымкі, нават калі допіс і не мог пайсці ў друк. Словы бацькоўскай цеплыні, увагі акрылялі маладых літаратараў і яны дзень за днём павышалі, адточвалі сваё майстэрства.

Сваім настаўнікам Аляксея Пысіна называлі пісьменнікі Анатоль Сербантовіч, Аляксандр Мельнікаў, Нэля Тулупава, Віктар Хаўратовіч, Алег Салтук, Марыя Панкова, Святлана Басуматрава, Змітрок Марозаў, Апанас Палітыка, Рыгор Яўсееў, Алесь Пісьмянкоў ды шмат яшчэ хто, каму давялося ўзняцца на высокі беларускі літаратурны Парнас. Некаторым — аж на самую яго вяршыню.

І ўсё ж найбольш дзейснай дапамогай маладым творцам Аляксей Васільевіч лічыў выезды ў літаб'яднанні і ўдзел у іх пасяджэннях, а яшчэ ўдзел у семінарах пачаткоўцаў, а таксама падрыхтоўку і правядзенне літаратурных вечароў з удзелам саміх творцаў. А ім прыкладам, узорам паэтычнага майстэрства было Слова мудрага паэта-настаўніка, яго вершы, якія ён чытаў на тых вечарынах.

Семінары і літаратурныя вечары праводзіліся часта і давалі багатыя ўсходы. Суполка пісьменнікаў-магілёўцаў год ад году шырылася, расла і колькасцю і якасцю. Маладыя літаратары былі ўдзячны свайму старшаму таварышу па пяры, свайму Настаўніку за цеплыню шчодрага сэрца і душы, за карысныя парады і падтрымку, за бацькоўскую ласку. Усё гэта дапамагала ім з часам адточваць майстэрства слова, станавіцца на крыло, самастойна выходзіць на літаратурны шлях. Вядомы беларускі пісьменнік Іван Чыгрынаў пісаў ("Літаратура і мастацтва" ад 12 снежня 1980 года):

"Літаб'яднанне "Натхненне" пры бялыніцкай раённай газеце "Зара камунізму" створана яшчэ ў трыццатыя гады, але найбольш плённымі сталі апошнія пяць гадоў, калі яго дзейнасці стаў аддаваць шмат часу і ўвагі вядомы беларускі паэт Аляксей Васільевіч Пысін. Ён — актыўны ўдзельнік усіх літаратурных сустрэч "Натхнення", дапамагае і словам і справай творчаму росту маладых пісьменнікаў. Бялыніцкае літаб'яднанне рэгулярна праводзіць пасяджэнні, на якіх абмяркоўваюцца новыя творы яго членаў, арганізуе літаратурныя сустрэчы маладых з рабочымі і хлебаробамі. Літаб'яднанне "Натхненне" вядомае ў рэспубліцы — яму прысвяціла адну з перадач Беларускае тэлебачанне, свае старонкі ахвотна аддалі яму часопіс "Беларусь", рэспубліканская маладзёжная газета "Чырвоная змена". А зусім нядаўна, напярэдадні 60-годдзя з дня нараджэння ЛКСМБ, літаб'яднанню з Бялыніч прысвоена ганаровае званне лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Магілёўшчыны".

А вось па некалькі радкоў з успамінаў пра Пысіна-настаўніка саміх на той час маладых творцаў:

Святлана Басуматрава ("Веснік Магілёва" ад 23 сакавіка 1990 года):

"Чалавек высакароднай душы, ён жыў шчодрым клопатам аб маладой змене. У адносінах яго да творчай моладзі былі і бацькоўская трывога, і мудрасць настаўніка, і павага да маладзейшага таварыша па пяру. Ён умеў вучыць не павучаючы, раіць, не навязваючы свайго погляду. Пысін як роўны роўнаму падаваў далонь маладому літаратару... Аляксей Васільевіч не баяўся пахваліць вершы маладога аутара".

Марыя Панкова ("Полымя" № 3, 1990 года, стар. 184—190):

"Даведаўшыся ў гомельскіх журналістаў, што Аляксей Пысін супрацоўнік "Магілёўскай праўды", адважылася даслаць яму свае нарысы. А тут на табе! — здзіўленню і радасці не было мяжы — адказ прыйшоў на чацвёрты ці пяты дзень...

"Добры дзень, Марыя! Учора атрымаў і пісьмо, і нарысы. Дзякуй Вам за давер'е і цёплыя словы. Прачытаў усё адразу. Мяне кранула Ваша шчырасць, любоў да чалавека. А якая цудоўная мова! І ўсё прасвечана тонкім, харошым лірызмам. Можа б філасафічнасці болей? Але — раіць вельмі цяжка. Усё прыйдзе само і ў свой час. А пакуль я радуюся, што пабагацеў яшчэ на аднаго цудоўнага чалавека.

Жадаю Вам усяго самага добрага.

10.04.74 А. Пысін".

Падзівілася: жыла на Гомельшчыне, а па падтрымку ішла ў... Магілёў...

Думаю... Думаю, што дужа адарыў мяне лёс на такога Настаўніка. Калі мне невыносна — дастаю лісты Аляксея Васільевіча і чытаю. Вельмі цікавая была тады перапіска з ім".

Алег Салтук ("Літаратура і мастацтва" ад 20 ліпеня 2007 года):

"Перада мной словы, напісаныя рукой майго настаўніка: "Дарагі Алег! Сёння зайшоў у "Магілёўскую праўду", дзе чакала мяне тваё пісьмо. Мне прыемна, што набраўся ты моцы, сілы і ўсё вышэй уздымаешся, як паэт і ўжо як кіраўнік. Калі быў у Польшчы (чэрвень гэтага года), гаварыў у Зялёнай Гуры (пабрацім Віцебска), што ў Віцебску створана абласное аддзяленне СП і што ты яго ўзначальваеш. Зяленагурскіх пісьменнікаў гэта зацікавіла, хочуць яны наладзіць сяброўства... План работы? Заплануй — два-тры сходы. Семінары маладых лепш праводзіць не ў абласным цэнтры, а ў раёнах. Сустрэчы. Літаратурныя вечары. Аўтарскія, творчыя вечары. Падабраць чытальнікаў з ліку студэнтаў, удзельнікаў самадзейнасці..."

І ўсё было так, як ён раіў: і паездкі ў Зялёную Гуру, і абласныя семінары ў раёнах вобласці, і сустрэчы з пісьменнікамі Смаленска і Пскова. Куды ўсё падзелася?".

І сапраўды, а куды ўсё тое падзелася? Сёння ў газетах рэдка з'яўляюцца інфармацыі пра сустрэчы чытачоў з пісьменнікамі. І амаль нічога пра аўтарскія вечары і семінары. На палосах мясцовых газет рэдка можна ўбачыць "Літаратурную старонку". Нават тыя газеты, якія раней змяшчалі іх штомесяц, сёлета друкуюць нерэгулярна. Магілёўскія газеты, апрача аграрнай "Зямля і людзі", адмаўляюцца друкаваць рэцэнзіі на новыя творы паэтаў і празаікаў.

Марыя Панкова падзівілася, што ёй, тады гамяльчанцы, адразу ж адгукнуўся з іншай вобласці, з Магілёва, вядомы паэт Аляксей Пысін. Дзівіцца і сённяшнія пачаткоўцы толькі ўжо з іншай нагоды: на іх лісты ў газеты і часопісы па ўсёй краіне ніхто не адгукаецца. Быццам бы супрацоўнікі ўсіх рэдакцый, усе журналісты і пісьменнікі зрабіліся бязгучныя і бязмоўныя. Нешта друкуецца, а рэшта (большая частка допісаў) выкідваецца на сметнік. Адкуль тут вучоба? Які тут будзе рост пісьменнікаў? Мы кінулі маладых творцаў у ваду: няхай самі выплываюць. Ці не таму апошнім часам на літаратурнай ніве пышнай кветценню буяе пустазелле?

Калі мы хочам росту нацыянальнай літаратуры, то трэба рыхтаваць дастойную змену паэтаў, празаікаў, сатырыкаў-гумарыстаў, крытыкаў, драматургаў. Ім трэба паўсядзённа памагаць, іх трэба вучыць. І памагаць у першую чаргу трэба маладым, таленавітым. Бо яшчэ класік сказаў: памагайце талентам, а бездарнасць сама праб'ецца.

Віктар АРЦЕМ'ЕЎ

№ 34 22 жніўня 2008 г. ЛіМ

Найвялікшае сонца — родная мова

Старонкі лёсу

Літаратурны працэс у Беларусі другой паловы XX стагоддзя наўрад ці можна ўявіць паўнацэнным без паэта Яўгена Міхайлавіча Крупенькі — таленавітай творчай асобы, на вялікі жаль, не надта на сённяшні дзень шырокавядомай, забытай сучаснай літаратурнай крытыкай зусім не заслужана, таму, што ў ягоным творчым багажы — каля 15 арыгінальных паэтычных зборнікаў, плюс мноства перакладаў на родную беларускую мову твораў паэтаў, як модна сёння казаць, з далёкага і блізкага замежжа. А яшчэ ж у арсенале галоўных набыткаў як непасрэдна самога Яўгена Міхайлавіча, так і ўсёй нашай нацыянальнай літаратуры і культуры, пераклад шэдэўра сусветнай класікі — "Слова аб палку Ігаравым".

Лёс Яўгена Крупенькі — паэта, перакладчыка, журналіста, як, дарэчы, і ўсёй ягонай літаратурнай спадчыны, склаўся для нашага сённяшняга часу некалькі незвычайна. Шасцідзесятыя-васьмідзесятыя гады XX стагоддзя, падчас якіх Яўген распачаў, а потым і шчыра актыўнічаў на літаратурнай ніве, нібыта і не характарызаваліся ўжо ганеннямі, пераследамі, а тым больш — рэпрэсіямі з боку ўлад у адносінах да творчай інтэлігенцыі. Аднак жа адносна яго як літаратара гэта можна сказаць з вялікімі ўмоўнасцямі. Па некалькі гадоў у выдавецтвах Беларусі ляжалі без руху рукапісы паэтычных зборнікаў Крупенькі; многія калегі і асабліва — партыйна-савецкія крытыкі — пры згаданні імя Яўгена круцілі носам і за лепшае лічылі прамаўчаць, не выказваць уголас свае, як яны лічылі, важкія ацэнкі і высновы... Бо быў Яўген Міхайлавіч беспартыйны, уладай не абласканы і не прыгрэты; ды і "заўважаўся" нярэдка то ў кавярні-забягалаўцы, то ў асяродку вясёлай кампаніі... Хаця па рабоце — а роўна два дзесяцігоддзі Яўген Крупенька працаваў у вельмі папулярнай у той час маладзёжнай газеце "Чырвоная змена" — да яго прэтэнзій зусім не было: артыкулы, нарысы, карэспандэнцыі, рэпартажы ён пісаў вельмі хутка і на высокім прафесійным узроўні.

І тут, на маю думку, самы час прывесці біяграфічную нататку пра Яўгена Крупеньку з "Беларускай энцыклапедыі", што выйшла ў свет у 1999 годзе:

"Крупенька Яўген Міхайлавіч (20.8.1936, в. Саськаўка Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці — 4.2.1990), беларускі паэт. Скончыў Літаратурны інстытут імя М.Горкага ў Маскве (1970). Працаваў у прэсе, у 1970—1990 гг. у газеце "Чырвоная змена". Друкаваўся з 1953 года. Аўтар зборнікаў вершаў і паэм "Салаўі" (1969), "Няздоля" (1972), "Бусліны човен" (1975), "Стрэчанне" (1981) і іншых, сатырычных і гумарыстычных твораў ("Слон пад мікраскопам", 1978; "Юбілейныя бліны", 1984), кніжак для дзяцей ("Малінавы год", 1971; "Колеры", 1973; "Хто нам дом пабудаваў", 1978, і іншых). Пераклаў на беларускую мову "Слова аб палку Ігаравым", творы рускіх, украінскіх паэтаў..."

У дзесяцірадковай біяграфіі паэта і перакладчыка двойчы згадваецца выраз "і іншых". А, між тым, тут маюцца на ўвазе не менш, а, можа, нават больш таленавіта напісаныя зборнікі паэзіі Яўгена Крупенькі "Нашы святы" (1975), "Усе работы добрыя" (1977), "Карэнні" (1986), "Гекзаметр баразны" (1988). Акрамя твораў рускіх і ўкраінскіх паэтаў, ён перакладаў на беларускую мову вершы грузінскіх калег па пяры, выступаў таксама з літаратурна-крытычнымі артыкуламі і рэцэнзіямі. Змяшчаліся ў рэспубліканскім перыядычным друку і літаратурна-мастацкіх часопісах і рэцэнзіі на паэтычныя зборнікі самога Крупенькі...

Пасля смерці Яўгена Міхайлавіча быў выдадзены ягоны зборнік вершаў і перакладаў з надзвычай сімвалічнай назвай "Жыццём прысягаю", з уступным артыкулам аднаго з лепшых і верных сяброў Крупенькі, такога ж таленавітага паэта Міколы Федзюковіча. Дарэчы, выданне зборніка "Жыццём прысягаю" было ажыццёўлена пры фінансаванні з Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

Гэты зборнік, на вялікі жаль, не ўбачаны самім паэтам, мог і павінен быў стаць адметнай з'явай усёй нашай літаратуры і культуры. Праз 23 гады пасля завяршэння Яўгенам Крупенькам работы над перакладам бессмяротнага "Слова аб палку Ігаравым" твор, нарэшце, убачыў свет.

Напрыканцы 1975 года мне пашчасціла працаваць поруч з Яўгенам Міхайлавічам Крупенькам у згаданай вышэй рэспубліканскай маладзёжнай газеце "Чырвоная змена". Працаваць роўна 6 гадоў у адным рэдакцыйным пакоі, па сутнасці штодня бачыцца і гутарыць, раіцца і спрачацца падчас высвятлення творчых пытанняў і праблем.

...У адзін са снежаньскіх дзён 1975 года Яўген з'явіўся ў рэдакцыі ў незвычайнай вопратцы і надзвычай прыўзнятым настроі: у беласнежнай кашулі, адпрасаваным касцюме, пад галыштукам; з таямнічай (непараўнальнай крупенькаўскай!) усмешкай на твары... Чырвоназменаўцы былі ў шоку. З аднаго боку, з другога, з трэцяга пачалі "падыходзіць" да паэта: цікавіцца і высвятляць — што ж за нагода? Крупенька яшчэ больш загадкава ўсміхаўся, адбіваючыся ад найбольш назойлівых бы ад надакучлівых мух: маўляў, пачакайце, скажу крыху пазней... Перад абедам збегаў па правіянт у "знакаміты" ў той час сярод журналістаў Дома друку 20-ы гастраном каля тэатральна-мастацкага інстытута і запрасіў нас за стол.

Калі ж "абед" увайшоў у звыклае рэчышча, Жэня ў чарговы раз адчыніў свой партфель і неяк па-свойму ўрачыста і асцярожна выняў адтуль аркуш паперы. Разгарнуў, пачырванеў бы той школьнік-пачатковец і пачаў чытаць:

"...Я не ведаю прозвішча перакладчыка, але скажу, што яго пераклад геніяльнага помніка старажытнай пісьменнасці зроблены кваліфікавана і можа быць прызнаны значнай падзеяй у творчасці самога аўтара і літаратурным жыцці нашай рэспублікі ўвогуле..."

На твары Яўгена з'явіліся слёзы. Ён перадаў паперы Міколу Федзюковічу, які тады таксама працаваў у "Чырвонай змене", і папрасіў:

— Пачытай далей, Міколка!

Гэтай "паперай" была закрытая рэцэнзія вядомага беларускага літаратуразнаўцы, доктара філалагічных навук, прафесара Юльяна Сяргеевіча Пшыркова на пераклад "Слова аб палку Ігаравым", зроблены невядомым (зашыфраваным выдавецтвам) творцам.

У двух абзацах "прайшоўшыся" па ролі і значэнні гэтага твора "чалавечага генія" для рускай і савецкай літаратуры, Юльян Пшыркоў адзначыў, што на сапраўдны подзвіг перакладу "Слова..." на той час "адважыўся толькі вялікі Янка Купала, здзейсніўшы празаічны пераклад у 1919 годзе і паэтычны — у 1921-м".

Коратка, аднак даволі трапна і ўдала адзначыўшы вартасці новага паэтычнага перакладу "Слова..." на беларускую мову, Юльян Сяргеевіч, як ён падкрэсліў, "для прыкладу" параўнаў арыгінал і два пераклады "аднаго з найбольш паэтычных месц "Слова..." — плач Яраслаўны".

Параўноўваць тыя ці іншыя часткі розных перакладаў, шукаць, так бы мовіць, удалыя знаходкі аднаго з перакладчыкаў ці, наадварот, не вельмі трапныя параўнанні, вобразныя супастаўленні — другога, вядома ж, няма аніякага сэнсу. Па-першае, хоць бы таму, што самі перакладчыкі зазвычай ставяць перад сабой далёка не адны і тыя ж задачы. Адны з іх на першы план вылучаюць лагічную дакладнасць зместу твора; другія імкнуцца больш надаць увагі яго стылістычным і моўным асаблівасцям, метафарычнасці.

Для пацвярджэння гэтых думак прывядзём усяго толькі два прыклады. Вось як выглядаюць першыя, добра вядомыя многім з нас, 12 радкоў "Слова аб палку Ігаравым", перакладзеныя са старажытнарускай мовы на беларускую Янкам Купалам:

Ці не добра было бы нам,
браці,
Старадаўнімі словы пачаці
Сказ аб Ігара трудным паходзе,
Святаславіча-князя прыгодзе?
А пачацца сягачасным ладам
Песні той, —
не Баянавым складам!
Бо Баян чарадзейны, як песняй
Захацеў каму пеці пачэсне,
Расцякаўся ён мысляй па дрэву,
Шэрым воўкам па полі-пасеву,
Сізакрылым арлом пад аблокі, —
Так захоплівaў свет ён далёкі!

А вось той жа ўрывак у перакладзе Яўгена Крупенькі, зроблены праз 50 гадоў пасля Купалы:

Ці не лепш, браты,
і нам пачаць
аб паходзе Ігаравым слова
і нашчадкам,
пакаленням новым,
да драбніцы праўду расказаць?
Як пачаць — ці на былінны лад
нагадаць на целе князя раны?
Ці задуме следаваць Баяна,
як спяваў ён многа год назад?
Калі спевам вешчым пачынаў
праслаўляць Баян
князёў паходы,
то па стэпе воўкам
бег заўсёды
ці арлом у неба узлятаў...

Відавочна і бясспрэчна: блізка да арыгінальнага тэксту, вобразна і дакладна перададзены думкі і намеры аўтара "Слова..." і першым, і другім перакладчыкамі!

...Зрабіўшы асобныя заўвагі невядомаму аўтару перакладу (памятаю, з якой ахвотай выпраўляў Яўген Міхайлавіч свае пралікі і прамашкі!), Юльян Пшыркоў напрыканцы сваёй закрытай рэцэнзіі адзначыў: "Паўтараю: новы пераклад "Слова аб палку Ігаравым" здзейснены з любоўю да слаўных спраў нашых продкаў. Досыць высокае яго паэтычнае майстэрства. Неабходна, — не сумняваўся прафесар, — як найхутчэй зрабіць гэты пераклад здабыткам шырокіх мас чытачоў"...

Незвычайнасць і "арыгінальнасць" лёсу самога Яўгена Крупенькі і ягонай творчасці пасля перакладу "Слова аб палку Ігаравым" дала аб сабе знаць найбольш выразна і характэрна. Колькі кпінаў, падвохаў і проста тупых падколак-жартаў сцярпеў Яўген Міхайлавіч ад злых людзей: зайздроснікаў-паэтаў, і перш за ўсё — з тагачасных выдавецтваў; ад нікчэмных і бяздарных плагіятараў... Аднак сціплы характар, памяркоўнасць і нават добразычлівасць да тых "калег" не дазвалялі яму затойваць злосць на кагонебудзь з іх, тым больш — зусім "не натхнялі" да помсты. Паэт-перакладчык Крупенька верыў: праца на працягу 13 гадоў над перакладам "Слова..." на беларускую мову рана ці позна спатрэбіцца беларусам!

Так яно і атрымалася...

...Паэт Мікола Федзюковіч быў не толькі найлепшым сябрам Яўгена Крупенькі, але і ягоным аднакурснікам па Літаратурным інстытуце імя М. Горкага ў Маскве. Спачатку, падчас нашых шматлікіх размоў-гутарак з паэтамі, а потым і ў прадмове да зборніка Яўгена Міхайлавіча "Жыццём прысягаю", Мікола Мікалаевіч прыгадваў, якое шчырае і непадробна добразычлівае стаўленне да сябе з боку калег па літаратурным цэху выклікаў Крупенька пры выступленні на адным з паэтычных вечароў у Інстытуце, калі прачытаў ім вось такія радкі:

На кляновым стале,
на бялюткім абрусе, пірог,
нібы сонца, ляжыць, —
ад яго на зямлі пасвятлела,
сонца ў лісцях бяроз,
на мурожнай у росах траве,
жаўруковаю песняй
злятае на колас жытнёвы.
А ў матуліным сэрцы
найвялікшае сонца жыве,
найвялікшае сонца —
мая беларуская мова!

Сапраўды: за такі паэтычны вобраз трэба не толькі паважаць, але і шанаваць Творцу, даражыць тым, што ён наш — беларус!

Яго творчасць высока цанілі многія сапраўдныя літаратары, і перш за ўсё — сябры: такія ж таленавітыя і неардынарныя творчыя асобы. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы Рыгор Барадулін у прадмове да зборніка вершаў, баек, мініяцюр Яўгена Крупенькі "Слон пад мікраскопам", выдадзеным у папулярнай у свой час "Бібліятэцы "Вожыка", з уласцівым яму тонкім гумарам напісаў: "Лірыка лірыкай, але адкуль узяўся гумар? А ён у Яўгена Крупенькі з калыскі. Вясёлыя аднак былі продкі ў паэта. Не заўсёды мелі крупы на куццю, а крупеньку варылі і трапнае слоўца ашчаджалі. Таму і Яўген Крупенька ўзяў ад сваіх родзічаў уменне глядзець далёка і трапна ўсё прыкмячаць, і пад мікраскопам слана бачыць..."

Забываць імя Яўгена Міхайлавіча Крупенькі і ягоныя справы, і перш за ўсё — выдатны пераклад на нашу родную мову бессмяротнага помніка старажытнай пісьменнасці "Слова аб палку Ігаравым", мы не маем аніякага маральнага права. Змешчаны пераклад гэтага твора ў зборніку "Адсюль выток, адсюль натхненне... Шклоўшчына літаратурная", які выйшаў у свет да мінулагодняга Дня беларускага пісьменства ў Шклове, — справа, несумненна, добрая, патрэбная і карысная. Аднак гэтага так мала! На маю думку, ёсць відавочная патрэба ў выданні "Слова аб палку Ігаравым" у перакладзе Яўгена Крупенькі не толькі большым тыражом, чым гэта кніга, але і ў прыгожым паліграфічным афармленні, а галоўнае — з падрабязным і грунтоўным навуковым каментарыем, які адпавядаў бы стану сучаснага беларускага літаратуразнаўства. Несумненным з'яўляецца і яшчэ адно: месца гэтаму паэтычнаму перакладу "Слова..." павінна быць адведзена і ў інстытуцкіх, універсітэцкіх і школьных праграмах па беларускай літаратуры.

Анатоль МЯСНІКОЎ

Чысціня пачуццяў

У выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшла ў свет кніга вядомага беларускага пісьменніка і журналіста Славаміра Антановіча "В августе девяносто первого...", якая з'яўляецца лагічным працягам рамана "Призраки Можейковской крепости", выдадзенага тры гады таму.

Пісьменнік, лаўрэат прэміі Беларускага саюза журналістаў, аўтар дакументальных кніг "Петр Машеров" (1993), "Петр Машеров. Жизнь. Судьба. Память" (1998),"Приговоренные к расстрелу" (2001), зборніка вершаў "Вяртанне ў юнацтва" (2006), дакументальнай кнігі "Жизнь вне закона" (2007), шматлікіх артыкулаў на гістарычныя тэмы ў рэспубліканскім друку, у новым рамане распавядае чытачу пра многія гістарычныя перыяды ў жыцці беларускага народа. Што асабліва прыцягвае ўвагу, дык гэта — грамадзянская адказнасць асноўных герояў кнігі за выкананне сваіх абавязкаў, за лёс Радзімы. Гэта адказнасць, вядома ж, нараджалася не адразу, а выпрацоўвалася з гадамі. Дарэчы, і сам пісьменнік, як сведчыць яго біяграфічная даведка, — асоба, пазначаная належнымі грамадзянскімі якасцямі: пасля заканчэння Мінскага радыётэхнічнага інстытута і юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта працаваў на пасадах памочніка першага сакратара ЦК КП Беларусі, саветніка старшыні Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь, галоўнага саветніка сакратарыята прэм'ер-міністра рэспублікі, начальніка прэс-цэнтра Генеральнай пракуратуры. Думаецца, што працоўны шлях аўтара, безумоўна, паўплываў як на яго светапогляд, так і на стыль рамана, які прасякнуты жыццёвай праўдай, святлом мужнасці і дабрыні, любоўю да людзей.

У рамане "В августе девяносто первого..." ярка адлюстроўваюцца падзеі, звязаныя з нацыянальна-вызваленчым рухам Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага супраць расійскай, шведскай, прускай інтэрвенцый у XVII стагоддзі, апавядаецца аб лёсах многіх гістарычных асоб, аб складаных сітуацыйна-палітычных момантах 1953, 1964 і 1991 гадоў, вядомай справе "ГКЧП" і "Белавежскай змове", у выніку якой з карты свету знікла вялікая дзяржава — Савецкі Саюз.

Праз увесь твор "В августе девяносто первого..." на фоне тых падзей, якія разгортваліся ў краіне, праходзяць драматычныя, яркія лёсы галоўных герояў кнігі Сцяпана Батурына і Ірыны Гужынскай, моцных асоб, якія пражылі цяжкае і складанае жыццё, але захавалі ў душы ўсё лепшае, што пакінулі ім продкі.

У новым рамане, як і ў папярэднім "Призраки Можейковской крепости", закранаюцца важныя гістарычныя этапы ў лёсе беларусаў, пры гэтым іх жыццё паказана так праўдзіва, што цікавасць да слова пісьменніка не зніжаецца на працягу ўсяго твора.

Валянцін БАРЫСЕВІЧ

У цеснай повязі эпох

Журналісты, як вядома, народ неспакойны. Не сядзіцца ў хаце нават у законныя выхадныя. Кліча ў дарогу прага пазнання, новых цікавых сустрэч, урэшце, прафесійны абавязак. У нашай рэдакцыі ўсталявалася добрая традыцыя: хоць раз на год наведваць усім калектывам славутыя мясціны Берасцейшчыны. Летась, да прыкладу, супрацоўнікі "Народнай трыбуны" пабывалі ў Белавежскай пушчы. Сёлета маршрутам сваёй экскурсіі абралі Пружанскі раён. Мэта акцыі — вывучэнне работы па развіцці турызму ў рэгіёнах вобласці.

...І вось наш пад завязку запоўнены заказны "бусік" пакідае межы абласнога цэнтра. Хутка мяняецца прыдарожны пейзаж. Замест патыхаючых жарам ужо з самай раніцы (а абяцаюць апоўдні 32 па Цэльсію з плюсам) шматпавярховых камяніц за вокнамі плаўна праплываюць абшары і лапікі каласавітых палёў, зубчастага хвойніку, мільгаюць указальнікі і мірна-некрыклівыя сельскія хаціны.

У расчыненыя форткі, ашаламляючы нашу кампанію, урываецца духмяны водар свежаскошанай травы. Нягледзячы на тое, што субота, да таго ж яшчэ хрысціянскае свята Пятра і Паўла, — сельскім працаўнікам няма адпачынку.

У Пружанах нашу экскурсійную групу сустракае прыемны малады чалавек, дырэктар музея-сядзібы "Пружанскі палацык" Юрый Зялевіч. Вітаецца:

— Буду на сёння вашым гідам, калі дазволіце.

Чысціня і парадак паўсюль. Акуратна "стрыжаныя" газоны, мноства кветак, ніводнага "фанціка" ад цукерак на плітачных тратуарах.

— Шмат дапамагла нашаму гораду колішняя падрыхтоўка да рэспубліканскага свята "Дажынкі", — расказвае экскурсавод. — Пабудавалі новы Палац культуры з асобнай, арыгінальнай канструкцыі танцпляцоўкай. Рэканструяваны старыя будынкі: маем цяпер, да прыкладу, свой трохзоркавы гатэль на 35 месцаў...

Пружаны з найвялікшай пашанай, рэўнасна ставяцца да захавання сваёй гістарычнай спадчыны. Тут багата помнікаў гістарычнай даўніны і культуры, якімі можна наталіць вока і душу.

Галоўная вуліца горада (у адрозненне ад блізнят-Савецкіх, якія запаланілі цэнтры многіх правінцыйных гарадкоў раённага і падпарадкаванага ім значэння) носіць імя славутага сына Пружаншчыны Рыгора Раманавіча Шырмы — дырыжора, кампазітара, фальклярыста. Яшчэ пры жыцці ён выдаў больш 16-і тамоў зборнікаў беларускіх народных песень.

Цэнтральная плошча Пружан — "Гандлёвая". Так яе мясцовыя жыхары называюць спрадвеку, і ніякія іншыя "ідэалагічна вытрыманыя" назвы савецкіх часоў, не прыжыліся. Да плошчы прымыкаюць гандлёвыя рады, пабудаваныя яшчэ ў 1887 годзе. 25 арачак, у кожнай з якіх калісьці знаходзіўся асобны магазін яўрэйскіх "прадпрымальнікаў", і ў цэнтры — "метро", паўпадвальнае памяшканне, дзе гандляры збіраліся, абмяркоўвалі свае праблемы. Цяпер будынак выкарыстоўваецца па іншым прызначэнні. Але даўняя назва яго — "Белыя лаўкі" — захоўваецца.

Насупраць радоў скіраваў у неба свае купалы сабор Аляксандра Неўскага. Гэтая святыня ніколі, нават у самыя ліхія для яе часіны, не зачынялася. А ў 1934 годзе ў храме "заплакаў" абраз Божай маці. З тае пары рэдкую для хрысціянскага света падзею адзначаюць кожную першую пятніцу пасля Вялікадня.

Што да імёнаў іншых вядомых усяму свету людзей, якія сваім талентам праславілі пружанскую зямлю, то з гэтай нагоды ўражвае велічнае пано, устаноўленае ў цэнтры горада на сцяне будынка ЗАГСа. На ім адлюстраваны партрэты спевака, саліста Пражскага опернага тэатра, які выступаў на сцэнах Ла-Скала (Мілан) М. Забэйды-Суміцкага, мастака-перасоўніка, інтэр'ерыста Станіслава Жукоўскага, польскага раманіста Юзэфа Ігнація Крашэўскага, які гусіным пяром напісаў больш 600 твораў і занесены ў Кнігу Рэкордаў Гінеса як самы пладавіты аўтар.

Рухаемся далей гарадскімі вуліцамі і любуемся шэдэўрамі майстроў-архітэктараў пазамінулага стагоддзя. Адмысловы чырвонацагляны будынак былой паштовай станцыі (цераз Пружаны праходзіў паштовы тракт). Непадалёк — найстарэйшы ў райцэнтры драўляны дом колішняй аптэкі, узведзены ажно ў 1811 годзе. Касцёл прасвятой Дзевы Марыі, у якім свой шлях каталіцкага святара пачынаў Казімір Свёнтак.

Усё дыхае гісторыяй. І ўжо на сучаснай арачнай стэле — у метале адчаканены герб горада Пружаны: з пашчы карнаванай змяі выходзіць у свет дзіця. Змяя ў нашых продкаў лічылася сімвалам мудрасці. А калі выходзіць з яе дзіця — значыць, нараджаецца нешта новае, светлае...

Гэты герб падаравала гораду 420 гадоў таму каралева Ганна Іглонка — у гонар сваёй маці. У пэўныя перыяды гісторыі яго выява крыху мянялася. А ў наш час нават аб'яўлялі конкурс на новы сімвал Пружанаў. І чаго толькі не прапаноўвалі прафесійныя мастакі і аматары! Аднак спыніліся на першасным гістарычным варыянце, і цяпер ён — візітная картка горада.

Пры пераходзе праз масток увагу маіх калег прыцягнула арыгінальная гідралагічная кампазіцыя "Муха і Вец". Найперш — узорыстымі металічнымі парэнчамі. Менавіта тут бярэ свой выток вядомая на Брэстчыне рака Мухавец, якая працякае пасля па тэрыторыі пяці раёнаў.

Увогуле, у Пружанах шмат помнікаў, розных памятных знакаў. Усе яны беражліва даглядаюцца і шануюцца. Такую выснову можна зрабіць нават з таго мізэру, што мы змаглі пабачыць падчас кароткага падарожжа па гарадскіх вуліцах. Уразіў мемарыял спаленым вёскам: у перыяд Вялікай Айчыннай вайны на Пружаншчыне фашысты дашчэнту знішчылі 58 сельскіх населеных пунктаў. Шэсць з іх так і не паўсталі з крывавага прысаку.

Асобная гаворка — пра помнік У. Леніну. У многіх мястэчках аднатыпныя фігуры з працягнутай рукою... Тут жа мы ўбачылі сапраўдны мастацкі твор — выкананая вядомым у рэспубліцы скульптарам Гумілеўскім чатырохметровая бронзавая статуя.

І, нарэшце, наша турыстычная сцяжына ўпіраецца ў сапраўдную жамчужыну Пружанаў — "Палацык". Сядзібу на пачатку XIX стагоддзя пабудаваў неардынарны чалавек, наватар, актыўны грамадскі дзеяч, які працяглы час з'яўляўся маршалкам Пружанскага павета шляхціц Валенці Швыкоўскі. Гасцей, якія наведвалі дом Швыкоўскіх, уражвала безліч навейшых дасягненняў тагачаснага прагрэсу. Падлога ў кветкавай зале, напрыклад, падагравалася знізу. Надзейна служылі гаспадарам электрамашына, літаграфічны станок, нават "машынка для прыгатавання шакаладу". А якое здзіўленне выклікалі аранжарэя з вялікай колькасцю экзатычных раслін, навакольны англійскі парк і сад, дзе многія дрэвы вялі сябе не па правілах, маглі, скажам, запаволь-ваць, адкладваць на пазней перыяды свайго квітнення...

Аднак лёс не заўсёды прыязна ставіўся да Валенція Пятровіча. Магчыма, злую ролю тут сыграла яго сувязь з паўстанцамі Кастуся Каліноўскага. І ў 1895 годзе, аўдавеўшы, ён змушаны быў прадаць сядзібу. Набыў яе міністр шляхоў зносін П. А. Кляйнміхель для сваёй унучкі Веры. Па маці Вера была сваячкай Наталлі Ганчаровай — жонкі рускага паэта А. С. Пушкіна.

У 1998 годзе Пружанскі райвыканкам перадаў рэстаўраваны будынак і парк мясцоваму краязнаўчаму музею, які стаў называцца музей-сядзіба "Пружанскі палацык". З тае пары пачалося новае жыццё гэтага унікальнага архітэктурнага помніка.

Музей паступова аднаўляе інтэр'еры сядзібнага дома XIX стагоддзя. У салоне, аздобленым копіямі малюнкаў Напалеона Орды і карцінамі-арыгіналамі італьянскіх мастакоў XVIII стагоддзя, ладзяцца літаратурныя вечарыны, канцэрты, канферэнцыі па захаванні і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны. Шмат цікаўных наведвальнікаў збірае "паляўнічы" кабінет. Не пустуе выставачная зала, дзе рэгулярна праходзяць самыя разнастайныя мастацкія і краязнаўчыя выставы. Асобны пакой запоўнены экспазіцыяй канфіскаваных на мытні старажытных праваслаўных абразоў, а ў этнаграфічным кутку, у раздзеле "Рамёствы Пружаншчыны" найбольш каштоўнымі экспанатамі з'яўляюцца вырабы чорна-задымленай керамікі, сапраўдны "пружанскі" сакрэт вытворчасці якіх, магчыма, страчаны назаўсёды.

Ветла сустрэла нас і не бяднейшая на гістарычныя мясціны зямля другога па велічыні ў раёне населенага пункта — гарадскога пасёлка Ружаны. Тут галоўная славутасць — замак Сапегаў.

Пабудаваны ў XVII стагоддзі па праекце прыдворнага архітэктара Яна Самуіла Бекеля, ён і цяпер, у разбураным стане, выглядае велічна і непрыступна.

Ужо ля ўваходнай брамы наш гід Юрый Зялевіч расказвае займальную гісторыю. Як сведчаць мясцовыя жыхары, у адну з начэй 1972 года тут доўга стаяла чорная "Волга". А раніцай жыхары заўважылі ў таўшчэзнай сцяне замка аб'ёмны скол. Ружанцы зрабілі выснову, што гэта сучасны нашчадак Льва Сапегі забраў старажытны скарб, легенда пра існаванне якога перадавалася з пакалення ў пакаленне.

Замак пацярпеў моцныя разбурэнні ў васемнаццатым стагоддзі, падчас вайны са шведамі. Ад гэтай навалы ён так і не аправіўся, астатняе даверш ылі людзі і прырода. З горкай іроніяй наш экскурсавод дапусціў: напэўна, усе гаражы ў Ружанах пабудаваны з замкавай цэглы.

Праўда, апошнім часам прымаюцца захады па рэстаўрацыі асобных фрагментаў Ружанскага палацавага комплексу: усходняга флігеля, каланады, уваходнай брамы. Ёсць намер размясціць там нейкія сацкультустановы. Але ці варта гэтым займацца? Ці не лепей накіраваць сродкі на кансервацыю аб'екта, каб захаваць помнік хоць бы ў цяперашнім стане?

У Ружанах мы яшчэ пабывалі ў Троіцкім касцёле пабудовы 1615 года, у Петрапаўлаўскай царкве, якая ўзведзена ў 1675 годзе, у дзіцячым санаторна-аздараўленчым комплексе "Ружанскі" Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, размешчаным на беразе маляўнічага возера Паперня.

Мінула ўсяго некалькі дзён пасля экскурсійнай паездкі, а багатая гісторыяй, шчодрая на даўніну і сучасныя здабыткі пружанская зямля зноў кліча да сябе. З жніўня райцэнтр святкаваў сваё 575-годдзе.

Валерый КУХАРЧУК,
карэспандэнт Брэсцкай абласной газеты "Народная трыбуна", член Саюза пісьменнікаў Беларусі
Брэст—Пружаны—Ружаны—Брэст

«Эстрада... Гэта так, між іншым...»

З мэтрам расійскай эстрады, падчас яго чарговага прыезду ў нашу сталіцу, Львом Лешчанкам, гутарыць спецыяльны карэспандэнт беларускага радыё Яна Хадоска.

— Леў Валяр'янавіч, вас называюць добрым чалавекам, які заўжды дапамагае сябрам. Вы бліскучы спявак, голас якога гучыць гэтак жа хораша, пранікліва, як і шмат гадоў таму. Вы выхавалі цэлую плеяду таленавітых выканаўцаў, якая на сённяшні дзень з'яўляецца гонарам расійскай эстрады.

— Тая плеяда, якую я выхаваў, гэта ўсё ж такі ў асноўным нашы чароўныя эстрадныя спявачкі: Марына Хлебнікава, Каця Лель, Варвара, Вольга Арэф'ева. І ва Украіне ў мяне ёсць вучні. Мне цікавей працаваць з вакалісткамі, артыстамі жаночага полу. Гэта натуральна, нехта павінен запальваць уяўленне мастака, творцы. Гэта не значыць, што я думаю пра іх як пра жанчын. Проста гэта такі вобраз, які сфарміраваны ў маёй душы, ён імкнецца да нейкай дасканаласці, да ідэалу. Мне б хацелася, каб гэтыя людзі пры маёй падтрымцы, нават чыста чалавечай дапамозе, атрымалі магчымасць развівацца, працаваць на сцэне. Цяпер у мяне новыя праекты і я вельмі рады, што з'яўляецца таленавітая моладзь. Хоць я ўжо не выкладаю ў студыі, а проста займаюся прамоўшэнам. У агенцтве ёсць маладыя выканаўцы, з якімі працую, і спадзяюся, што яны таксама знойдуць сваё месца на эстрадным небасхіле.

— Сваёй творчасцю як майстар вы спрабуеце паставіць заслон праектам-аднадзёнкам і песням, якія, напэўна, заўтра ўжо будуць нецікавыя слухачам.

— Я проста займаюся сваёй справай і даю людзям магчымасць параўноўваць. Сапраўдную акадэмічную адукацыю не параўнаць з альтэрнатыўнай школай сённяшніх артыстаў, якія спрабуюць за месяц-два атрымаць веды — гэта нерэальна. Я думаю, што навучыць людзей спяваць значна складаней, чым навучыць чалавека воінскім дысцыплінам, якія заснаваны на пэўных алгарытмах. Мастацтва не можа будавацца на алгарытмах. Мастацтва — гэта ўяўленне, біццё

сэрца, палаючы мозг. Нельга навучыцца гэтаму за тры месяцы — трэба працаваць, працаваць і працаваць. Ніякая "Фабрыка зорак" ніколі не навучыць чалавека па-сапраўднаму спяваць, быць сапраўдным артыстам. Рухацца, можа, яшчэ і навучаць — гэта проста механіка, а голас — зусім іншая сфера.

Парадокс заключаецца ў тым, што на які-небудзь сучасны фэст я прапаноўваю сваіх выканаўцаў, а іх не запрашаюць, просяць што-небудзь прасцей. Як быццам бы сапраўды вакал, сапраўднае акцёрскае майстэрства ўжо стала анамаліяй! На жаль, наш свет мастацтва сёння не заснаваны на традыцыях, на глыбінных рэчах. Вось у чым праблема. І людзі лічаць, што сучаснае мастацтва — гэта фантан. На самай справе — гэта губка, як гаварыў Пастэрнак. Спачатку трэба назапасіць, а потым ужо фантаніраваць, самавыяўляцца, тварыць. Шкада, але цяпер форма пераважае над зместам. Але, як сказаў адзін вялікі чалавек: "Што форма без зместу? Гэта званок, які не звініць". Ну хто ў нас звініць? Ну хто зазвіneў у нас, як Пугачова, Ратару, Кабзон, Магамаеў, П'еха? Хто зазвінеў так!? Хто застаўся ў памяці народнай? Бачыце, час ізноў паставіў усё на свае месцы. І зноў з пустэчы паўстала нешта, што і ўяўляе сабой мастацтва са сваім пэўным асяродкам, стрыжнем, дамінантай.

— Кожны ваш прыезд — гэта вялікая падзея ў культурным жыцці нашай краіны. І мы заўсёды чакаем вас з канцэртамі.Тут вашыя шматлікія прыхільнікі і сябры: Уладзімір Правалінскі, Ігар Лучанок, з якім вы даўно ўжо сябруеце, і многія-многія іншыя.

— Ну вы ведаеце, пэўна, ізноў варта прыехаць. Можа быць, калі я набліжуся да нейкага юбілею. Вось хацеў юбілейны канцэрт сюды прывезці, але ён быў пабудаваны такім чынам, што побач са мной спявалі мае сябры і гэта паказвалі па тэлебачанні. Я падумаў: ну прыеду без Тухманава, без Антонава, Дабрыніна. І што скажуць тады?

Людзі бачаць па тэлебачанні прадукт, цалкам дасканалы... Вось, як пройдзе мой сольны канцэрт па тэлебачанні, супакоіцца народ, тады я і прыеду сам паспяваць.

— Пажадана, як мага раней, не чакаючы чарговага юбілею!

— Добра, я абяцаю, што ў наступным годзе прыеду...

— Леў Валяр'янавіч, ці быў гэты год удалым для вас?

— Вельмі ўдалы! Мая каманда, баскетбольны клуб "Трыумф", цяпер гуляе з бляскам на Еўракубках. Я ганаровы прэзідэнт і віцэ-прэзідэнт клуба. І спадзяюся, што сёлета мы выйграем Еўрапейскі кубак. Гэта цяпер мая самая вялікая любоў і маё самае "жарснае" жаданне, таму што спорт у маім жыцці займае самае вялікае месца. А эстрада... Гэта так, між іншым...

— Што б вы хацелі пажадаць сваім прыхільнікам і ўсім беларусам?

— Я хацеў бы пажадаць беларусам заставацца ў такіх жа жыццёвых кандыцыях, каб у іх душах ніколі не згасаў агонь дабрыні, міласэрнасці, кахання, таму што беларусы — гэта самая шчырая нацыя! Гэта самыя сумленныя, самыя працавітыя і самыя прыстойныя людзі на свеце.

З пошты «ЛіМа»

У гасцях — пісьменнікі

У Бярэзінскай раённай бібліятэцы адбылася творчая сустрэча з цыкла "У нас у гасцях — пісьменнік" з сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя П. Броўкі, галоўным рэдактарам часопіса "Нёман" Міхасём Пазняковым і празаікам, рэдактарам аддзела прозы часопіса "Нёман" Наталляй Касцючэнкай. У сваім выступленні перад настаўнікамі і бібліятэкарамі, мясцовай інтэлігенцыяй і аматарамі прыгожага пісьменства госці чыталі свае творы і распавялі не толькі пра свой жыццёвы і творчы шлях, але і пра набыткі "Нёмана", які заўсёды адкрыты для сапраўдных творцаў і пачынаючых літаратараў.

Міхаіл Паўлавіч Пазнякоў родам з Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. За яго плячыма вучоба на філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта, праца рабочым на заводзе, настаўнікам у школе, навуковым супрацоўнікам Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі, дырэктарам Літаратурнага музея М. Багдановіча, галоўным рэдактарам часопіса "Вожык". Ён аўтар шматлікіх кніг для дарослых і дзяцей. Пераклаў на рускую мову шэраг беларускіх аповесцей і раманаў, а таксама некалькі твораў замежных пісьменнікаў — на беларускую мову. У тым ліку і "Дон Кіхот" М. Сервантэса. Многія яго вершы пакладзены на музыку.

Наталля Мікалаеўна Касцючэнка нарадзілася ў Брагінскім раёне, скончыла лесагаспадарчы факультэт Беларускага тэхналагічнага інстытута імя С. М. Кірава. Друкавалася ў часопісах "Маладосць", "Родная прырода", газетах, у калектыўным зборніку "Карані". Цяпер выйшлі новыя творы — "Таямніцы пачуццяў", "Сугучнасць", у якіх з болем у сэрцы аўтар піша пра жудасную аварыю на Чарнобыльскай АЭС. Цяпер працуе над раманам "Я на Зямлі", частка якога выйшла асобнай кніжкай "Добро и зло — две половинки любви".

Некалькі гадзін размовы з літаратарамі праляцелі непрыкметна. На памяць госці падарылі бібліятэцы свае кнігі з аўтографамі і пакінулі пажаданні ў ганаровай кнізе.

Затым госці сустрэліся з вучнямі гарадскіх школ.

Наталля МАЕЎСКАЯ

«Ад пошукаў расце душа...»

Гэтыя словы з верша супрацоўніцы нашай бібліятэкі, маладой паэткі, студэнткі факультэта беларускай філалогіі і культуры БДПУ імя М. Танка Ірыны Бельскай можна ўзяць эпіграфам да ўсёй яе творчасці. Прыемна, што Ірына размаўляе на чысцюткай матчынай мове. Гэта тым больш дарэчы, што наша бібліятэка носіць імя Якуба Коласа. Нягледзячы на малады ўзрост, І. Бельская шмат дзе друкавалася, прычым у розных аўтарытэтных выданнях, у тым ліку у часопісе "Маладосць".

Вершы Ірыны — паэзія чалавека з устойлівай жыццёвай пазіцыяй, мудрай маладой жанчыны. Вершы філасофскага кірунку, а таксама пра каханне. Сусвет кахання, апаэтызаваны мастацкім словам — з'ява незвычайная, тонкая, таямнічая. Ірыне ўдаецца перадаць гэты сусвет без фальшу, шчыра. Мяркуйце самі:

Я стамілася. —
Ледзьве жывая
Уваходжу ў сцюдзёны пакой
І сасмяглыя вусны хаваю,
Прыкрываючы злёгку рукой.
І паскардзіцца моцы не маю,
Ды бягу
ад размовы такой.
"Да сустрэчы.
Усё. Абдымаю".
І хаваюся ў свой неспакой.

Адрозніваецца паэзія Ірыны Бельскай свежымі метафарамі, нечаканымі параўнаннямі:

...Ці ведаў ты, што бліскавіца
Мая стрыечная сястрыца?..

А таксама сучаснай манерай увасаблення самых розных пачуццяў чалавека, духоўнай заглыбленасцю. І размаітай рытмікай.

Калі гаварыць карацей: таленавітая дзяўчына не толькі ў паэзіі. Яна добра спявае, чытае вершы, з'яўляецца актыўнай удзельніцай рыцарскага клуба "Полацкі звяз".

Валянціна СОПІКАВА, бібліёграф Наваполацкай бібліятэкі імя Якуба Коласа

Лепшы клуб

Лепшым клубным аб'яднаннем у Маладзечанскім рэгіёне па выніках 2007 года прызнаны клуб ветэранаў вайны і працы "Адпачынак". На працягу амаль дваццаці гадоў ім кіруе Марыя Баландзіна, якая неаднаразова ўзнагароджвалася спецыяльнай прэміяй райвыканкама "Талент".

Да слова, "Адпачынак" — адзіны падобны клуб у Мінскай вобласці. Ён адзначаны спецыяльнай прэміяй аблвыканкама за высокія дасягненні ў намінацыі "Лепшае аматарскае аб'яднанне або клуб па інтарэсах".

Нягледзячы на сталы ўзрост удзельнікаў, калектыў шмат гастралюе па ўсёй рэспубліцы. А цяпер "Адпачынак" рыхтуе новую праграму пад назвай "Была б душа маладая" ў гонар свайго дваццацігадовага юбілею.

Таццяна БЯГУН

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Дзмітрый Лыбін
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар, намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3359
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 20.08.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 4478

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686